№ 34 (488) 15 верасьня 2006 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

### Джынсавы фэст

16 верасьня ў сталіцу прыедзе Брус Уіліс?
**Старонка 24.**

### Дзень гораду скончыўся п’яным пагромам

Хуліганы ўзялі пад свой кантроль электрычку Менск—Пухавічы.
**Старонка 4.**

### Ірына Лазоўская год чакае суду ў СІЗА

Сьведкам выступае яе былы муж Алесь Суша.
**Старонка 14.**

### Балван вярнуўся

напярэдадні 100-гадовага юбілею «Нашай Нівы».
**Старонка 5.**

### Скандал у Літве: Пацюнас забіты сваімі? Сакратар МЗС – расейскі шпіён?

Ці наадварот, гэта правакацыя ФСБ.
**Старонка 13.**

### Воля ў няволі

Незалежнае грамадзтва будзе сапраўды незалежным, толькі калі навучыцца ствараць уласны бізнэс. Піша Бірута Янкевіч.
**Старонка 8.**

### Таксоўкі пад нацыянальным сьцягам

Былы баскетбаліст Пятро Крышчык маніцца згуртаваць вакол сябе беларускамоўных таксоўшчыкаў Менску.
**Старонка 9.**




У Гаване адкрыўся саміт краінаў Руху недалучэньня. Удзел у Дамове аб калектыўнай бясьпецы і наяўнасьць замежных вайсковых базаў не перашкаджаюць удзелу Беларусі ў гэтай міжнароднай арганізацыі. Усё большая колькасьць дыктатараў выкарыстоўваюць ноў-хаў Кастра: дыктатура пад прыкрыцьцём барацьбы з імпэрыялізмам ЗША.



# Нашаніўцы атрымалі прэміі

У панядзелак 11 верасьня ў кавярні «Latte» адбылося ўрачыстае ўзнагароджаньне прэміяй імя Зьмітра Завадзкага беларускіх журналістаў. Кіраўнік аддзелу спэцыяльных праектаў Першага каналу расейскага тэлебачаньня Павал Шарамет адзначыў, што гэтая прэмія ўручаецца самым вартым кандыдатам, праца якіх мусіць служыць эталёнам для іншых журналістаў.

Былая жонка зьніклага шэсьць гадоў таму тэлеапэратара ОРТ Зьмітра Завадзкага Сьвятлана адзначыла: ёй асабліва прыемна, што на стагодзьдзе газэты прэмію атрымліваюць два журналісты «НН» Юлія Дарашкевіч і Андрэй Дынько (**на фота**).

**Зьміцер Панкавец**

## У нумары


### люстра дзён

Чаргінец пра школьніка, што патрабаваў выкладаць гісторыю па-беларуску: «Ублюдак».. 4

Дзень гораду скончыўся п’яным пагромам ........... 4

Балван вярнуўся ........... 5

Замкнула ........................ 5

Прэмія Раманюку ......... 5

Праваслаўная царква не дарue каліноўцам ......... 6

Чытачы nn.by: хочам праваслаўных у беларускіх выданьнях 7

Праваслаўныя ладзяць першы фэстываль ........ 7

Таксоўкі пад нацыянальным сьцягам 9

Могільнік будзе за 5 км ад беларускай мяжы. 10

Ісьціна ў «Белтрансгазе», а не ў віне .................... 11

Улады трасуць аўтабізнэс .................... 11

Аляксандар Фядута: Быў такі Булахаў... ............. 12

Ірына Лазоўская год чакае суду ў СІЗА ..... 14

### з усіх старон

Януковіч і Качыньскі злучаць Польшчу і Украіну трубой ........... 12

Папулярны расейскі рок-гурт пяе па-беларуску 12

Скандал у Літве: Пацюнаса забілі сваe? Сакратар МЗС — расейскі шпіён? ........... 13

Як, дзе і калі атруцілі Юшчанку? .................... 13

Украіна працягвае ўкраінізацыю .............. 16

Мэксыка раскалолася на дзьве ............................ 16

Папа ў Баварыі: сьвету патрэбны Бог ............. 41

### камэнтары

Бірута Янкевіч. Воля ў няволі ............................ 8

Гары Куманецкі. Гары яно гарам ..................... 17

Віталь Тарас. Сьвядомасьць і біцьцё .......................... 18

Павал Севярынец. Беларускі народ і цар гары ............................... 22

Андрэй Павач. Ідэалягічная база русіфікацыі ................ 27

### гумар

Моўная рэформа ........ 15

### культура

Хто народны? ............. 20

Беларускі Калегіюм .. 21

Настасься барадатая 43

### гісторыя

Анатоль Вялікі. Юбілеялёгія ................. 28

Генадзь Сагановіч. Што вырашыла лёс Клецкай бітвы? ............................. 32

Сяржук Горбік, Сяргей Ёрш. Львоўская місія «Язафата» .................... 35

Палалі пажары ........... 36

### гульні словаў

Сяргей Вітушка. ЯR ... 42

### мы самі

Дзякуй .......................... 46


# Просім чытачоў

на наступным тыдні масава зьвярнуцца ў «Белпошту» зь лістамі з просьбай вярнуць незалежныя газэты ў падпісны каталёг. Альгарытм звароту такі: дашліце ліст у «Белпошту» (узор гл. ніжэй) і адпраўце яго копію нам у Рэдакцыю, разам з квітком, які пацьвярджае факт адпраўкі заказнога ліста.

Прыкладны ўзор

Генэральнаму дырэктару РУП «Белпошта»

Чарняк А.І.

Копія: ВПУП «_______________»

Прозьвішча, імя, імя па бацьку

які\якая жыве па адрасе:

Прашу ўключыць у падпісны каталёг на 2007 г. газэту «Наша Ніва».

Я зьяўляюся чытачом і падпісчыкам гэтага выданьня з ____ году. На жаль, у 2006 г. я ня змог / не змагла падпісацца на газэту, бо яе не ўключылі ў падпісны каталёг. У такім самым становішчы апынуліся і многія іншыя чытачы газэты, якая зарэгістраваная ў належным парадку. (*Калі хто жыве ў вёсцы, ці інвалід, ці стары чалавек, якому цяжка рухацца і ня можа атрымліваць газэты ў іншы спосаб, акрамя як праз падпіску, дык пра гэта таксама варта пісаць.*)

У рэдакцыі газэты мяне запэўнілі, што яны зацікаўленыя ў распаўсюдзе праз падпіску і робяць дзеля гэтага ўсё неабходнае.

Выдаленьне «Нашай Нівы» з падпіснога каталёгу парушае мае правы як спажыўца паслуг сувязі, якія МУСЯЦЬ АКАЗВАЦЦА КОЖНАМУ ГРАМАДЗЯНІНУ, які па іх зьвяртаецца.

Прашу пры фармiраваньні падпіснога каталёгу ўлічыць мае законныя інтарэсы, як і правы іншых чытачоў газэты.

Пра прынятае на мой зварот рашэньне прашу паведаміць у пазначаны ў законе тэрмін.

З павагай,

Дата,

подпіс







У свой час

Эдвард
Вайніловіч

Магдалена
Радзівіл

Васіль Быкаў

# ахвяравалі на «Нашу Ніву»



з пачатку 2006 году
газэта атрымала
6300 ахвяраваньняў
з усіх куткоў Беларусі.
Дзякуй!



# Чаргінец пра школьніка, што патрабаваў выкладаць гісторыю па-беларуску: «Ублюдак»



Першаверасьнёўскі пэрформанс на плошчы Якуба Коласа выклікаў нэрвовую рэакцыю ўладаў. Школьнікі пратэставалі супраць пераводу выкладаньня гісторыі Беларусі на расейскую мову. Падчас акцыі сымбалічны кат у чырвоным балахоне і зялёным каўпаку павесіў падручнік «Гісторыя Беларусі» — алюзія на павальную русіфікацыю і перапісваньне падручнікаў гісторыі.

Сюжэт з камэнтарамі сэнатара М.Чаргінца БТ паказала некалькі разоў. М.Чаргінец, стоячы на плошчы Якуба Коласа, успамінаў, як тут у вайну немцы каталі партызанаў: «Тут стаялі немцы ў наваксаваных, памятаю, ботах» (М.Чаргінец нарадзіўся 17 кастрычніка 1937 г.). І тут жа праводзіць паралель з акцыяй 1 верасьня. «Гэта выпадак звышжорсткі, звышсвалачны, звышздрадніцкі. На гэтым сьвятым месцы, дзе пралівалі кроў нашы грамадзяне, адчуваючы несправядлівасьць, ізноў была ўсталяваная шыбеніца». Далей старшыня правільнага пісьменьніцкага саюзу, не шкадуючы выразаў кшталту «сукін сын», прадэманстраваў не абы-якое веданьне сусьветнай гісторыі: «Малойчык, на ім, канечне, была павязка бел-чырвона-белая, ён прыкрыў свой твар, маючы вялікі вопыт, балахонам ку-клукс-кланаўца. І што ж ён зрабіў? Усталяваў тут шыбеніцу і павесіў на ёй падручнік з гісторыі Беларусі. Навошта? Нездарма на ім гэты балахон. У гісторыі кнігі ўжо палілі ў фашысцкай Германіі. А гэты прыйшоў, ублюдак, усталяваў шыбеніцу».

**Сямён Печанко**

# Дзень гораду скончыўся п’яным пагромам

Хуліганы ўзялі пад свой кантроль электрычку Менск—Пухавічы.



Сёлета Дзень гораду мала розьніўся ад іншых сьвятаў, што ладзяць у беларускай сталіцы ўлады. Менгарвыканкам нават не пайшоў на такую меру, як забарона продажу алькагольных напояў. Горы выпітых пляшак ад піва і больш моцных трункаў на раніцу пасьля сьвяткаваньня даводзілася выграбаць са сталічных вуліцаў падмятайлам і камунальным службам. Усё б было як звычайна, каб не адзін інцыдэнт, што здарыўся ў электрычцы Менск—Пухавічы.

На электрычцы Менск—Пухавічы ў 0:20 зьязджалі дадому тыя, хто найболей забавіўся ў сьвяточнай сталіцы. Сярод іх значную частку складала моладзь, што добра наступіла на корак. Паміж імі акурат і пачаліся разборкі: рудзенскія на пухавіцкіх, Мачулішчы на Міханавічы, і не разьбярэсься, хто на каго. У найлепшых традыцыях вясковых дыскатэк, калі «мясцовыя» пачынаюць высьвятляць адносіны з «чужынцамі». Усё сканчаецца крывёй, разьбітымі тварамі і задавальненьнем ад уласнай крутасьці.

Паводле словаў відавочцаў, п’яныя бэйбусы заступілі ўваход і выхад з трэцяга вагону электрычкі, а людзей, што спрабавалі выйсьці, зьбівалі, незалежна ад полу. Нарад міліцыі з двух чалавек, што дзяжурыў на маршруце, не дапамог пасажырам — моладзь значна перасягала іх у сіле.

Па нейкім часе бойка між групоўкамі перайшла на вуліцу, але некаторыя хлопцы працягвалі трымаць дзьверы. З вуліцы ў вагон ляцелі буйныя камяні. Са словаў старшага інспэктара аддзяленьня аховы правапарадку УУС на транспарце Аляксандра Жылінскага, было пабіта камянямі трынаццаць шыбаў вагонаў, «але траўму, на шчасьце, атрымала толькі адна дзяўчына, якой разьбілі губу».

Электрычка доўга не магла пакінуць станцыі Мачулішчы, бо нехта ўвесь час зрываў стоп-кран. Пасажыры міжволі апынуліся ў самым пекле п’яных разборак, нібыта тыя закладнікі ў тэрарыстаў.

Відавочцы запэўніваюць, што бойкі не перапыняліся аж да Рудзенску, дзе мясцовыя боўдзілы нарэшце выйшлі, напасьледак абстраляўшы электрычку камянямі.

Характэрна, што ў панядзелак у абед у Пухавіцкім РУУС «нічога ня ведалі» пра здарэньне на чыгунцы. У апэратыўную хроніку гэты інцыдэнт не трапляў.

Аляксандар Жылінскі гаворыць, што ўжо заведзеная крымінальная справа па факце хуліганства, але цяжка меркаваць, ці будуць пакараныя вінаватыя. І хто ўвогуле вінаваты? П’яны шал на дзяржаўныя сьвяты становіцца звычайнай справай. Галоўнае, каб і здарэньні кшталту рудзенскага ня сталі нормай.

**Зьміцер Панкавец**

# Балван вярнуўся

У Вільні, на рагу Завальнай і Троцкай, адноўлены гістарычны для беларусаў будынак.

У старажытнай Вільні — не абыякая падзея. Балькон палацу Тышкевічаў зноў трымаюць два атлянты, якіх віленчукі здаўна называюць «балванамі», а сам палац — «домам пад балванамі».

У беларускую гісторыю гэты будынак увайшоў самымі слыннымі імёнамі. Тут напрыканцы XIX ст. часта бываў віленскі адвакат Францішак Багушэвіч, які сябраваў з Зыгмундам Нагродзкім. Нагродзкі, у сваю чаргу, гандляваў сельскагаспадарчымі машынамі і меў у палацы Тышкевічаў склады. На пачатку XX ст. ён даваў грошы на выданьне першай беларускай газэты «Наша Ніва», а пазьней і сама рэдакцыя «НН» разьмясьцілася ў «доме пад балванамі».

Сёньня ў гэтым будынку на скрыжаваньні Завальнай і Троцкай месьціцца архітэктурны факультэт Віленскага тэхнічнага ўнівэрсытэту. Год таму ў аднаго з атлянтаў урэзаўся на машыне нецьвярозы Маркас З. Пасьля гэтага замест скульптуры доўгі час стаяў драўляны слуп. Вінаваты сплаціў за аварыю каля тысячы даляраў і яшчэ больш за 10 тысяч — за новую скульптуру.



**Новы атлянт каштаваў 10 тысяч даляраў.**

Сымбалічна, што «балван» вярнуўся на сваё месца акурат напярэдадні 100-гадовага юбілею «Нашай Нівы».

**Паводле «Свабоды»**

# Замкнула

Музычныя імпрэзы на знакавыя даты — 8 і 17 верасьня — адмененыя. Вінаватая праводка.

Анансаваныя «НН» канцэрты «N.R.M.» у Маладэчне і праекту «Старажытная зямля» ў КЗ «Менск»не адбыліся. Супала так, што ў абодвух выпадках падвяла тэхніка. «Гэта было тэхнічнае пытаньне, якое, на жаль, ня здолелі вырашыць», — камэнтуе адзін з арганізатараў канцэрту «N.R.M.» у маладачанскім «Майстар-клюбе». Аднак гурт усё адно выступіць. Дзе? «У Менску». Калі? «У бліжэйшым часе...»

Арына Вячорка, прадусэр праекту «Старажытная зямля», патлумачыла перанос канцэрту «Гістарычная песьня» з КЗ на сядзібу Партыі БНФ тымі самымі тэхнічнымі прычынамі. «Заліло электраправодку, таму сьвятла ў залі не было. Скасавалі ня толькі наш канцэрт. Мяне завялі ў тое памяшканьне, і я пабачыла ўсё на свае вочы».

Адміністрацыя КЗ «Менск» адмовілася і ад далейшага супрацоўніцтва з праектам «Старажытная зямля». Праводка не пры чым: некаторыя крыніцы называлі канцэрт у анонсах не «Гістарычная песьня», а «Аршанская бітва». Адміністрацыя зьвінаваціла арганізатараў у «палітызацыі».

А.Вячорка ня бачыць у гэтым вялікай трагедыі: «Беларуская музыка запатрабаваная, таму мы знойдзем іншыя пляцоўкі. Чакайце новых канцэртаў».

**Сямён Печанко**



# Прэмія Дзянісу Раманюку

**8 верасьня ва Ўсерасейскім выставачным цэнтры адбылося ўручэньне прэміяў III Міжнароднага конкурсу «Мастацтва кнігі» дзяржаваў СНД». Гран-пры атрымаў мастак Дзяніс Раманюк (на фота зьлева), аўтар-укладальнік альбому «Чарнобыль».**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Праваслаўная Царква не даруе каліноўцам

Праваслаўнае брацтва Сьв.Архістраціга Міхаіла ў Менску выдала кнігу Гардзея Шчаглова «1863-ці — забытыя старонкі».

Яе паўсотні старонак прысьвечаны памяці праваслаўнага сьвятара Данілы Канапасевіча, «нявінна забітага польскімі мяцежнікамі». Менавіта так — «польскімі мяцежнікамі», бо на працягу ўсёй кнігі няма ніводнай згадкі пра паўстанцаў-беларусаў, ані пра Кастуся Каліноўскага.

Сьвятар Багушэвіцкай царквы (Ігуменскі павет) Д.Канапасевіч не любіў палякаў. Скончылася гэта тым, што ён данёс пра паўстанцкі атрад уладам. Паўстанцы пакаралі яго за гэта шыбеніцай.

Паводле аўтара «Забытых старонак», паўстаньне, якое «мела сэнс для палякаў, памешчыкаў, ксяндзоў і наагул для карэннай Польшчы», ня мела ніякага сэнсу для «праваслаўнага беларуска-літоўскага насельніцтва заходніх губэрняў» і абярнулася чарговай трагедыяй для жыхароў нашага краю, прынёсшы народу нямала гора. Аўтар кнігі хваліць графа Мураўёва, віленскага генэрал-губэрнатара, энэргічнага душыцеля паўстаньня.

Рэлігійнае, як пададзена ў выходных зьвестках, выданьне надрукаванае ў 2005 г. накладам 2 000 асобнікаў з блаславеньня мітрапаліта Філарэта. Яно распаўсюджваецца ў праваслаўных цэрквах.

**Сямён Печанко**


## У што я веру

Новая перадача Свабоды

**Я веру ў інтуіцыю**
**Я лічу, што за каханьне змагаюцца**
**Я мяркую, што варта трымацца сярэдзіны**
**Я перакананы, што лічбы ня хлусяць**

У што са свайго досьведу верыце вы?

Пішыце: **п/с 111, Менск, 220005**
**svaboda@rferl.org**

**радыё свабода**
**www.svaboda.org**

# Чытачы nn.by: хочам праваслаўных у беларускіх выданьнях

Артыкул «Праваслаўныя не даруюць паўстанцам 1863 году» выклікаў жывое абмеркаваньне наведнікаў сайту nn.by. Прапануем вашай увазе ўрыўкі з камэнтароў, пакінутых чытачамі.

**Фядута напісаў(ла) Верасень 9, 2006 у 15:36**

А ці не рыхтуе ўладыка Філарэт кананізацыю айца Канапасевіча?!

**Radykal напісаў(ла) Верасень 9, 2006 у 17:05**

Яшчэ адзін прыклад неабходнасьці аўтакефаліі. Пасьля аднаўленьня незалежнасьці нельга дапусьціць да расколу праваслаўя, як гэта адбылося ва Украіне.

**Burbalka напісаў(ла) Верасень 9, 2006 у 17:37**

Брацтва архістраціга Міхаіла было створанае ў пач. 90-х гадоў у Петрапаўлаўскім саборы, разам з Брацтвам сьвятых Віленскіх пакутнікаў. Два брацтвы бы ўраўнаважвалі адно аднаго — адны расейскія імпэрыялісты, другія — беларускія нацыяналісты. Потым брацтва Архістраціга Міхаіла пачало будаваць храм — Сьвятапакроўскі ў Вясьнянцы, дзе, паміж іншым, служыць і сьвятар Аляксандар Шрамко. Брацтва будуе храм — усе скарбонкі, якія вы бачыце ў мэтро, у крамах, дзе напісана пра ахвяру на храм у Крупцах — гэта Міхайлаўскія скарбонкі. Брацтва рэгулярна праводзіць Сьвятаміхайлаўскія чытаньні, у якіх удзельнічаюць «правыя» праваслаўныя сілы прарасейскай скіраванасьці. Узначальвае брацтва Алег Дзіціеўскі. Брацтва мае вялікую ступень аўтаномнасьці, вялікія фінасавыя рэсурсы, шырокія сувязі ў органах улады, а таксама ў Расеі ў праваслаўных колах. Сайт брацтва: http://www.stratig.ru/.

Зь іншага боку, зь імем Кастуся Каліноўскага, з паўстаньнем 1863 г. зьвязаны ўціск праваслаўных. Тое паўстаньне так і засталося «польскім» і «шляхецкім», якія б мэты перад сабой ні ставіла.

**брат напісаў(ла) Верасень 9, 2006 у 22:47**

Увогуле, цікава, што там у братоў-праваслаўных робіцца? Ці там якія перамены высьпяваюць? Ці заўважаюць яны, скажам, гістарычныя артыкулы Латышонка? Ці гуртуюцца неяк інтэлектуальныя сілы? Ці піша зь іх хто што, як Рудкоўскі ў каталікоў? Напішэце, праваслаўныя!

**Алесь Чавус напісаў(ла) Верасень 10, 2006 у 11:48**

Маскоўская царква тады афіцыйна зьяўлялася такой жа часткай дзяржаўнага апарату імпэрыі, як і войска альбо жандары.Таму поп дзейнічаў і загінуў як «боец невидимого фронта».

**Pan напісаў(ла) Верасень 10, 2006 у 14:04**

Праваслаўная Царква, на жаль, апошнія 200 гадоў была і застаецца ворагам беларушчыны... Мужыкі пасьля прыгону выдавалі паўстанцаў зусім зь іншых, далёка не рэлігійных прычынаў.

**Burbalka напісаў(ла) Верасень 10, 2006 у 18:19**

Спадар Фядута, цяпер такі расклад, што япіскапы ніякіх кананізацый «зьверху» ня могуць падрыхтаваць, калі ня будзе шанаваньня «зьнізу». Наагул, кананізацыя — гэта не праваслаўны тэрмін, а каталіцкі, у праваслаўных у прынцыпе няма працэдуры кананізацыі, хаця цяпер прызнаньне народнага шанаваньня як належнага прысутнічае. Вось у Беларусі нядаўна да ліку сьвятых прылічылі Валянціну Менскую — гэта выключна ініцыятыва народу царкоўнага. Перад тым быў праслаўлены і сабор Навамучанікаў беларускіх, замучаных у гады савецкай улады, аднак народнага шанаваньня амаль няма.

Пытаньне скасаваньня Уніі, як і ўзнікненьня, складанае. Ня трэба забывацца на тое, як вынішчалася праваслаўе ў Рэчы Паспалітай. Як стварылася Унія, так яна і скасоўвалася.

Пра аўтакефалію разважаюць сьмешна. Аўтакефалія — гэта справа самой праваслаўнай царквы, а ня нейкіх «зьнешніх» людзей. Звычайна менавіта гвалт з боку дзяржавы і прыводзіў да расколу, як ва Украіне. Калі б украінцы не пасьпяшаліся з аўтакефаліяй, то аўтакефалію яны б атрымалі, прычым законна.

Праваслаўная Царква — ня вораг беларушчыны. Але зь яе робяць ворага беларушчыны. Чым больш умешваецца «разумнікаў» ува ўнутраныя справы Царквы, тым больш Царква замыкаецца ў сабе, і тым менш прыслухоўваецца да «голасу грамадзкасьці».

Што тычыцца інтэлектуальных сілаў кшталту Рудкоўскага, то такія сілы ёсьць, але іх ніколі не надрукуюць у выданьнях кшталту «Нашай Нівы» ці «ARCHE», бо гэтыя выданьні чамусьці не зацікаўленыя ў тым, каб разбураць існыя міты аб Праваслаўнай Царкве.

**Віталь з Менску напісаў(ла) Верасень 10, 2006 у 20:33**

Я даўно заўважыў за «НН» грэх закрытасьці ў дачыненні да праваслаўя. Мару ўбачыць у «НН» артыкулы пра беларускіх праваслаўных сьвятароў, пра старонкі праваслаўнай мінуўшчыны. Хочацца паглядзець на Царкву зь беларускага боку і замірыцца зь ёй. Давайце руйнаваць залішнія межы.

**Ігар напісаў(ла) Верасень 10, 2006 у 22:42**

Калі б у «НН» нешта цікава напісанае пра Праваслаўную Царкву даслалі б, то гэта было б надрукавана. А калі БЕЛАРУСКАГА ў БПЦ адбываецца мала, то і пісаць няма пра што...

**рэдактар напісаў(ла) Верасень 10, 2006 у 22:42**

Пра каталіцкае жыцьцё ў «НН» больш найперш таму, што каталікі самі актыўна пішуць у газэту. У многіх каталікоў ёсьць духоўная патрэба пісаць па-беларуску і чытаць па-беларуску, пісаць у незалежную газэту і чытаць незалежную газэту. Мусіць, праваслаўных сьвятароў і сьвецкіх актывістаў з такою духоўнаю патрэбаю покі што менш. Быў бы рады памыліцца. Праваслаўных ня толькі чакаем, але і запрашаем. Здаецца, што новае пакаленьне праваслаўных сьвятароў і інтэлектуалаў ёсьць. Было б маральным марнатраўствам, каб яно абмяжоўвалася інтэрнэт-форумамі.

# Праваслаўныя ладзяць першы фэстываль

«Беларусь праваслаўная» — першы рэспубліканскі фэстываль пад такой назвай мае прайсьці 16—18 верасьня ў Воршы.

Ён стане пашыраным працягам леташніх Першых Куцеінскіх чытаньняў. Мясцовыя ўлады і царкоўнікі спадзяюцца, што ягонае правядзеньне дапаможа вырашыць шмат праблемаў. Ужо восьмы год будуецца невялікі ў памеры гарадзкі сабор (дарэчы, на падмурках разбуранай царквы XVII ст.). Ніяк не пачнецца будаўніцтва цаглянага храму ля чыгуначнага вакзалу. Там па-ранейшаму набажэнствы вядуцца ў пераабсталяваным вагончыку. У паўразбураным стане знаходзіцца былы Пакроўскі манастыр.

У арганізатараў фэстывалю ёсьць спадзяваньні, што ён падыме й маральны аўтарытэт мясцовага праваслаўнага духавенства, прадстаўнікі якога, за рэдкім выняткам, асаблівай павагай месьцічаў не карыстаюцца. Але галоўнае, дзеля чаго ўсё ладзіцца, — вырашэньне праблемаў Куцеінскай лаўры — выдатнага культавага і гісторыка-культурнага помніка XVII ст. За яе сёньняшні занядбаны стан і мясцоваму чынавенству, і сьвятарам, і ўсім аршанцам павінна быць сорамна. Як стала вядома, урад мае зацьвердзіць праграму рэстаўрацыі і рэканструкцыі гэтага аб’екту на 2007—2010 г. У дні фэстывалю пройдуць навуковая канфэрэнцыя, розныя імпрэзы, выставы і конкурсы. Мяркуецца, што ён стане традыцыйным.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

# Воля ў няволі

Незалежнае грамадзтва будзе сапраўды незалежным, толькі калі навучыцца ствараць уласны бізнэс. Піша **Бірута Янкевіч.**

Апошнія гады часта задаюся пытаньнем: што такое свабода? Дакладней, што такое свабода ў Беларусі?

Аналізуючы асабістыя адчуваньні, зьвязаныя з акрэсьленай тэмай з 1998 году, разумею, што зьмянілася ня тое што шмат — зьмяніліся да горшага амаль усе вонкавыя фактары (пры зьмене да лепшага ўнутраных часам падаецца, што можна зьехаць з глузду). У 1998-м мы зь сябрамі без праблемаў ладзілі дзіцячыя гістарычныя летнікі, размаўлялі па-беларуску і шчыра верылі, што пару годзікаў пазаймаемся дзецьмі — і росквіт грамадзянскай супольнасьці ня дасьць магчымасьцяў да ўмацаваньня аўтарытарызму ў нашай краіне. Ва ўнівэрсытэце мяне ня вельмі цікавіла стаўленьне да мяне выкладчыкаў, якія прасілі «не перашкаджаць ім праводзіць заняткі», калі я задавала пытаньні, якія іх як мінімум ставілі ў тупік (відаць, трошкі была падобная да Сакрата тады і шчыра верыла, што людзі ня могуць не імкнуцца да праўды — проста ім ніхто не задаваў правільных пытаньняў). Але на абароне дыплёму яны ўсе рабілі выгляд, што цешацца, што маюць хоць адзін беларускамоўны дыплём.

Сьвет пачаў пераварочвацца, калі давялося шукаць працу, і нешта ніхто не рэагаваў на беларускамоўную эканамістку так, як хацелася б — давялося размаўляць восем гадзінаў на дзень па-расейску. Але гэта каштавала дорага. Гэта крэсьліла мае прынцыпы, мой сьветапогляд і, урэшце, маю надзею на хуткія зьмены.

Выйшла, што я проста за грошы прадаю свае прынцыпы (фармальна можна сказаць — за аплачаную працу). Далей — весялей. У 2004-м я перастала пісаць у CV пра свой досьвед працы ў грамадзкім сэктары, старалася не размаўляць на працы пра свае вялікія пляны, зьвязаныя з адукацыяй, пра тое, як праходзіць мой адпачынак, і падобныя рэчы.

Выйшла, што дзяржава ў пэўным сэнсе набыла грамадзтва. За тое, каб фірму «асабліва не чапалі», фірма намагаецца быць найбольш ляяльнай да дзяржавы. А актыўныя маладыя беларускамоўныя людзі, нават з добрай адукацыяй, нават з найлепшымі вынікамі па прафэсійных тэстах, якія гэтая фірма ладзіць, — гэта рызыка. Можа, не вялікая, але рызыка — трапіць «у чорны» сьпіс, а пасьля, як вядома — пара-тройка праверак, і з нашым заканадаўствам — закрыцьцё па адной з формаў, калі такая мэта дзяржавай будзе пастаўленая. Таму чалавек мусіць альбо згаджацца на правілы гульні дзяржавы — ціхенька дома размаўляць пра тое, што яму не падабаецца, фактычна становячыся калябарантам, ці шукаць горшую працу, дзе ён можа згубіцца сярод сярэднестатыстычных работнікаў. Гэта правіла не без выняткаў — але нават на працу да сваёй мамы я ня трапіла, бо яна лічыла, што мая грамадзкая дзейнасьць будзе рызыкай для яе фірмы.

Вось і выходзіць: каб адчуваць сябе свабодным, трэба альбо мець аплачаную тым ці іншым чынам працу ў грамадзкіх ці палітычных апазыцыйных арганізацыях, альбо зьехаць за мяжу.

Таму і ствараецца дзіўная сытуацыя: бальшыня грамадзтва так ці інакш калябаруе з рэжымам.

Здаецца, што стварэньне альтэрнатыўнай супольнасьці, фактычна грамадзтва ў грамадзтве, — гэта вартае выйсьце. Мы можам ствараць культурніцкія, інтэлектуальныя асяродкі, такога кшталту рэзэрвацыі даюць свой плён, мультыплікуюць людзей, што незалежна мысьляць. Аднак мы падпіхваем людзей да незалежнага мысьленьня — і?.. Ці яны ў нашай краіне становяцца ад гэтага шчасьлівымі, калі ім трэба хаваць свае думкі спачатку ў навучальных аўдыторыях, а пасьля на працы, каб дасягаць нейкіх посьпехаў ці проста не згубіць гэтую вучобу і працу? Падаецца, што выйсьцем было б навучыцца ствараць эфэктыўныя бізнэс-асяродкі. Відавочна, што калі чалавек незалежны матэрыяльна і ведае, што яго заўтра ня выкінуць з працы за мову ці ягоныя погляды, а будуць гэта вітаць, нашае гета будзе пашырацца. У прынцыпе, распаўсюджваньне эфэктыўнай альтэрнатыўнай культуры нерэальнае без пранікненьня яе ва ўсе магчымыя сфэры жыцьця грамадзтва. Гэта трошкі ненатуральна, калі можаш быць Чалавекам толькі дома, у Інтэрнэце ці зь сябрамі — павінен быць поўны спэктар, які б уключаў прынамсі яшчэ й працу.

Мы, на жаль, замала думалі пра стварэньне сваіх бізнэсаў у мінулым. Але ж кожны чалавек з арганізатарскімі здольнасьцямі можа даць працу адной-тром асобам з свайго асяродку. Гэта будуць моцныя каманды: звычайна людзі, павязаныя эмацыйна, працуюць больш эфэктыўна. Справа гэтая няпростая, але альтэрнатыва — толькі стварэньне гэткіх жа рэзэрвацыў за межамі ўласнай краіны. Толькі апошняе выклікае значна менш энтузіязму...

*Гомель*

P.S. Калі каму цікава — магу падзяліцца ідэямі і дапамагчы ў разьліку варыянтаў (на жаль, па-за разьлікам застануцца «непрадугледжаныя выдаткі» і няспынная зьмена падатковага і іншага заканадаўстваў).

## Рэпрэсаваныя беларусы атрымаюць працу ў Польшчы

Камітэт дапамогі рэпрэсаваным удакладняе сьпісы людзей, звольненых па палітычных матывах. Дазвол на фармаваньне беларускага будатраду атрыманы ад польскага Міністэрства працы. Камітэт дапамогі рэпрэсаваным працуе ня толькі з тымі, хто па палітычных матывах ня мае магчымасьці атрымліваць адукацыю ў Беларусі. Дапамагаюць і тым, хто з тых жа прычынаў страціў працу. Супрацоўніца камітэту Ала Кароль кажа, што дамоўленасьць пра працаўладкаваньне рэпрэсаваных актывістаў пакуль дасягнутая толькі з Польшчай. Складзены сьпіс на 67 асобаў, які цяпер удакладняецца. Дазвол на працу ў Польшчы атрыманы ад польскага Міністэрства працы. Беларусы будуць працаваць у будаўнічай фірме за 20 км ад Варшавы. Ім дапамогуць аформіць неабходныя дакумэнты. У выпадку посьпеху праект будзе пашырацца. Звольненыя за палітыку людзі могуць дасылаць зьвесткі пра сябе ў Камітэт дапамогі рэпрэсаваным.

**СП**



**Пятро Крышчык**
працуе таксоўшчыкам меней за год, ён у мінулым — прафэсійны баскетбаліст. За сваю кар’еру многа дзе гуляў.

Крышчык пачынаў у слаўным менскім РТІ, у найвышэйшай лізе савецкага чэмпіянату, а гэта быў сапраўдны ўзровень, не раўняй зь сёньняшнім беларускім першынством. Выступаў за зборную БССР.

Пасьля пачалася легіянэрская старонка ў біяграфіі Крышчыка: Славаччына, Лібан, Расея, Гішпанія.

# Таксоўкі пад нацыянальным сьцягам

Былы баскетбаліст Пятро Крышчык маніцца згуртаваць вакол сябе беларускамоўных таксоўшчыкаў Менску.

На стылёва зробленай візытоўцы ў таксоўшчыка Пятра Крышчыка выява бел-чырвона-белага сьцяга, а таксама надпісы «Жыве Беларусь!» і «Нашай Ніве» сто гадоў». Замовіць паслугу менавіта ў такога кіроўцы, напэўна, гонар для кажнага беларускамоўнага грамадзяніна ў нашай сталіцы. «Перад выбарамі занёс свае візытоўкі ва ўправу БНФ, думаў, будзе шмат замоваў. Аж не! Званкі пачаліся, толькі калі людзі сталі выклікаць з Акрэсьціна».

Пятро працуе таксоўшчыкам меней за год, ён у мінулым — прафэсійны баскетбаліст. За сваю кар’еру многа дзе гуляў.

Крышчык пачынаў у слаўным менскім РТІ, у найвышэйшай лізе савецкага чэмпіянату, а гэта быў сапраўдны ўзровень, не раўняй зь сёньняшнім беларускім першынством. Выступаў за зборную БССР.

Пасьля пачалася легіянэрская старонка ў біяграфіі Крышчыка: Славаччына, Лібан, Расея, Гішпанія. «Менавіта ў Славаччыне, — кажа, — я канчаткова вызначыўся як беларус. Усе гэтыя падзеі, што адбываліся тады ў краінах былога сацыялістычнага лягеру, рабілі на мяне моцнае ўражаньне. Славакі адкрыта казалі, што саветы — гэта акупанты. Я й падумаў: і мы ж, беларусы, таксама ўвесь час былі пад чыімсьці панаваньнем».

Пятро адзначае, што беларускасьць заўсёды праходзіла фонам празь ягонае жыцьцё. «Мой бацька працаваў журналістам у мастоўскай раёнцы «Зара над Нёманам», таму я быў прывучаны чытаць па-беларуску. Потым быў інтэрнат РТІ, там я прачытаў «100 пытаньняў і адказаў з гісторыі Беларусі», пачуў пра Курапаты, упершыню трапіў на Плошчу», — апавядае Пятро.

У 1998 г., калі кар’ера гульца яшчэ працягвалася, Пятро з падачы сябра пачаў чытаць «Нашу Ніву», тады ў яго быў ня самы лепшы жыцьцёвы этап, і «НН» дапамагла яму пераадолець траўму і пачаць зноў гуляць. Ён і сёньня застаецца верным газэце.

Сёлета ў сакавіку Пятро таксама быў на Плошчы. Ён кажа, што да яго і блізка не падыходзілі спэцназаўцы, хоць і хадзіў блізка ля іх. Гэта й ня дзіва — Крышчык мае двы мэтры ўвышкі і важыць болей за цэнтнэр. Празь ягоныя калярытныя габарыты на яго доўгі час з падазраньнем пазіралі на той жа ўправе БНФ. «Думалі, што я агент», — сьмяецца ён.

Скончыўшы кар’еру спартоўца, Пётра Крышчык, як бальшыня ягоных калегаў, пайшоў працаваць трэнэрам зь дзецьмі. «Але ж вы самі мусіце разумець, што такое быць дзіцячым трэнэрам, — уздыхае ён. — Заробку хапае толькі на паліва, каб езьдзіць на працу і назад». Пётра і сёньня спрабуе не пакідаць трэнэрства, працягваючы працаваць зь дзецьмі на Аўтазаводзе, але часу выпадае ўсё меней.

Крышчык пачаў кіраваць маршруткай. «У Зялёны Луг хадзіла маршрутка, дзе гучала музыка Бартосіка й «Народны альбом».

Аднак праца кіроўцы маршруткі стамляла Пятра. «Праца таксоўшчыка ж мае тую перавагу, што я магу ў любы момант дня, калі няма выклікаў, прыехаць і дапамагчы жонцы па гаспадарцы».

Зь лютага на панэлі Пётравага аўтамабіля прымацаваны бел-чырвона-белы сьцяжок. Кліенты радуюцца: «Хоць раз у жыцьці пад праўдзівым сьцягам праедуся». Неяк нават ДАІшнік спыніў мяне за ідавочнае парушэньне правілаў, але, згледзеўшы сьцяжок, адпусьціў проста так.

Пятро мае мару: згуртаваць вакол сябе каманду беларускамоўных таксоўшчыкаў і нават адкрыць фірму ў доўгатэрміновай пэрспэктыве. Хто ведае, можа, па нейкім часе ў Менску зьявіцца беларускамоўная фірма таксовак, уладальнікам якой стане Пятро Крышчык.

**Зьміцер Панкавец**

# Севярынец: «Мяне дапытвалі як абвінавачанага»

У сераду ў Полацку памочнік пракурора Полацкага раёну Руслан Грыневіч правёў допыт Паўла Севярынца ў якасьці сьведкі ў справе дзейнасьці незарэгістраванай арганізацыі «Малады фронт».

Допыт цягнуўся больш за дзьве гадзіны. У Паўла склалася ўражаньне, што яго дапытвалі не як сьведку, а як абвінавачанага. У часе допыту яму прадэманстравалі раздрукоўку яго тэлефонных размоваў са Зьмітром Дашкевічам, пачынаючы зь лютага гэтага году. Пры гэтым, зазначае Павал, узгадвалі артыкул 193 ч.1 Крымінальнага кодэксу (незаконная арганізацыя дзейнасьці грамадзкага аб'яднаньня, рэлігійнай арганізацыі ці фонду альбо ўдзел у іх дзейнасьці).

На частку пытаньняў Павал адмовіўся адказваць. Ён лічыць перасьлед «Маладога фронту» незаконным, а артыкулы, кшталту 193,— ганьбай.

**СП**

# Сіўчыка пасадзілі на 10 сутак



Увечары 12 верасьня Вячаслава Сіўчыка затрымалі ў кавярні Малой залі Купалаўскага тэатру ў часе сустрэчы з журналістам Паўлюком Быкоўскім. Сіўчыка затрымлівалі 23 сакавіка, але з турмы на Акрэсьціна апазыцыянэра адвезьлі ў трэці клінічны шпіталь. В.Сіўчык патлумачыў мэдыкам, што быў зьбіты падчас затрыманьня. Праз некалькі дзён ён пакінуў шпіталь і зьехаў ва Украіну. Цяпер ён мае адседзець неадседжанае.

**МБ**

# Дайнюс Яненас: «Магільнік паўстане за 5 км ад беларускай мяжы»

І стаяць будзе трыста гадоў.

Дырэктар літоўскага агенцтва па наглядзе за радыяактыўнымі адкідамі Дайнюс Яненас распавёў карэспандэнту «НН» пра сёньняшні стан праекту пабудовы магільніка радыяактыўных адкідаў.

На сёньня разглядаюцца тры праекты. Апошні зь іх ужо пададзены на абмеркаваньне грамадзкасьці і бліжэйшым часам будзе дасланы ў Беларусь. Гэты ўчастак знаходзіцца на адлегласьці 5 км ад літоўска-беларускай мяжы. Меркаваны магільнік будзе паверхневага тыпу, у ім будуць захоўвацца адкіды, што зьмяшчаюць радыяактыўныя элемэнты сярэдняй і малой актыўнасьці. Існуюць таксама траншэйныя сховішчы, для захоўваньня малаактыўных элемэнтаў, і глыбінныя, для захоўваньня высокаактыўных элемэнтаў з працяглым пэрыядам распаду. Будучае сховішча будзе дзейнічаць каля 300 год. Гэта модульнае збудаваньне, аб'ёмам 100 тыс. м³ (на сёньня Літва мае каля 93 тыс. м³ радыяактыўных адкідаў), якое будзе напаўняцца паступова. Канструкцыі яго будуць жалезабэтонныя. Сэкцыі сховішча будуць перасыпацца адмысловай воданепранікальнай глінай. Адпрацаванае ядравае паліва, а яно ўтрымлівае высокаактыўныя элемэнты, будзе захоўвацца ў спэцыяльным сховішчы на тэрыторыі АЭС, якое ўжо пабудаванае. Там адкіды захоўваюцца 50—70 гадоў. У плянах магчымы вываз адпрацаванага паліва ў Расею. Захоўваць яго ў заплянаваным магільніку не зьбіраюцца — супакоіў Д.Яненас. Як і разьмяшчаць на тэрыторыі магільніка адкіды зь іншых краінаў — гэта забаронена літоўскімі законамі. Сп. Яненас запэўніў, што беларускі бок паінфармаваны ў поўным аб'ёме: «Адмыслоўцы зь беларускага Праматамнагляду і зацікаўленых міністэрстваў пабывалі ў нас двойчы. Яны валодаюць неабходнай інфармацыяй у роўнай ступені з нашымі спэцыялістамі. Літоўскі бок і надалей будзе працягваць усебаковае супрацоўніцтва зь Беларусяй». Вызначыцца з выбарам месца літоўцы мусяць пры канцы гэтага году ці на пачатку наступнага.

Летась місія МАГАТЭ разгледзела ўсе тры варыянты разьмяшчэньня сховішча. З пункту гледжаньня бясьпекі для Беларусі, Літвы і Латвіі яны ацэненыя здавальняльна.

Міністэрства аховы прыроды Беларусі распаўсюдзіла зьвесткі пра магчымы нэгатыўны ўплыў на тэрыторыю Беларусі ў выніку будаўніцтва Літвой сховішчаў радыяактыўных адкідаў і адпрацаванага ядравага паліва. Гідраграфічныя і гідралягічныя ўмовы ў раёне будаўніцтва абумоўліваюць сьцёк паверхневых водаў на тэрыторыю Беларусі. У выпадку выкіду радыяактыўных элемэнтаў у навакольнае асяродзьдзе менавіта воднымі шляхамі можа адбыцца асноўнае забруджаньне вадатокаў Беларусі. Магчымае забруджваньне можа распаўсюдзіцца на Беларусь і паветраным шляхам.

Навучаная досьведам Чарнобылю, Беларусь распрацавала аўтаматызаваную сыстэму радыяцыйнага кантролю.

У 30-кілямэтровай зоне ля Ігналінскай АЭС на тэрыторыі Беларусі такая сыстэма функцыянуе 10 гадоў. 9 стацыянарных пастоў працуюць у бесьперапынным рэжыме. Кожныя 10 хвілінаў зьвесткі вымярэньняў перадаюцца ў Цэнтры рэагаваньня ў Браславе і Менску.

З праблемамі захоўваньня радыяактыўных адкідаў сутыкаюцца ўсе дзяржавы «ядравага клюбу», ці атрымліваюць электраэнэргію ад АЭС. Суседнія з намі Расея і Украіна не вынятак. У Расеі ўжо 10 гадоў вядуцца выпрабаваньні новага тыпу сховішчаў, якія верагодна збудуюць на Кольскай паўвыспе. Калі экспэрымэнт будзе ўдалым (высьветліцца гэта толькі яшчэ праз 10—15 гадоў), то захоўваць шкодныя адкіды можна будзе без перазахоўваньня некалькі тысячаў гадоў.

**Сямён Печанко**

**Ігналінская АЭС**

**выйдзе з эксплюатацыі на пачатку 2010-га, калі спыніць працу 2-гі блёк станцыі. Першы блёк ІАЭС быў спынены 31 сьнежня 2004. Балтыйскія краіны маюць праект збудаваньня новай АЭС на тым самым месцы, паводле заходніх тэхналёгій. Зачыненая станцыя працавала на савецкіх тэхналёгіях.**

# Ісьціна ў «Белтрансгазе», а не ў віне

Не пасьпеў сьціхнуць у Расеі скандал, зьвязаны з забаронай на продаж малдаўскіх і грузінскіх вінаў, як галоўны санітарны ўрач гэтай краіны заявіў, што можа быць забаронены і ўвоз вінаў зь Беларусі.

У расейскіх спэцыялістаў «узьніклі пытаньні» адносна іх якасьці.

Калі справа з малдаўскім і грузінскім віном набывала відавочныя палітычныя матывы, дык якіх мэтаў хоча дасягнуць расейскі бок, забараніўшы беларускае віно? У Беларусі амаль не расьце вінаград. Большасьць віна гатуецца з прывазной малдаўскай сыравіны, таму сур'ёзнага ўдару для эканомікі ня будзе.

Памочнік старшыні канцэрну «Белдзяржхарчпрам» па сувязях з грамадзкасьцю Пётар Кавуноў кажа, што гэтае прадпрыемства сёлета наагул не гандлявала ні віном, ні гарэлкай з Расеяй. Зь віном не вытрымліваецца канкурэнцыі ў цане, а з гарэлкай — няма акцызнай маркі. Кавуноў мяркуе: найхутчэй вядзецца пра нейкаю партыю «чарніла», што кантрабандным шляхам трапіла ў якую-небудзь Смаленшчыну з суседняй Магілёўскай вобласьці. «У Расеі ўвогуле амаль не засталося вінзаводаў, усё стаіць у запусьценьні, таму ня дзіва, што нехта цягае лесам зь Беларусі «бырла». Гэта выгадная справа, на якой можна добра зарабіць, — зазначае П.Кавуноў. — Калі ж высьветліцца, што нехта паставіў няякасны прадукт у Расею, то гэтыя людзі натуральна павінны быць пакараныя».


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

На менскім заводзе вінаграднага віна і на клімавіцкім лікёра-гарэлачным нам паведамілі, што не гандлююць з Расеяй, хоць і плянавалі ў найбліжэйшы час пачаць. Але цяпер няпэўныя, што адбудзецца ў гэтай сытуацыі.

Эканаміст Зьміцер Бабіцкі кажа, што забарона на ўвоз віна ў Расею ня стане фатальнай для беларускай эканомікі, яна літаральна адаб'ецца на некалькіх сотнях чалавек, што працуюць на заводах, якія маюць гандаль з Расеяй. «Наша вінная прамысловасьць надта невялікая ў параўнаньні з Малдовай і Грузіяй».

Палітоляг Аляксандар Класкоўскі раіць зірнуць на пытаньне магчымай забароны шырэй: «Ідзе мытная вайна. Нядаўна беларускі бок затрымаў на мяжы расейскія фуры з непадакцызным таварам. Сёньня расейцы забараняюць увоз віна, заўтра, магчыма, забароняць увоз цукру ці нечага іншага. Гэта пытаньне коштаў на газ, адзінай валюты, канстытуцыйнага акту і г.д. А віно — толькі прыватны момант».

З усяго відаць, Расея сапраўды выпрацавала стратэгію «віннага тэрарызму» для непадкантрольных ёй краінаў СНД, але ў беларускім выпадку яна ня будзе мець амаль ніякіх наступстваў. Таму гэты крок выглядае вельмі дзіўным. Чакаем іншых забаронаў.

**Зьміцер Панкавец**

# Улады трасуць аўтабізнэс

Кіраўнік Рады бясьпекі Беларусі Віктар Шэйман пастанавіў праверыць беларускі аўтабізнэс.

Менавіта яму, аднаму з найбліжэйшых да прэзыдэнта людзей, напэўна, даручылі высьвятліць, як Беларусь за сем месяцаў павялічыла імпарт аўто ў краіну больш як на 100 млн даляраў.

Такі рост непакоіць урад, бо замінае выкананьню прагнозных паказьнікаў-2006 і не спрыяе памяншэньню адмоўнага сальда замежнага гандлю. Пра гэтую заклапочанасьць 5 верасьня згадала засупніца міністра эканомікі Тацяна Страчанка. Яна адзначыла: ва ўрадзе разумеюць прычыны такога росту і ніякіх захадаў рабіць не плянуюць. Аднак сьлед праверыць, і Шэйман пачаў дзейнічаць.

6 верасьня ля паўдня на аўтадылераў сышла лявіна праверальшчыкаў. Як паведамляе надзейная крыніца, пад праверку трапілі «Юкола», «Атлянт-М», аўтадром «Энэргія» і інш. Апэрацыя ў высьвятленьні сытуацыі на рынку сваімі маштабамі ўражвае.

Праверальшчыкаў аўтобусамі павезьлі на згаданыя прадпрыемствы. Палова ня ведала, куды іх вязуць (каб не было ўцечкі інфармацыі). Загаду свайго кіраўнікі праверкі не паказваюць: «гэта сакрэтны дакумэнт». Праверку, ініцыяваную на асабістае ўказаньне Шэймана, ачольвае Служба бясьпекі прэзыдэнта, паведамляе крыніца.

Паводле яе, да праверальшчыкаў, акрэм Службы бясьпекі, былі далучаныя прадстаўнікі Пракуратуры, АБЭЗ, падатковай паліцыі, КДК, Камітэту цэнаўтварэньня і г.д.

Агулам каля дзесяці органаў кантролю. Прыцягнутыя адмыслоўцы і не з кантралюючых органаў, зазначыла крыніца. Праверка мае доўжыцца да 15 кастрычніка.

Крыніца падкрэсьлівае: «Праверка ўсё апячатвае. Зазірае ў кожную сьметніцу».

Памочнік гендырэктара холдынгу «Атлянт-М» Ільля Прохараў пацьвердзіў факт пачатку праверкі. «Нічога звышнатуральнага не адбываецца, — сказаў ён. — Нам няма чаго хаваць. «Атлянт-М» працуе ў звычайным рэжыме».

Інфармацыю аб тым, што ў групы праверкі ўваходзяць адмыслоўцы з розных ведамстваў, пацьвердзілі ў СП ТАА «Юкола-Сэрвіс». «Нам паведамілі, што гэта плянавая праверка, але не паводле пляну падатковых органаў», — патлумачыла галоўная бухгальтарка «Юколы».

Па часе стане вядома, якія былі мэты такой татальнай праверкі.

**Паводле afn.by**


PHOTO.BYMEDIA.NET

# Аляксандар Фядута: Быў такі Булахаў...

Цяперашняе пакаленьне ўжо амаль ня памятае, хто гэта такі. А ў 1991—1993 г. ён быў лепей знаны за самога Лукашэнку. І нашмат папулярнейшы. Проста ўзрост не дазваляў яму ўдзельнічаць у прэзыдэнцкіх выбарах.

І тады ён пастанавіў зрабіць стаўку на Лукашэнку. Ён, Ганчар і Сініцын. Толькі гэтым тром, самому сабе і беларускаму народу Лукашэнка мог лічыць сябе хоць чымсьці абавязаным. Ды яшчэ Кебічу, які высакародна «пакрыў» яго ў гісторыі з бортправадніцкай.

Дзіма быў вельмі прыгожы. Мая сталая маці любавалася ім на тэлеэкране гадзінамі — калі ён прапаноўваў на сэсіях чарговыя законапраекты. Сам ён шчыра меркаваў, што падобны на Алена Дэлёна. Магчыма, так яно і было.

У 1994 г., пасьля перамогі, Дзіма разьлічваў ачоліць Канстытуцыйны суд. Але галоўны пераможца гэтага не схацеў. І Булахаў на даўгія гады зьнік у забыцьцё.

Зрэшты, ці вярнуўся ён адтуль? Што і хто сёньня памятае пра Дзьмітрыя Пятровіча?

Памятаюць: быў такі.

Памятаюць: сарваў рэфэрэндум пра роспуск Вярхоўнага Савету, ініцыяваны БНФ. А зь якой нагоды плянаваўся гэты рэфэрэндум — цяпер ужо гэта справа гісторыкаў і палітычна заклапочаных грамадзянаў.

Памятаюць: ганарыўся Канстытуцыяй 1994 году. Той самай, паводле якой мы і абралі Лукашэнку.

Што яшчэ?..

І толькі тыя, хто ведаў яго асабіста, уздыхнуць аб нерэалізаваных мажлівасьцях гэтага напраўду таленавітага чалавека, які пераступіў цераз уласныя прынцыпы — а можа, проста іх ня меў.


WWW.BELGAZETA.BY

# Папулярны расейскі рок-гурт запісаў песьню па-беларуску

«Беларускую, як і ўкраінскую, вэрсію песьні «Вясна» мы вырашылі запісаць адмыслова для слухачоў суседніх краінаў», — кажа вакалістка гурту «Город 312» Ая.

Беларускую «Вясну» гурт запісаў для беларускай вэрсіі свайго новага альбому «Па-за зонай доступу». «Город 312» прэтэндуе на прэстыжную прэмію MTV Russia Music Awards 2006 (найлепшы гурт, адкрыцьцё году, найлепшы рок-праект, песьня году, рынгтон году).

Ая апавядае, што прыйшлося папрацаваць над вымаўленьнем, бо раней яна зь беларускай мовай не сутыкалася: «Але мы былі старannymі вучнямі! І беларусам будзе прыемна»

**music.fromby.net**

# Януковіч і Качыньскі злучаць Украіну і Польшчу трубой

Нафтаправод Адэса—Броды ўсё ж будзе падоўжаны да Плоцку. Польшча і Ўкраіна хочуць, каб праект прафінансавала Эўракамісія.

Прэм’ер Яраслаў Качыньскі ясна заявіў, што Польшча зацікаўленая падаўжэньнем трубаправоду. Украінскі кіраўнік ураду Віктар Януковіч падтрымаў задуму пасьля перамоваў з Качыньскім.


WWW.M42.PL

**Яраслаў Качынскі хоча зьдзейсьніць тое, што пры экс-камуністах заставалася на паперы.**

Так распачаўся XVI Эканамічны форум у Крыніцы — месца сустрэчы бізнэсу, палітыкі і няўрадавых арганізацыяў, што называюць польскім Давосам. Сёлета на ім прысутнічал і прадстаўнічая дэлегацыя беларускага незалежнага грамадзтва.

Труба, пра будаўніцтва якой дамаўляюцца прэм’еры, мусіла б перапраўляць каспійскую нафту з Казахстану і Азэрбайджану. Польскі прэм’ер павінен весьці гаворку пра гэтую інвэстыцыю падчас візыту ў ЗША.

В.Януковіч пацьвердзіў, што Ўкраіна зацікаўленая ў транспартаваньні каспійскай нафты ў Плоцк і мае неабходную інфраструктуру. Трэба збудаваць толькі польскую нітку.

Адкуль возьмуцца грошы на гэта? Прэм’ер Качыньскі абвясьціў, што з Эўразьвязу. На будаўніцтва ў 2007—2013 г. маглі б знайсьціся сродкі ў праграме «Інфраструктура і асяродзьдзе». Рашэньне, ці пойдуць 400 млн эўра на энэргаінвэстыцыі, будзе прымаць Эўракамісія.


AP

**Віктар Януковіч не зьмяняе курсуЎкраіны.**

Працяг трубаправоду з Украіны да Плоцку мог бы прафінансаваць і Эўрапейскі інвэстыцыйны банк.

**ВД**

# Скандал у Літве: Пацюнаса забілі свае? Сакратар МЗС – расейскі шпіён?

Ці наадварот: усё гэта правакацыя расейскіх спэцслужбаў.





**Сьмерць дыплямата літоўская апазыцыя выкарыстала ў сваіх мэтах. Вітаўтас Пацюнас (фота зьверху) выпаў зь дзявятага паверху берасьцейскага гатэлю «Інтурыст» пасьля дыпляматычнага раўту.**

**У Літве скандал: спэцслужбы затрымалі рэдактара жоўтай газэты *Laisvas Laikrastis* і сканфіскавалі наклад гэтага тыднёвіка.** Афіцыйнае абвінавачаньне: разгалошваньне дзяржаўнай таямніцы. У сканфіскаваным нумары было два скандальныя артыкулы: адзін абвінавачваў у карупцыі экс-прэм’ера Бразаўскаса і экс-шэфа сойму Паўлаўскаса, а другі ўскладаў віну за сьмерць дыплямата Пацюнаса ў Берасьці на літоўскія спэцслужбы.

Умяшаўся прэзыдэнт Адамкус. Ён палічыў арышт замахам на свабоду слова, і рэдактар Дрыжус выйшаў на свабоду. Праваабаронцы і журналісты віталі такі крок Адамкуса.

Спэцслужбы кажуць: усё гэта расейская правакацыя. Помста за дзеяньні літоўскіх спэцслужбаў супраць Віктара Ўспаскіх, бізнэсоўца і палітыка, цесна павязанага з Масквой. За фінансавыя махінацыі ён быў адхілены ад пасады і цяпер хаваецца ў Маскве. А публікацыі *Laisvas Laikrastis* — частка чорнага піяру, які мае пасеяць недавер да дзяржаўных інстытутаў Літвы.

Аднак многія назіральнікі мяркуюць, што акцыя спэцслужбаў была спробаю адцягнуць увагу ад сьмерці Вітаўтаса Пацюнаса, які выпаў з акна гатэлю «Інтурыст» у Берасьці. Паводле некаторых назіральнікаў, вінаватых трэба шукаць не ў беларускім КДБ, як адразу былі маніліся, а ў літоўскай службе ВСД. Маўляў, Пацюнаса выслалі ў Беларусь, бо ён спрабаваць сарваць рэалізацыю некаторых праектаў, зьвязаных гандлем газам з Расеяй і транспартаваньнем тавараў чыгункай у Клайпедзкі порт. Як піша газэта «Экстра», найбольшы літоўскі пасярэднік у гандлі газам — гэта Рымантас Стоніс, блізкі сябар Альбінаса Янушкі, сакратара літоўскага МЗС. Як выдаецца газэце, менавіта Янушка дабіўся пераводу Пацюнаса ў Беларусь. «Экстра», аналізуючы дзейнасьць Янушкі, цьвердзіць, што ён — рэзыдэнт расейскіх спэцслужбаў у Літве.

У абарону Янушкі выступілі многія палітыкі й кіраўнікі спэцслужбаў. Яны адзначаюць: Янушка заўжды пасьлядоўна адстойваў празаходні курс Літвы і асаблівую ўвагу надаваў дэмакратызацыі краінаў былога СССР. ВСД дае зразумець: абвінавачаньні на адрас Янушкі — той самы расейскі чорны піяр.

Янушка быў частым госьцем на спатканьнях з удзелам актывістаў беларускага дэмакратычнага руху ў Вільні. Пазьней зь ім быў зьвязаны іншы скандал, у якім мэды так да канца не разабраліся, калі расейскі тэлеканал перадаў запіс быццам бы тэлефоннай размовы між пэўным «Альбінасам», высокім чыноўнікам літоўскага МЗС, і ўплывовым грузінскім палітыкам Таргамадзэ, у якім Аляксандар Мілінкевіч крытыкаваўся за памяркоўнасьць і, фактычна, за нежаданьне арганізоўваць рэвалюцыю і гучалі пагрозы на ягоны адрас. Праўдзівасьць тае размовы літоўскія афіцыйныя асобы абвяргалі, але ў любым разе той эпізод пагаршаў вобраз Вільні як у вачах беларусаў, так і Захаду.

*Laisvas Laikrastis* — гэта тыднёвік, што спэцыялізуецца на журналісцкіх сьледзтвах, асабліва што тычыць карупцыі ў вышэйшых эшалёнах уладаў. Ён не ўнікае публікацыі непацьверджанай інфармацыі ды плётак. Падчас Паксасгейту ў 2003 г. *LL* выступаў у абарону прэзыдэнта, якога парлямэнт адхіліў ад пасады за сувязі з расейскімі спэцслужбамі.

**Мікола Бугай**

# Як, дзе і калі атруцілі Юшчанку?



Адказ ведае Генпракуратура Ўкраіны.

Паведаміў на прэс-канфэрэнцыі ў пятніцу генпракурор Аляксандар Мядведзька.

«Засталося адно: трэба дазнацца, хто выканаў злачынства. Над гэтым мы працуем разам са службай бясьпекі», — сказаў ён. Мядведзька таксама паведаміў, што Генпракуратура зладзіла дадатковую экспэртызу якасьці дыяксіну, выяўленага ў крыві Юшчанкі. Экспэртыза ўстанавіла, што той выраблены альбо ў Расеі, альбо ў ЗША ці Вялікабрытаніі. «Для атручваньня прэзыдэнта выкарыстаны дыяксін высокай ступені чысьціні, сынтэзаваць які можа толькі кваліфікаваны спэцыяліст з выкарыстаньнем сучасных мэтадаў ачысткі», — дадаў Мядведзька.

Паводле яго словаў, Генпракуратура запатрабавала ўзоры дыяксінаў расійскай ці амэрыканскай вытворчасьці і прызначыла судова-хімічную экспэртызу «на прадмет ідэнтыфікацыі дыяксіну, якім быў атручаны Юшчанка».

**АГ**

# Ірына Лазоўская год чакае суду ў СІЗА

Заснавальніца першай у Беларусі крамы *Hugo Boss* працягвае сядзець на Валадарцы. Яе абвінавачваюць у эканамічным махлярстве, ёй пагражае ад 5 да 10 гадоў зьняволеньня. Сьведкам выступае яе былы муж Алесь Суша.

Уладальніцу менскай крамы «Каміла», былую супрацоўніцу газэты «Навіны БНФ» ды радыё «Свабода» Ірыну Лазоўскую затрымалі 18 кастрычніка 2005 году па падазрэньні ў эканамічным махлярстве. Была заведзеная крымінальная справа.

З моманту затрыманьня І.Лазоўская ўтрымліваецца ў СІЗА на вул.Валадарскага. Сваёй віны яна не прызнае. Разам з Ірынай па справе ў якасьці абвінавачанага праходзіць яе брат Аляксандар. Ім закідаюць прысабечваньне маёмасьці, падробку, выраб, выкарыстаньне альбо збыт падробленых дакумэнтаў, штампаў, пячатак, блянкаў. Дзеяньні падазраваных кваліфікуюцца як махлярства, зьдзейсьненае ў асабліва буйных памерах. Акрамя таго, Лазоўскіх вінавацяць ва ўтойваньні падаткаў. Ірыне Лазоўскай, калі суд прызнае яе вінаватай паводле прад'яўленых абвінавачаньнем артыкулаў, пагражае ад 5 да 10 год зьняволеньня.

Паводле вэрсіі сьледзтва, менскія крамы *Hugo Boss* і *Escada* былі пабудаваныя супольна канадзкай, амэрыканскай і фінскай кампаніямі. Канадзкую кампанію праваахоўныя органы палічылі афшорнай, створанай на падстаўных асобаў. Фактычнымі ж уласьнікамі лічаць Лазоўскіх. Дырэктар фінскай кампаніі зьвярнуўся ў праваахоўныя органы з прэтэнзіяй да беларускіх партнэраў, зьвінаваціўшы тых у прысабечваньні супольнай маёмасьці.

Са словаў адваката І.Лазоўскай Ігара Суслава, на сёньняшні момант справа перапыненая — вядзецца судовая экспэртыза, распачатая каля месяца таму. «Магчыма, суд адбудзецца ў бліжэйшы час», — кажа сп.Суслаў.

Выклікае цікавасьць той факт, што адным з галоўных сьведкаў выступае яе былы муж Алесь Суша, зь якім Ірына разышлася чатыры гады таму і падзяліла бізнэс.

На думку сваякоў Лазоўскай, бізнэсоўку маглі папросту падставіць: «Яе вінавацяць, акрамя ўсяго, у крадзяжы маёмасьці сваёй жа крамы. Гэта нагадвае кампутары Марыніча». Ходзяць чуткі, што камусьці са сталічных чыноўнікаў глянулася прэстыжная гандлёвая плошча ў самым цэнтры Менску. На паседжаньнях суду Ірына Лазоўская выглядае блага — змучаная, заплаканая.

Справа Ірыны Лазоўскай выклікае шмат пытаньняў і нараджае неймаверныя чуткі. Так, аб прычыне прыпыненьня суду на час экспэртызы пляткараць, што гэтаму паспрыяла адна ўплывовая ў недалёкім мінулым чыноўніца, якую саму ад турмы ўратаваў яе былы начальнік.

**Сямён Печанко**




**Ірына Лазоўская была адной з самых пасьпяховых бізнэс-вумэн Беларусі.**




WWW.BELBUSINESS.BY

Свабода.
10 гадоў таму
Беларуская восень 96-га.
Канфлікт паміж прэзыдэнтам і ВС, рэфэрэндум і зьмена Канстытуцыі, вулічныя пратэсты і міжнародная ізаляцыя.
Унікальныя запісы з аўдыёархіву.
Хвалі Свабоды. Штодня.
радыё свабода
www.svaboda.org

# Моўная рэформа

Стэнаграма паседжаньня Мовазнаўчага інстытуту.

**Старшыня**: Дарагія таварышы, у гэты стабільны для Бацькаўшчыны час мы паўсталі перад пытаньнем яшчэ большага стабілізаваньня розных аспэктаў нашага жыцьця. Адным з такіх аспэктаў ёсьць мова. 25 жніўня стала відавочна, што яна патрабуе рэформы. Дзеля гэтага найлепшыя спэцыялісты ўжо 25-га па абедзе разгледзелі некалькі варыянтаў магчымай рэформы, якія я вам зараз і выкладу…

Такім чынам, сябры, першы варыянт, прапанаваны камісіяй, прадугледжваў пераход на арабскі альфабэт, ці, як кажуць у нас у народзе, — арабіцу. Прадыктаванае падобнае меркаваньне было ня так бізнэсоўцамі з арабскіх краінаў, як цьвярозым розумам: шырацца кантакты нашай рэспублікі з далёкім замежжам, і якога нашага стратэгічнага партнэра ні вазьмі, амаль усе яны, хоць ты ў лоб страляй, карыстаюцца менавіта такім пісьмом. Да таго ж і продкі нашыя не цураліся пісаць зьлева направа. *(У залі гул галасоў, відаць па ўсім — ухвальны.)*

Аднак пазьней камісія вырашыла адмовіцца ад першага і пачала разгляд другога варыянту. Сутнасьць яго ў наступным: зважаючы на тое, што расейская мова зьяўляецца дзяржаўнай, дзяржава павінна рэфармаваць менавіта яе. І таму ў мэтах збліжэньня моваў прапанавалася пісаць: «калхозьнік», «Масква», «ператрахивать». Аднак пасьля цяжкай працяглай дыскусіі сябры камісіі вырашылі




адысьці ад другога і засяродзіцца на трэцім, апошнім, варыянце, абмеркаваць які мы і прапануем вам сёньня. *(У залі ажыўленьне: нарад хуткай дапамогі толькі што ажывіў Панкрата Нічыпаравіча, самага старога сябра Інстытуту.)*

Гэты варыянт сапраўды зьяўляецца культурнай рэвалюцыяй! Вырашана адмовіцца ад звыклай сыстэмы напісаньня і перайсьці на больш дасканалую — гераглiфічную! Цяпер замест звыклых літараў-словаў будуць пісацца асобныя герогліфы-паняткі. Перавагі гэтага мэтаду агаломшваюць. Першае: відавочная эканомія часу, інтэлектуальных высілкаў, паперы, фарбы, энэрганосьбітаў. Другое: кожнаму слову, якое даўней магло мець некалькі сэнсаў ці адценьняў, даецца стабільны панятак.

Вось некалькі прыкладаў. Для слова «Прэзыдэнт» прапануецца адмысловы герогліф, сэнс якога літаральна азначае: «Прэзыдэнт — самы мудры і добры». Улічваючы тое, што гэта герогліф, і яго, як аказалася, нельга пісаць зь вялікай літары, прапанавана ў кожным тэксьце вылучаць яго чырвоным колерам… Для слова «суд», калі гэта тычыць Беларусі, прапануецца герогліф, які даслоўна азначае «праведны суд». Для слова «міліцыя» — «міліцыя, якая робіць правільна». А, напрыклад, для апазыцыі *(нешта малюе на аркушы і паказвае ў залю)* — герогліф у выглядзе вось такой сьняжынкі, які азначае «адмарозкі».

Вымаўленьне, альбо папросту кажучы — артаэпія, цяпер ня будзе мець вялікай важнасьці. Між іншым, мы вырашаем праблему дзьвюхмоўя! Цяпер ня важна, хто на якой мове гаворыць і як вымаўляе, — нас зьяднаюць герогліфы! Можна будзе казаць і «Президент — самый мудрый и добрый, і «Прэзыдэнт — самы мудры й добры», і «Празідзент — самы мудры і добры»… Самае галоўнае, што кожны з гэтых варыянтаў будзе абсалютна правільны!

Такі падыход значна стабілізуе і так стабільную грамадзка-палітычную сытуацыю. Каб унікнуць непажаданых тэндэнцыяў у нашым грамадзтве, уся друкаваная прадукцыя будзе мець права выходзіць толькі новым пісьмом.

**Голас з залі**: Дык ёсьць жа Інтэрнэт, ім жа якраз гэныя, ну, сьнегавікі… ці як іх… адмарозкі… і карыстаюцца!

**Старшыня**: Адказ просты: кітайскія фільтры. Яны фільтруюць Інтэрнэт, і любы непажаданы сайт аўтаматычна перакладаюць на нашыя герогліфы. А газэты мы апазыцыйныя закрываць ня будзем — навошта? Што яны цяпер пішуць? *(Дастае нейкую газэту, чытае.)* «Міліцыя разагнала пікет апазыцыянэраў, якія пратэставалі супраць палітыкі прэзыдэнта. Дзесяць апазыцыянэраў былі асуджаныя Цэнтральным судом…» Як гэта будзе чытацца па-новаму, герогліфамі? «Міліцыя, якая робіць слушна, разагнала пікет адмарозкаў, якія пратэставалі супраць палітыкі Прэзыдэнта — самага мудрага й добрага. Дзесяць адмарозкаў асуджаныя праведным Цэнтральным судом…» Прыгожа! Хто ж іх цяпер забараняць будзе? Хай пішуць.

**Запісаў стэнаграму, то бок напісаў гэтую гумарэску, Аляксей Шэін**

# Украіна працягвае ўкраінізацыю

З 1 верасьня ўкраінскія кінатэатры паказваюць 20% фільмаў, дубляваных па-ўкраінску. Налета іх стане 70%. Пракатчыкі задаволеныя.

Аксамітны сэзон у Крыме сёлета ня лашчыць. За тыдзень у Ялце патрапіў выкупацца толькі некалькі разоў — мора ўпарта трымае тэмпэратуру 10—13 градусаў. Тэмпэратура паветра тым часам лагодная — 20—25°С. Падсмажыўшы ранкам сябе на сонцы, апоўдні даводзіцца цягацца ў горадзе й ваколіцах ды шукаць сабе занятак — зрэшты, забіць вольны час і грошы лёгка. Турыстычны бізнэс тут разьвіваюць не дзяржаўна-плянава, як у нас, а ён ствараецца сам, пад уплывам рынку.

Напачатку адведаў магілу Багдановіча, дзе быў прыемна ўражаны новым помнікам Максіму. Потым, прагледзеўшы ў мясцовым музэі ўсе тры залі (адна прысьвечаная рымлянам, другая — татарам, а трэцяя — Міцкевічу і ягоным крымскім санэтам), я пацягнуўся ў кіно.




Тутака і пачалося самае цікавае. Выявілася, што ў кінатэатрах круцяць найноўшыя галівудзкія фільмы ва ўкраінскім перакладзе. Зрэшты, дзівіць гэта толькі нас, беларусаў.

Згодна з пастановаю ўкраінскага ўраду, з 1 верасьня кінатэатры мусяць паказваць 20% фільмаў, дубляваных па-ўкраінску. У наступным годзе з 1 чэрвеня гэтая лічба мусіць узрасьці да 50%, а напрыканцы году дасягнуць 70%.

Першыя фільмы, «Тачкі» ды «Піраты Карыбскага мора», паступілі ў пракат, дубляваныя і па-ўкраінску і па-расейску. Зборы паказалі, што на ўкраінскія вэрсіі фільмаў прыйшло на 15% болей гледачоў, чым на расейскія. Уладальнікі кінаіндустрыі ў захапленьні ад новага звычаю — на стужкі прыцягнулі новага гледача.

Задаволеныя і ўкраінскія акторы ды рэжысэры — зьяўляюцца новыя магчымасьці й праца. Украінскіх фільмаў здымаюць ня так і шмат, а тут пачалі праводзіць нават кастынгі на выбар актораў. Зрэшты, многа ўкраінскіх каналаў (гэта пацьвердзяць шчасьлівыя ўладальнікі спадарожнікавых прымачоў) даўно ўжо круцяць мультфільмы і фільмы з украінскім перакладам. У скрайнім выпадку ўкраінскі пераклад расейскіх тэлесэрыялаў прысутнічае ў падрадкоўніку.

Новы ўрад Януковіча ніяк не абмежаваў меры, накіраваныя на падтрымку ўкраінскае мовы, у тым ліку і ў кінасфэры.

**Руслан Равяка, Ялта**

# Мэксыка раскалолася на дзьве

Прэзыдэнтам абвешчаны Фэліпэ Кальдэрон, але Мануэль Абрадор таксама рыхтуецца абвесьціць сябе кіраўніком дзяржавы. Чым тое скончыцца, немаведама.






Вынік самых напружаных выбараў у гісторыі краіны выбарчы трыбунал абвесьціў праз два месяцы пасьля галасаваньня. Насуперак закідам апазыцыі, ён пацьвердзіў: падчас галасаваньня 2 ліпеня і падліку галасоў не было значных парушэньняў, ня кажучы пра арганізаванае фальшаваньне.

Кансэрватар Фэліпэ Кальдэрон **(на фота зьлева)** з Партыі нацыянальнага дзеяньня атрымаў мінімальную перамогу над кандыдатам ад левых сілаў Андрэсам Мануэлем Лопэсам Абрадорам. У сьнежні Кальдэрон пачне кіраваць дзяржавай.

Мэксыканскае заканадаўства не прадугледжвае далейшай касацыйнай інстанцыі. Перамогу Кальдэрона прызналі ўсе палітычныя сілы, апроч Рэвалюцыйна-дэмакратычнай партыі (PRD).

Віншаваньні пачалі прыходзіць і ад замежных урадаў. Аднак выглядае, што спакою ў Мэксыцы ня будзе яшчэ доўга.

### Фашысты і злодзеі

Мэхіка, дзень абвяшчэньня рашэньня трыбуналу. 53-гадовы Абрадор, былы бурмістар сталіцы, выступае на пляцы Канстытуцыі паміж катэдрай і былым прэзыдэнцкім палацам. «Ты не адзін!», «Злодзеі!» крычаць людзі, а Абрадор дае прыкурыць «фашыстоўскаму рэжыму».

— Далоў дзяржаўныя інстытуты! — крычыць ён і паведамляе, што 16 верасьня склікаюцца народны Канстытуцыйны сход і Дэмакратычная канвэнцыя, якія створаць новы ўрад.

### Мір — гэта вайна

Судзьдзі выбарчага трыбуналу праігнаравалі заклік «не кіравацца прававымі аргумэнтамі, а прыслухоўвацца да голасу народу». Радыкальны рэфарматар-рэвалюцыянэр Абрадор стварае вэрбальны сьвет, у якім словы рэтушуюць праўду.

Канвэнцыя 16 верасьня будзе відавочнаю спробаю ўзурпацыі ўлады. Ці пададуцца дзяржаўныя інстытуты «рэвалюцыйнай дэмакратыі» Абрадора?

Пакуль няясна, якім кампрамісам можа вырашыцца гэтая сытуацыя.

**ВД, паводле gazeta.pl**

# Гары яно гарам...

*«Я, канечне, лепей за вас разьбіраюся ў тэлебачаньні».*
**Аляксандар Лукашэнка**

Лукашэнка прыняў з дакладамі міністра культуры і начальніка Галоўнага ідэалягічнага ўпраўленьня Адміністрацыі. Камэнтуе **Гары Куманецкі.**

Здавалася б, ну чым яшчэ можна зьдзівіць беларусаў? То нечуваным клопатам пра родную мову, то рэкорднымі ўраджаямі, то прарывамі ва ўсясьветнай палітыцы беларускія ўлады ўражваюць нас штодзень. Але раптам, паміж летам і восеньню ў Лукашэнкі зьявіўся новы клопат — культура! Насамрэч, яна спрадвечная падчарка ў нашай айчыне: нецікавыя музэі, якім дзесяцігодзьдзямі не выдаткоўвалі сродкаў на набыцьцё і рэстаўрацыю экспанатаў, тысячы напаўразбураных помнікаў старасьвеччыны, панявечаныя паркі. Гады палітычнага змаганьня зьвялі адных творцаў у магілу, іншых — сагналі ў эміграцыю. Палац мастацтва і Палац культуры прафсаюзаў зарабляюць камэрцыйнымі выставамі й здачаю плошчаў у арэнду. Посьпехі ў эстрадзе вызначаюцца тым месцам, што заняла ў Эўропе Смолава. А ў кінэматографе не вызначаюцца наагул, бо няма болей беларускага кіно як зьявы. Пасьля таго, як Тэатар опэры і балету быў пастаўлены на даўгабудную рэканструкцыю, у краіне ня стала й балету. Ну як дзяўчынка-беларусачка захоча стаць балерынаю, калі ня тое што жыўцом, але й на родным БТ балету ня бачыла ўжо цэлае пакаленьне? Культура-жабрачка...

Але 7 верасьня Лукашэнка захацеў прыняць з дакладамі міністра культуры Ўладзімера Мацьвейчука і памочніка прэзыдэнта — начальніка Галоўнага ідэалягічнага ўпраўленьня Адміністрацыі Алега Праляскоўскага.

Усачыць ходу думак правадыра даволі складана. Нават былому зэнітчыку з былым дырэктарам ПТВ. Прынамсі, Праляскоўскі пасьля сустрэчы здолеў сказаць у тэлеаб’ектыў тузін малазьвязаных словаў. Вой, як цяжка ім вымавіць слова *культура*! Дый аналітыкам гэтае знамянальнае падзеі цяжкавата: у адных камэнтарах і артыкулах гаворыцца пра «сфэру культуры», у іншых пра «сацыяльную сфэру».

«Вонкава мы праводзім фэсты, канцэрты, іншыя мерапрыемствы, пры тым на самым высокім узроўні. Але гэтага не дастаткова», — заўважыў Лукашэнка. То бок, вонкава праводзім на высокім узроўні, а тамака, у сярэдзіне... Ну, вядома ж, недастаткова. Пэўна, мала праводзім? Вой, не!

Фэстаў у нас замнога! «Іх праводзіцца надта шмат, а разьвіваць трэба толькі «Славянскі базар». Колькасьць фэстаў і конкурсаў будзе скарочана! Ну як не паспачуваць спадару Фінбергу, які толькі пахваліўся, што разгарнуў фэстывальную дзейнасьць па ўсёй краіне...

Напэўна, «недастаткова» — гэта пра грошы, што дзяржава выдае на культуру, традыцыйна мала, паводле астаткавага прынцыпу й зазвычай скрайне нераўнастайна. Вось таму ў нас і няма канкурэнтаздольнай прадукцыі ў культуры. Не. Мелася наўвеце штосьці зусім іншае. «Грошы дзяржава на кінавытворчасьць выдаткоўвае спраўна, прытым з кожным годам сумы растуць. А істотных вынікаў няма. Таму кінастудыю «Беларусьфільм» трэба ўзмацніць у кадравым сэнсе».

Але сумы растуць і на цэньніках у крамах. І значна шпарчэй, чым з году ў год. І адкуль у нашай краіне яшчэ могуць быць кадры для кінавытворчасьці? Хіба ва ўсходняй Магілёўшчыне... Кадры для Лукашэнкі — наагул балючая тэма.

Выпускнікі творчых ВНУ ня едуць па абавязковым разьмеркаваньні. А ў аграгарадках павінны ж разьвівацца клюбы, бібліятэкі, школы мастацтваў і музычныя школы. «Яны павінны быць сапраўднымі патрыётамі, любіць сваю краіну і свой народ», — запатрабаваў Лукашэнка.

А рашэньні пра ўдзел беларускіх артыстаў у замежных мерапрыемствах (гэта хіба пра «Эўрабачаньне»...) трэба прымаць больш грунтоўна. Хто б сумняваўся... Але... На думку Лукашэнкі, творчыя людзі надта шмат гавораць пра свае творчыя пляны, а не займаюцца канкрэтнай працай. Выснова: «Гэтак быць не павінна. Пара гарэць, а ня тлець...» Вось ужо ж пэўна ніхто не чакаў, што Лукашэнка працытуе паўзабытага расейскага паэта-барда Юр’я Кіма, які ў сваю чаргу зрабіў парыфразу зь Цьвятаевай.

Гарэць загадана! Гарэць актору Гасьцюхіну, сьпеваку Ярмоленку, мастаку Кузьмічу, рэжысэру Азаронку ды іншым славутым дзеячам.

Ну, і нарэшце, раскрыты сэнс пабудовы Нацыянальнай бібліятэкі. Паводле Лукашэнкі, «фонды галоўнай бібліятэкі краіны трэба папаўняць сацыяльна значнай літаратурай, галоўным чынам, айчыннае вытворчасьці». Гэта ўжо камень у лоб літаратарам: Чаргінцу, Аўруціну, Скобелеву ды іншым палымяным майстрам пяра. Будуць запаўняць цяпер «брыльянт». Зрэшты, можна шматкроць перавыдаць «Прыгоды Гарбузіка і Бябешкі»...

Але на вялікі плён свайго гарэньня «за Беларусь!» лічыць ужо ня мусяць. «Лішніх растратаў і ўкладаньняў быць не павінна. Усе структуры павінны быць дзейснымі», — падкрэсьліў галоўны спэцыяліст у галіне культуры.

«Пэрыяд адаптацыі скончыўся, сёньня я чакаю канкрэтных дзеяньняў», — зазначыў Лукашэнка.

Калі паспрабаваць усё ж перакласьці на людзкую мову, выходзіць, што правадыр пакрыўджаны на дзеячаў культуры, якіх ён карміў з сваіх вялікіх далоняў. Яго балюча закранае поўная пустапарожнасьць афіцыёзных функцыянэраў у галіне культуры, то бок, па-іхнаму — «у сацыяльнай сфэры». Апроч як аплёўваць беларушчыну й зьневажаць іншых творцаў бальшыня наагул ні на што ня здатная. Ну, яшчэ гаварыць па-расейску. Гэта стала цалкам яўна за апошнія дзесяць гадоў «адаптацыі» нашае культуры пад аднаго чалавека. Зь іх, са сваіх падпявалаў, і будзе Лукашэнка спаганяць за марнаваньне сродкаў і бязьмежны палітычны крэдыт. Пара гарэць, а ня тлець! Гарэць усё будзе гарам.

Ілюзіяў, што хоць што-небудзь перападзе й на нармальныя, вартыя праекты, няма. Хоць мы ўсе разам і плацім падаткі, але ў праве голасу нам адмаўляюць, як раней. І па-ранейшаму сама будзе выжываць беларуская Культура. Яна ўмее выжываць, як чароўнага харавства краскі між пустазельля на нішчымных пустках.

# Сьвядомасьць і біцьцё

Чаму беларускія прамыслоўцыу адрозьненьне ад украінскіх, не даводзяць вышэйшаму кіраўніцтву выгады ў эўрапейскую эканоміку. Піша **Віталь Тарас**.

## Да каго пытаньне?

У сваім патрабаваньні «быць рэалістамі», зьвернутым да беларускіх журналістаў, палітолягаў і палітыкаў, Андрэй Дынько («НН», №33) падкрэсьлівае ролю эканамічнага фактару ў дасягненьні Незалежнасьці. З тым, што апазыцыя, дый увогуле нацыянальна сьведамая інтэлігенцыя зусім мала надае ўвагі гэтаму фактару, можна пагадзіцца. Але папрок, мне здаецца, скіраваны не зусім па тым адрасе.

У Акадэміі навук Беларусі, ва ўрадзе, у адміністрацыі прэзыдэнта, сярод дарадцаў і памочнікаў хапае эканамістаў. Чаму ж ніхто зь іх ня зьверне увагі кіраўніцтва на той факт, што будаваць эканамічную стратэгію на танным расейскім газе, мякка кажучы, небясьпечна? Зразумела, атрымліваць газ з Расеі па цяперашніх цэнах выгадна ня толькі прадпрымальнікам, але й звычайным грамадзянам. Вядома, можна й трэба зарабляць грошы на каньюнктуры — у тым ліку палітычнай. Але ясна, што гэтая каньюнктура ня можа захоўвацца бясконца, бо магутнасьць Вялікай Энэргетычнай Дзяржавы залежыць ад цэнаў на энэрганосьбіты, якія зьмяняюцца цыклічна. Таксама і прэзыдэнцкі тэрмін аднаго чалавека можна працягваць доўга, але не бясконца.

Расейскі палітоляг Андрэй Суздальцаў, дэпартаваны зь Беларусі, у сваім артыкуле «Газавая містыка», апублікаваным у Інтэрнэце, апэруе лічбамі дзяржаўнае статыстыкі. Зь іх вынікае, што прамысловасьць і насельніцтва Беларусі проста ня мае моцы спажываць столькі прыроднага газу, колькі яна зараз імпартуе з Расеі. Адсюль можна зрабіць выснову, што вялікая частка гэтага газу кудысьці зьнікае і што беларускі «эканамічны цуд» пабудаваны менавіта на гэтай «містыцы». Ня будзе таннага расейскага газу — ня будзе эканамічнага росту, лічыць палітоляг.

Нешта ня чуў я гнеўных абвяржэньняў гэтага «паклёпу» з боку афіцыйных асобаў і эканамістаў. Іх голасу ўвогуле не чуваць апошнім часам. А калі яны й гавораць, дык толькі аб тым самым «эканамічным росьце», дасягнутым дзякуючы мудраму кіраўніцтву. Чаму, у адрозьненьне ад украінскіх прадпрымальнікаў, ніхто не даводзіць вышэйшаму кіраўніцтву выгоды мажлівай інтэграцыі Беларусі ў эўрапейскую эканоміку?

## Прыклад «фарбэніндустры»

Можа быць, у Беларусі ўвогуле няма сур'ёзных эканамістаў? Ці яны пішуць свае эканамічныя трактаты ў стол? Абодва дапушчэньні выглядаюць абсурдна.

Некалі за савецкім часам нарадзілася фраза: «Біцьцё вызначае сьвядомасьць». (Замест «Быцьцё

> Прэзыдэнцкі тэрмін аднаго чалавека можна працягваць доўга, але не бясконца.

вызначае сьвядомасьць»). Яе відавочна прыдумаў нейкі філёзаф у сталінскім ГУЛАГУ, дзе марксісцкая тэорыя вызваленьня пралетарыяту ад аковаў павяралася практыкай рабскае працы. Між іншым, у сталінскіх «шаражках» працавалі і філёзафы, і канструктары, і эканамісты. (Хто глядзеў экранізацыю салжаніцынскага «Ў коле першым» на БТ, можа ўявіць сабе, як гэта было.) І дзякуючы рабскай працы, у тым ліку навукоўцаў, у космас запускаліся караблі, а атамная моц савецкае дзяржавы расла з кожным днём.

Гэта быў сталінскі сацыялізм. А быў і нямецкі сацыялізм. І вось вам іншы прыклад. У Нямеччыне пры Гітлеру існаваў рынак. Прадпрымальнікаў (за выняткам тых, хто меў няшчасьце нарадзіцца ў Нямеччыне габрэем) ніхто не чапаў і не абмяжоўваў прыватнай ініцыятывы. Некаторыя фірмы, напрыклад, «АГ Фарбэніндустры», зарабілі тады актываў на сто гадоў наперад. Праўда, цяпер фірме даводзіцца выплачваць шматмільённыя кампэнсацыі ахвярам гітлераўскага рэжыму. Але што зробіш — не маглі гэтага прадбачыць тагачасныя эканамісты.

Як жа вольны рынак мог дапусьціць, што побач з цывілізаванымі вытворчымі стасункамі існавалі лягеры сьмерці, дзе праца зьняволеных была, мякка кажучы, неэфэктыўная? (Толькі ня трэба казаць, што практычныя немцы, нібыта, зараблялі на валасах і скуры забітых зьняволеных. Калі дазволіць сабе цынічныя развагі наконт гэтага, то прыбытак ад гэтай бесчалавечнай індустрыі быў нулявы. Яе сэнс быў менавіта ў яе бесчалавечнасьці.) Адказ просты: рынак тут ні пры чым. Эканоміка Нямеччыны, як і усе бакі жыцьця нямецкага народу, залежалі тады ад ідэалёгіі. А не наадварот.

Падобным чынам існавала савецкая, абсурдная эканоміка, у якой усё было пастаўлена дагары нагамі і якая не павінна была існаваць паводле аб'ектыўных законаў. Як выявілася — магла. Існуе й цяпер, праўда, у крыху адаптаваным выглядзе, у Беларусі. А што, хіба не было разумных, кемлівых дырэктараў, старшыняў калгасаў у Савецкім Саюзе? Былі, але нярэдка іх саджалі за краты, каб не былі занадта кемлівыя. Цяпер ужо так ня робяць?

## Сындром малпаў

На пачатку 1990-х гадоў у Менск прыяжджаў Лешэк Бальцэровіч — легендарны польскі эканаміст, цяперашні кіраўнік Нацбанку Польшчы. Мне давялося быць на адной зь яго лекцыяў, дзе ён гаварыў простыя рэчы, якія тады здаваліся рэвалюцыйнымі. Ён казаў пра тое, што чалавецтва пакуль не прыдумала нічога лепшага за рынкавыя стасункі. Кепскія яны ці добрыя, але яны эфэктыўна працуюць у любых умовах. У Амэрыцы, у Эўропе, у Паўднёвай Карэі, Малайзіі, Кітаі — яны заўсёды



спрацоўваюць і вядуць, хай не адразу, да росту прадпрымальніцкай і ўвогуле любой актыўнасьці ў грамадзтве, а гэта ў сваю чаргу вядзе да росту дабрабыту ўсяго насельніцтва. А калі дзяржава ўмешваецца ў эканамічныя працэсы, гэта хоць і можа часова прывесьці да ўяўнага паляпшэньня, але насамрэч толькі запавольвае эканамічны прагрэс. Таму, на думку прафэсара Бальцэровіча, няма кепскіх ці адсталых народаў, ёсьць неэфэктыўнае кіраўніцтва. А рынак, падкрэсьліваў навуковец, разьвязвае ініцыятыву чалавека, і тады ён можа праяўляць свае лепшыя якасьці й рысы...

Ці мог тады думаць Бальцэровіч, што праз дзесяць гадоў у Польшчы зь яе разьвітымі рынкавымі стасункамі, зь вялікай клясай прадпрымальнікаў, у Польшчы, якая ўступіць у Эўразьвяз з усімі яго палітычнымі і рынкавымі структурамі, будзе дадзеная воля… антысэмітызму. Што на каталіцкім радыё будуць гучаць выказваньні аб тым, што габрэі «спэкулююць на тэме Галякосту», што яны перабольшваюць трагедыю Ядвабнага (дзе палякі ўдзельнічалі ў зьнішчэньні сваіх суседзяў-габрэяў ) і пагрому ў Кельцах. Што ў Польшчы на парлямэнцкім узроўні будзе разьвязаная кампанія дыскрэдытацыі заснавальніка легендарнай КОС-КОР нябожчыка Яцка Кураня, таксама габрэя?

Усё гэта не перакрэсьлівае дасягненьняў Польшчы ў пабудове дэмакратыі й заслугаў польскага народу ў стварэньні сваёй мадэлі эканомікі, якая дынамічна разьвіваецца.

Я проста хачу сказаць, што няма беспасярэдняй сувязі паміж аб’ектыўнымі законамі рынку, эканамічнымі інтарэсамі і чалавечай маральлю. Эканамічны і навуковы прагрэс ёсьць. Але гаварыць пра прагрэс адносна чалавечай маралі не выпадае.

Таму я ў сваім артыкуле пра Незалежнасьць казаў аб маральнай адказнасьці інтэлігенцыі, а не інтэлектуальнай. Але гаварыў, гатовы прызнаць, абсалютна дарэмна. Бо трэба казаць не пра адказнасьць нейкай групы ці супольнасьці людзей, якая жыве паводле аб’ектыўных грамадзкіх законаў, а толькі і выключна пра сваю асабістую адказнасьць перад самім сабой. І эканоміка тут ні пры чым.

Што ж датычыць адказу на пытаньне, чаму беларускія таленавітыя эканамісты дагэтуль не абвесьцілі аб сабе гучна, тут ёсьць навуковае тлумачэньне. Толькі палягае яно не ў галіне эканомікі ці сацыялёгіі, а — у біялёгіі. Усім вядомыя экспэрымэнты з малпамі і бананамі. Дык вось, падчас аднаго з такіх экспэрымэнтаў да падлогі клеткі быў падведзены электрычны ток. Як толькі адна з малпаў падыходзіла да слупа, на які быў падвешаны банан, улучалі электрычнасьць, і усе малпы (заўважце, усе!) атрымлівалі даволі адчувальны удар токам. Дык вось, калі праз некалькі гадзін у клетку запусьцілі малпу-навічка, і яна, натуральна, адразу скіравалася да банана, усе малпы разам накінуліся на яе й пачалі біць. Тая малпа не магла зразумець — за што? Але ж астатнія гэта цудоўна ведалі!

Не пасьпелі мы даведацца, якія зьмены нас чакаюць у беларускай артаграфіі, як некаторыя філёлягі пачалі заклікаць нас загадзя зьмірыцца зь любымі зьменамі. Зразумела, дзеля таго, каб захаваць беларускую мову і беларускую інтэлігенцыю, у тым ліку філёлягаў. А тых, хто будзе пратэставаць, ці працягваць карыстацца клясычным правапісам, застаецца біць. Фізіялёгія, што зь ёй зробіш?



WWW.CORBIS.COM

# Хто народны?

Тэма Народнага пісьменьніка, якую ўзьняла была «Наша Ніва», выклікала жывую рэакцыю чытачоў і выйшла па-за рамкі газэты.

Надоечы на хвалях радыё «Свабода» прагучэла праграма на гэтую тэму з удзелам Адама Глёбуса, Яўгена Будзінаса ды Валянціна Акудовіча. Адгукнулася матэрыялам «Эўрапейскае радыё». У газэту са сваімі прапановамі пішуць нашыя чытачы і беларускія літаратары. Удзельнікі дыскусіі ня толькі называюць пэўныя кандыдатуры, але й выказваюцца, ці патрэбен інстытут Народнага пісьменьніка сёньняшняй Беларусі ўвогуле.

### Народ пра Народнага

Наш чытач Ягор Марціновіч пагаджаецца з актуальнасьцю тэмы, аднак лічыць што Народным пісьменьнікам ня можа быць творца, маладзейшы за 60 гадоў. Пры гэтым Народны мусіць быць менавіта пісьменьнікам: «Зянон шмат зрабіў для беларускай Незалежнасьці. Але вельмі мала для беларускай літаратуры. І гэта нармальна! Бо Пазьняк — не пісьменьнік... Арлоў? Канечне, гэта вядомы чалавек, грамадзкі дзеяч, гісторык. Але не Народны пісьменьнік, бо не эпоха ў беларускай прозе.

Пра Васіля Сёмуху... Народны перакладчык — гэта б гучэла. Але такога званьня ж яшчэ няма». Крытэрамі адбору, на думку сп.Марціновіча, ёсьць вядомасьць у народзе («вядомасьць менавіта як літаратара»), а таксама прызнаньне літаратурнага таленту і наяўнасьць літаратурнай спадчыны. Паводле гэтых крытэраў Ягор Марціновіч аддае свой голас на карысьць Івана Пташнікава.

Уладзіслаў Хархардзін зь Верхнядзьвінску ня згодны з тым, што ў Беларусі няма з каго выбраць Народнага пісьменьніка. Больш за тое, ён прапануе самім чытачам «вызначыць Народных пісьменьнікаў, на пачатак ня меней як 5—10 пісьменьнікаў і паэтаў, а потым кожны год вызначаць аднаго-двух у дадатак да тых, каго вызначалі раней». Ад сябе ён прапануе сярод пісьменьнікаў — Уладзімера Арлова і Вольгу Іпатаву, сярод паэтаў — Генадзя Бураўкіна.

Юры Мянькоў, настаўнік зь вёскі Баравая Буда, ня бачыць сэнсу даваць званьні пісьменьнікам і паэтам, як гэта рабілі ў савецкія часы. Прычына — «гэтае званьне прысуджалі ў імпэрскія часы з мэтай кантраляваць пісьменьніцкае асяродзьдзе». «Сапраўдным Народным жа пісьменьнікам можа быць толькі той, хто ня толькі добра можа пісаць свае творы на роднай беларускай мове, але ў першую чаргу ён павінен змагацца за адраджэньне беларускай культуры, гісторыі, павінен быць разам з абуджаным народам на плящах, бараніць волю і свабоду. Ён павінен ня толькі штодзень размаўляць і думаць па-беларуску, але і адчуваць настолькі беларускае слова, як адчувае сапраўдны Беларус», — піша сп.Мянькоў.

### Пісьменьнікі пра Народнага

Калі творца годна рэпрэзэнтуе літаратуру свайго народу як мастак слова і грамадзянін, то ня грэх яго ўшанаваць адпаведным чынам. Так лічыць літаратар і навуковец Арсень Ліс. І ня бачыць нічога кепскага ў тым, што гэтая традыцыя ў нас прыжылася. Ад сябе ён прапануе Івана Пташнікава зь яго адчуваньнем прыроды і чалавека, Віктара Казька — арыгінальнага празаіка зь міталягічнымі элемэнтамі ў суворым рэалізьме. А беларускую паэзію, на думку сп.Ліса, годна прэзэнтуюць Генадзь Бураўкін, Васіль Зуёнак, Анатоль Вярцінскі, Янка Сіпакоў, Алесь Разанаў, Сяргей Законьнікаў, Уладзімер Някляеў. Упершыню ў сьпісе прэтэндэнтаў, дзякуючы А.Лісу, зьявіліся беларускія драматургі Аляксей Дудараў ды Алесь Петрашкевіч. А прысвоіць высокае званьне ад імя народу, мяркуе літаратар, павінна ў поўным сэнсе гэтага слова аўтарытэтная ўстанова ці Асоба.

### «Свабода» пра Народнага

У праграме Юр'я Дракахруста на тэму Народнага разважалі пісьменьнікі і філёзафы. Сярод іх быў і той, каго ў часе галасаваньня таксама прапаноўвалі на гэтае званьне.

Адам Глёбус цешыцца, што ў Беларусі больш не ўзнагароджваюць творцаў савецкімі званьнямі: «І дзякаваць Богу, што цяпер не даюць гэтага званьня. Я лічыў яго заўсёды крышку абразьлівым, бо пісьменьнікі, якія пісалі па-расейску і былі імпэрскімі пісьменьнікамі — імпэрыі СССР, не атрымлівалі званьня Народнага пісьменьніка Расеі. А гэта такое грэблівае стаўленьне да літаратараў з ускраін… Калі казаць пра народных пісьменьнікаў Беларусі больш глыбока, то іх у нас два — Колас і Купала. Больш і ня трэба».

Яўген Будзінас лічыць, што творчы чалавек, каб пазьбегнуць прыгнёту, мусіць пазьбягаць любой улады над сабою: «Усё ж хто народны, мусіў бы вызначаць народ... Іншая справа, што гэтае званьне — як і іншыя савецкія званьні — «заслужаны», «ганаровы» і г.д. было сымбалем уладнага прызнаньня. Калі вы сталі ў позу адносна ўлады, то недарэчна прэтэндаваць на тое, што ўлада пачне вам выказваць афіцыйнае прызнаньне. А што тычыцца тых, хто стаў у іншую позу, то для афіцыйнага прызнаньня патрэбнае яшчэ і майстэрства і талент. Нешта я такіх ня бачу сярод тых, хто пайшоў цяпер у нагу з уладай.

А наагул мне здаецца, што ня справа пісьменьніка пра гэта непакоіцца. Паўтаруся, пісьменьнік павінен быць як мага далей ад любой улады, бо любая ўлада прыгнятае чалавека».

Любімы Ю.Дракахрустам Валянцін Акудовіч уважае апытаньне на тэму Народных пісьменьнікаў вартым «СБ», але не «НН», а саму тэму архаічнай. «Статус На-

роднага пісьменьніка, як вядома, прыдумалі камуністы. Тады, зрэшты, ён быў з розных прычынаў дарэчы. Папершае, камуністычная ідэалёгія выдавала сябе за ідэалёгію народу, і пісьменьнік вызнаваўся яе галоўным ідэолягам. Па-другое, на тую пару кніга яшчэ сапраўды досыць шырока чыталася, скажам, раманы Шамякіна выдаваліся мільённымі накладамі.

А што мы маем цяпер? Перадусім заўважым, што беларуская літаратура сама па сабе ня толькі не народная, а проста маргінальная зьява. І нават найбольш папулярных яе аўтараў, скажам, Адама Глёбуса, чытае некалькі тысячаў чалавек... Карацей, давайце ня будзем ганьбіцца перад людзьмі, абмяркоўваючы архаічныя ідэі, якія належаць тым эпохам, зь якімі мы імкнемся як найхутчэй разьвітацца», — рэзюмуе філёзаф, вядомы сваімі правакацыйнымі выказваньнямі.

**Сямён Печанко**

# Беларускі Калегіюм

Як і штогод, запрашае слухачоў Беларускі Калегіюм. Сярод кірункаў яго вечаровых заняткаў — журналістыка, найноўшая гісторыя, філязофія/літаратура. Запрашаюцца студэнты старэйшых курсаў (як вынятак — добра падрыхтаваныя студэнты малодшых курсаў), асобы з вышэйшай адукацыяй. Запіс на сумоўе адбываецца да 27 верасьня.

Абавязковая ўмова запрашэньня на сумоўе (за выключэньнем спэцыялізацыі «Найноўшая гісторыя») — падача да пазначанай вышэй даты аднаго альбо некалькіх уласных тэкстаў агульным памерам ня меней за 5 тыс. знакаў. Тэкстамі лічацца як друкаваныя, гэтак і недрукаваныя матэрыялы (навуковыя, журналісцкія, літаратурныя тэксты, эсэ на вольна абраную тэму і г.д.). Аплікanты мусяць запоўніць уступную анкету.

Асаблівасьцю навучальных курсаў БК ёсьць тое, што яны не дублююць існуючых праграмаў дзяржаўных і недзяржаўных унівэрсытэтаў і арыентаваныя на выкладаньне найноўшых фрагмэнтаў сучаснай веды.

Сэртыфікат Калегіюму не замяняе дыплёму аб вышэйшай адукацыі. Навучаньне бясплатнае.

Даведкі пра запіс на сумоўе і дадатковую інфармацыю арганізатары даюць праз т.: (017) 267 66 278; (029) 705 46 66 з 14.00 да 18.00 (акрамя суботы і нядзелі), ці праз kalehium@gmail.com, або на сайце http://bk.baj.ru (спасылка Навучаньне ў БК (2006–2007).

**Вось што мы маем на 13 верасьня ў рэйтынгу:**

Генадзь Бураўкін — 17;

Алесь Разанаў — 17;

Уладзімер Арлоў — 14;

Ніхто — 12

Вольга Іпатава — 7;

Іван Пташнікаў — 7;

Віктар Казько — 6;

Уладзімер Някляеў — 6;

Сяргей Законьнікаў — 4;

Сьвятлана Алексіевіч, Анатоль Вярцінскі, Андрэй Федарэнка — 3;

Адам Глёбус, Валянцін Тарас, Васіль Сёмуха, Вітаўт Чаропка, Данута Бічэль, Рыгор Барадулін, Юры Станкевіч — па 2;

Алесь Петрашкевіч, Аляксей Дудараў, Андрэй Хадановіч, Васіль Зуёнак, Зянон Пазьняк, Лявон Вольскі, Міхал Анемпадыстаў, Янка Сіпакоў — па 1.

Як бачым, А.Разанава, найпапулярнейшага сярод літаратуразнаўцаў, галасамі чытачоў здагнаў Г.Бураўкін. Набліжаецца да іх У.Арлоў. Імкліва ўзьнялася ў рэйтынгу і Вольга Іпатава.

Мы будзем рыхтаваць гутаркі на гэтую тэму зь пісьменьнікамі і інтэлектуаламі. Ад вас чакаем лістоў: хай выкажацца кожны, тады апытаньне будзе рэпрэзэнтатыўным.

Лістуйце на адрасы:
а/с 537, 220050 Менск;

або электронна

nn@nn.by

Твой голас — голас Свабоды

**СМС** 391 22 24
**Звані** (017) 290 39 52
**Адкрый** www.svaboda.org
**Пішы** п/с 111, Менск, 220005
**Слухай** кароткія хвалі **19**, **31**, **41** м
сярэднія **612** кГц

радыё свабода
www.svaboda.org

# Беларускі народ



**Павал Севярынец — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.**

## ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

«Нічога ня выйдзе — народ у нас такі». Яшчэ год таму мне здавалася, што гэта была каронная фраза тыповага беларускага апазыцыянэра, якая толькі падкрэсьлівае адасобленасьць партыйцаў ад памянёнага вышэй народу. Але ў Сітне мне давялося пачуць дакладна гэткае ж спавяданьне ўжо ад стольких *простых* людзей — работнікаў, пэнсіянэраў, настаўнікаў, майстроў — што зь іх акурат было б скласьці гэты самы праслаўуты народ.

Ёсьць у сучаснага беларуса дзіўная схільнасьць — сьпісваць усё, што мог бы зрабіць сам, на *народ*. Брудна каля хаты — «народ такі». Ніхто не пярэчыць начальству на сходзе (усе лаюць, панізіўшы голас, на перакуры) — «ну, ты ж у курсе, які ў нас народ...». Не размаўляюць па-беларуску: «Да им ничего, кроме колбасы, не надо… Во народ!» Што ж за народ такі? Вядома, землякі.

Асабістая адказнасьць цалкам распушчаецца і патанае ў калектыўнай. Здавалася б, менавіта калектывізм можа стаць найпершай крыніцай такога дэфіцытнага ў нас патрыятызму — але Беларусь даводзіць: наадварот. Дэспатызм заўжды культываваў безаблічную біямасу дзеля патрэбаў імпэрыі. Адсюль — страта ўсьведамленьня сваёй унікальнасьці і як асобы, і як прадстаўніка народу.

Вось Алесь — лепшы вальшчык лесу ў сіценскім сельсавеце, рыбак і паляўнічы, гуляка з сэрцам Тыля Уленшпігеля. Вось Валянціна — улюбёная настаўніца сіценскіх дзяцей, знаўца клясычнае літаратуры й замежных моваў. Алег — малады работнік, жывая энцыклапэдыя з фэнамэнальнай памяцьцю, што шчоўкае крыжаванкі, быццам гарэшкі. Уладзімер — пэнсіянэр, які ўсё жыцьцё праводзіць на сотках, ураблюючы бульбу; заўсёды павітаецца, пачастуе яблыкам, распавядзе пра надвор'е.

Для рэжыму — *насельніцтва*, для апазыцыі — *электарат*. Так, усе яны галасавалі за Лукашэнку ў 1994-м, 2001-м ды 2004-м... да тае пары, пакуль зь імі не пагаварылі па шчырасьці, не далі пачытаць «Нашай Нівы», не падказалі, якія правы яны маюць. І людзі адчулі сябе людзьмі. Больш за тое — беларусамі.

Усю сваю 100-гадовую гісторыю Беларусь паміж калектывісцкім Усходам і індывідуалістычным Захадам фармулявала залатую, сутнасна хрысьціянскую й дэмакратычную раўнавагу *пэрсаналізму*. Пэрсаналізм надае першачарговую ўвагу ня «масе» й не безасабоваму «індывіду», але ўнікальнай асобе й тым супольнасьцям, дзе асоба раскрываецца найпаўней. Сям'і. Царкве. Сябрам. Свойскаму колу супрацоўнікаў. Пэрсаналізм — вяршыня асабістае адказнасьці. Народ у такім разуменьні — мэгаструктура дзеля суцэльнай самарэалізацыі людзей.

«Людзьмі звацца!» — гэта нацыянальны заклік да яднаньня асобаў. «Нелюдзь!» — самы страшны беларускі праклён.

У сёньняшнім Сітне навідавоку бачыш, як людзі губляюць сваю асабістую ўнікальнасьць — за 2—3 гады рэгулярнага ўжываньня «максімкі» крывіцкія абліччы ператвараюцца ў шэраг невыразных, аднолькава сьпітых твараў. Мяшкі пад вачыма. Чырвона-шызы нос. Бессэнсоўны позірк.

Дзяржаве што — яна спансаруе. Адказнасьць за захаваньне беларускай унікальнасьці — на нас з вамі. Раскрыць значэньне кожнай асобы для сваёй краіны, растлумачыць кожнаму

## ХРОНІКА

**5 верасьня**

У Менску прайшла хваля ператрусаў у «віцебскай справе», распачатай у чэрвені. У **Юр'я Ягорава** сканфіскавалі сыстэмны блёк кампутара, дыскі й дыскеты, у **Жанны Ямайкінай** — мабільны тэлефон і кампутар. **Мікіту Абраменку** пасьля ператрусу забралі на допыт.

**6 верасьня**

У Менску на кватэры моладзевага актывіста **Зьмітра Хведарука** адбыўся ператрус, зьвязаны са справай «Маладога фронту». Сам хлопец пасьпеў уцячы, бо кватэра — на першым паверсе. Пазоў на допыт у пракуратуру ў справе «МФ» атрымаў палітвязень **Павал Севярынец**.

Палітвязень **Аляксандар Казулін** адмовіўся ад турэмнай ежы.

Магілёўскія грамадзкі актывісты **Ірына Качарова** і **Сяргей Стральцоў** былі выкліканыя ў міліцыю. Месяц таму яны скардзіліся ў абласную пракуратуру на незаконнае затрыманьне 27 ліпеня. Цяпер міліцыянты цікавіліся, чаму менавіта ў той дзень маладыя людзі вырашылі апрануць у горад саколкі з надпісам «Надакучыў».

Суд у Віцебску аштрафаваў недзяржаўную газэту **«Витебский курьер»** на 1,5 млн руб., а журналіста **Сяргея Буткевіча** — на 150 тыс.руб. Іх прызналі вінаватымі ў абразе гонару прадпрымальніка Аляксандра Данілава: у артыкуле выказвалася меркаваньне, што участак для будаўніцтва Цэнтру моладзевага адпачынку быў адведзены прадпрымальніку незаконна. Пазоўнік патрабаваў 30 млн руб. ад газэты і 5 млн руб. — ад журналіста. 11 верасьня выданьне атрымала зь міліцыі адказ на сваю просьбу знайсьці аўтараў ліста з пагрозамі, падпісанага РНЕ: міліцыя ня можа знайсьці аўтараў.

Палітвязьня **Мікалая Статкевіча** пераявілі ў вёску Блонь Пухавіцкага раёну.

На пераходзе «Церахоўка» беларуска-ўкраінскай мяжы мытнікі канфіскавалі ў сябра БСДП(Г) **Валянціна Паборцава** 150 асобнікаў выдаванай ім газэты «Памяць і сучаснікі», а таксама сыгнальныя асобнікі кніг «Судзілішча» і «Чаму Лукашэнка любіць Сталіна» (пра суд над А.Казуліным).

# і цар гары

беларусу, зь якім ты побач, неверагодную каштоўнасьць ягонае душы, ягоную вартасьць перад Богам, ягоную місію ў Беларусі — адзінае выйсьце з абыякавага, сьпітага й зьняверанага *калектыўнага бесьсьвядомага*, навязанага і Сітну, і Менску.

Але ж замест таго, каб абыходзіць адну за адной мільёны беларускіх асобаў, сякія-такія адмыслоўцы лічаць за лепшае па некалькі разоў на год выбраць са свайго асяродзьдзя найлепшую асобу, за якой бы *пайшоў народ*. Цара гары. Ёсьць такая дзіцячая гульня: аблюбаваць сабе горку, штурмаваць, скідаць адзін аднаго, каб на момант ускінуць рукі, пераможным воклічам абвесьціць сябе *царом* — і паляцець дагары нагамі ад кухталя чарговага прэтэндэнта пад ухвальныя выгукі партнэраў. Усім весела, усім цікава, толькі люду вакол ад гэтае валтузьні хіба сьмешна. Люд бачыць, што ў апазыцыі свая тусоўка, у рэжыму свая, і, уздыхнуўшы, пачынае займацца штодзённымі справамі, за якімі яго й засьпявае выпадкова агітатар з таго ці іншага боку.

А беларускі народ ня горшы за іншыя. У занядбанай вёсачцы Малое Сітна, у лясной глушы на мяжы з Расеяй, усяго за год зьявілася суполка ТБМ, два маладафронтаўцы, пяць падпісчыкаў «Народнай волі». Паўтара дзясятка вяскоўцаў носяць значкі «За свабоду» і перадаюць з рук у рукі незалежную прэсу. Калі начальніка мясцовай участковай камісіі адразу пасьля сакавіцкіх выбараў прызначылі кіраўніком леспрамгасу, больш за сорак работнікаў пісьмова адмовіліся працаваць па суботах і нядзелях — і ў жніўні начальніка памянялі. Цяпер сямёра вяскоўцаў рыхтуюцца да мясцовых выбараў у сельсавет...

І справа тут не ў маёй палітычнай актыўнасьці: у мяне амаль увесь вольны час насамрэч заняты пісаньнем, чытаньнем ды сустрэчамі з прыежджымі наведнікамі. Вяскоўцы цікавяцца, падыходзяць, праяўляюць ініцыятыву *самі*. Людзі хочуць нешта зьмяніць — ім трэба адно інфармацыя, эмацыйны штуршок, тлумачэньне. Дзесьці тэлефонны нумар, дзесьці артыкул, дзесьці праўная кансультацыя. Простыя словы й простыя рэчы, якімі ў нас валодае кожны грамадзкі актывіст.

Скажаце, людзі баяцца? «У сьмеласьць майго народу я веру значна больш, чым у ягоную арганізаванасьць», — мае рацыю Вячаслаў Сіўчык.

Галоўнае пытаньне — ня ў страху. Знайсьці людзей, якія не баяцца размаўляць па-беларуску, не жахаюцца чытаць «Нашай Нівы»; выказваюць праўду ўголас або ўдзельнічаюць у кампаніях — не праблема. «Грукайцеся — і адчыняць вам, прасеце — і дасца вам, шукайце — і знойдзеце!» (Мацьвея 7:7). Галоўнае пытаньне — у *веры*.

Ёсьць у беларуса дзіўная схільнасьць — сьпісваць усё, што мог бы зрабіць сам, на народ.

Ці верым мы ў тое, што робім? Ці верым, што пераможам? Ці верыць кожны з нас у сваё пакліканьне? У сваю краіну? У тое, што беларускі народ сапраўды годны свабоды, праўды й справядлівасьці?

Вера — паняцьце ўнівэрсальнае. Калі верыць толькі ў тое, што бачыш — зло непераможнае, мафія несьмяротная, а Беларусь безнадзейная. Але калі верыш у Бога, Які стварыў гэтую краіну й аддаў Сваё жыцьцё за гэты народ, калі верыш, што кожны з 10 мільёнаў беларусаў — гэта вобраз і падабенства Ягоныя, што ахвяраваньні, пакуты й нават сьмерць абарочваюцца ўваскрашэньнем — тады твая *вера* ператвараецца ў *дзеяньне*.

А вера, якая дзейнічае любоўю (Да Галятаў 5:6) — гэта і ёсьць нацыянальнае абуджэньне.

*в.Малое Сітна*

## ХРОНІКА

### 7 верасьня

Звольнены бабруйскі настаўнік **Алесь Чыгір** напісаў скаргу ў Фэдэрацыю прафсаюзаў Беларусі й пазоў у суд — за незаконнае звальненьне.

Адміністрацыя канцэртнай залі «Менск» адмовіла **арганізатарам канцэрту «Старажытная зямля»**, прымеркаванага да Дня беларускай вайсковай славы.

У Лідзе сябрам **Партыі БНФ** не дазволілі правесьці мітынгу 16 верасьня на гарадзкім стадыёне: маўляў, у той дзень мелі адбыцца спартовыя спаборніцтвы.

Грамадзкі актывіст **Кірыла Паражынскі** зьвінавáціў клічаўскіх міліцыянтаў: яго арыштавалі на акцыі салідарнасьці 16 жніўня. Падчас арышту міліцыянты карысталіся мабільнікам хлопца.

У Салігорску камісія ў справах непаўналетніх аштрафавала на 3 базавыя велічыні бацькоў моладзевага актывіста **Зьмітра Ефімовіча** — «за злоснае ўхіленьне ад выхаваньня сына»: хлопца затрымалі 13 жніўня падчас расклейкі налепак.

У Тураве звольнілі з працы мэтадыстку Дому дзіцячай і юнацкай творчасьці **Іну Зеніну** — актывістку выбарчай кампаніі Мілінкевіча.

### 11 верасьня

Другое дасудовае паседжаньне ня скончылася міравым пагадненьнем: працэс паміж **газэтай ПКБ «Товарищ»** і прафсаюзным лідэрам таксоўшчыкаў **Паўлам Паддубскім** з аднаго боку і кіраўніком асацыяцыі «Сталічнае таксі» Ігарам Верхаўцом з другога мае адбыцца.

Выканаўца абавязкаў старшыні БСДП(Г) **Анатоль Ляўковіч** атрымаў адмоўны адказ зь Вярхоўнага суду: ён аспрэчваў штраф у 4 млн 650 тыс.руб. за «правядзеньне незаконнага сходу» ў лютым. Насамрэч, ён як давераная асоба А.Казуліна абмяркоўваў на прыватнай кватэры вынікі збору подпісаў на карысьць кандыдата.

**РГА «Беларускі Хэльсынскі камітэт»** зьвярнуўся ў Канстытуцыйны суд з просьбай абараніць права грамадзянаў на свабоду аб'яднаньняў. Падставай стала справа актывістаў «Партнэрства».

**АШ**

# Арганізатары Джынсавага фэсту абяцаюць сюрпрызы

Ня першы тыдзень уся Беларусь абклеена налепкамі «Вялікі джынсавы фэст». Арганізатары добра папрацавалі над PR. Пра фэст чулі ўсе, але па-ранейшаму застаецца няяснасьць, што нас урэшце чакае ў суботу.

Арганізатары падалі заяўку на правядзеньне «фэсту» яшчэ пры канцы жніўня, але да апошняга не было пэўнасьці, што ўлады дазволяць акцыю.




...і — клік — забыўшыся, рука
Заміж заморскага актора
Імя Зянона Пазьняка.

Адказ прыйшоў на днях. Менгарвыканкам дазволіў толькі канцэрт-мітынг на Бангалоры, забараніўшы шэсьце ад Акадэміі навук. Арганізатары заклікаюць усіх ахвочых прыходзіць менавіта на Бангалор а 16:00, а не зьбірацца ля кінатэатру «Кастрычнік», як плянавалася раней.

Фэст адбудзецца ў сёмую гадавіну зьнікненьня палітыка Віктара Ганчара і бізнэсоўца Анатоля Красоўскага. Тым самым удзельнікі зьбіраюцца прыцягнуць увагу да праблемы зьнікненьня ў Беларусі людзей.

Яшчэ не вядома дакладна, хто з музычных зорак возьме ўдзел у фэсьце, гэтая інфармацыя трымаецца ў сакрэце. Хіба толькі «Таварыш Маўзэр» цьмяна так намякнуў, што зайграе на Бангалоры 16-га.

Сярод налепак да «Вялікага джынсавага фэсту» ёсьць і такая, дзе акцыю беларускай апазыцыі рэклямуе Брус Ўіліс. Напэўна, гэтая акалічнасьць дала падставу «Музыкальной газете» паведаміць, што на канцэрт у Менск прыедзе гэтая зорка Галівуду разам са сваім гуртам «The Accelerator». Відавочна, што гэтая навіна — простая бурбалка. Аднак арганізатары і без таго абяцаюць мноства сюрпрызаў, якіх яшчэ ніколі не было на беларускіх імпрэзах.

**Зьміцер Панкавец**

## АПЫТАНЬНЕ НА САЙЦЕ NN.BY

**Каго б вы хацелі бачыць на Джынсавым фэсьце?**

| | |
|---|---|
| Бона (U2) | 61 (15.8%) |
| Зынэдына Зідана | 36 (9.4%) |
| Вацлава Гаўла | 24 (6.2%) |
| Леха Валэнсу | 13 (3.4%) |
| братоў Клічкоў | 13 (3.4%) |
| Озі Осбарна | 46 (11.9%) |
| Зянона Пазьняка | 192 (49.9%) |

Усяго прагаласавала ад панядзелка да 16.30 серады: 385.

# Сярод мультымільянэраў Усходняй Эўропы — ніводнага беларуса

Польскі часопіс «Wprost» апублікаваў штогадовы рэйтынг ста самых багатых людзей Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы. Беларускіх грамадзянаў сярод гэтых багатыроў няма.

Замыкае сотню Дэнек Бакала, чэскі прадпрымальнік, які валодае капіталам у 350 мільёнаў даляраў. А лідэр — расейцы, іх у сьпісе 48 чалавек. Першую дзясятку рэйтынгу складаюць выключна расейцы — ад Рамана Абрамовіча, які мае 19 мільярдаў 500 мільёнаў даляраў, да Сулеймана Карымава, які валодае толькі 8 мільярдамі даляраў. Нават вязень Міхаіл Хадаркоўскі застаўся ў сьпісе на 79 месцы з паўмільярдам.

У сьпісе амаль пароўну украінцаў і палякаў — 15 і 14 чалавек адпаведна, 9 румынаў, 4 сэрбы, 3 чэхі, 3 харваты, па двое баўгараў і латвійцаў. Паводле аб’ёму багацьця украінцы ідуць адразу за расейцамі — у першай дваццатцы фігуруюць гаспадар Данбасу Рынат Ахметаў, блізкі да партыі Юліі Цімашэнкі Ігар Каламойскі і зяць былога прэзыдэнта Кучмы Віктар Пінчук.

**АК**




# Літоўцы выпусьцілі манэту ў гонар беларускі

Літоўскі банк выпусьціў 12 верасьня ў абарачэньне памятную манэту вартасьцю 50 літаў. Яна прысьвечаная гераіні вызвольнага паўстаньня 1831 г., фальклярыстцы Эміліі Плятэр.

Сёлета, 13 лістапада, будзе адзначацца 200 год з дня нараджэньня славутай

дачкі беларускага народу. Яна нарадзілася ў Вільні, а потым жыла ў маёнтку Ліксна Віцебскай губэрні. У канцы сакавіка 1831 г. яна ўзначаліла партызанскі атрад, які змагаўся супраць расейскіх акупантаў.

У Нацбанку Беларусі свой клопат. 12 верасьня ён выпусьціў у абарачэньне манэты сэрыі «Заказьнікі Беларусі» «Чырвоны бор» з выяваю зьвярка норкі.

**АГ**

## Прадпрымальнік на «Ждановічах» гандляваў «левай» каўбасой



На прадпрымальніка са сталічнага рынку «Ждановічы» міліцыя распачала крымінальную справу. Яго вінавацяць у распаўсюдзе лжывай інфармацыі пра тавары і паслугі. 50-гадовы прадпрымальнік купіў на рынку 800 кг кілбасаў польскай вытворчасьці без суправаджальных дакумэнтаў. Пасьля гэтага ён вырабіў на кампутары этыкеткі «Віцебскі мясакамбінат», якія прымацаваў на вырабы. Аднак эпідэміёлягі высьветлілі, што гэтая прадукцыя непрыдатная для харчаваньня. Прадпрымальніка пакуль не затрымлівалі, аднак узялі зь яго падпіску аб зьяўленьні ў міліцыю.

**Эўрапейскае радыё для Беларусі**



**На фота: кадар зь фільму «Франц+Паліна»**

## Прэм’ера фільму паводле Алеся Адамовіча

У сераду ў менскім Доме кіно адбылася прэм’ера кінафільму «Franz+Polina», паводле аповесьці Алеся Адамовіча «Нямко». Сам пісьменьнік называў «Нямка» «нявыдуманай гісторыяй» каханьня беларускай дзяўчыны і маладога нямецкага салдата.

Карціна зробленая на студыі «Югра-фільм» (Расея). У ёй занятыя кінаакторы зь Беларусі, Расеі, Нямеччыны. Здымкі праходзілі ў Беларусі.

**МБ**

## Групавы шлюб на даху

У Нацыянальнай бібліятэцы ў мінулую суботу ажно 11 параў адначасова ўзялі шлюб. Мерапрыемства было прымеркаванае да сьвята гораду.

У Нэце зьявіліся злыя чуткі пра тое, што і першую шлюбную ноч маладыя правядуць у «дыямэнце ведаў», маўляў, дзеці тады будуць надзвычай разумнымі. У мяне, па шчырасьці, адразу зьявіліся асацыяцыі з набудаванымі па ўсёй краіне лядовымі палацамі, у якіх, каб хоць трохі акупіць шалёныя грашовыя ўкладаньні, рабілі кірмашы і канцэрты поп-зорак. Аднак арганізатары адразу заўпэўнілі маладых і журналістаў, што мерапрыемства гэтае робіцца ў першы і апошні раз, і ў гэтым уся ягоная фішка.

Журналісты доўга гадалі, навошта на цеснай пляцоўцы прысутнічалі яшчэ й байцы спэцназу. Вядучая з тэлеканалу БТ нават пажартавала: «Гэта калі хтосьці з жаніхоў захоча зьбегчы...» Аказалася, што хлопцы ў камуфляжы, якія яўна сумавалі на чужым сьвяце, трымалі гірлянды з паветраных шарыкаў! Бо вецер быў такі, што дзіўна, як ніводны вэлюм не зьляцеў.

Пры канцы мерапрыемства дырэктар бібліятэкі ўручыў маладым чытацкія білеты. «Калі да нас наступным разам?» — запытаўся ён навасьпечаных мужоў і жонак. «У панядзелак!» — хорам адказалі тыя. «Ну добра, заўтра можаце не прыходзіць», — пагадзіўся ён.



## Семянюк адказвае маці маладафронтаўцаў

**Я вяртаюся да тэмы Грамадзкага камітэту абароны рэпрэсаваных.** Вяртаюся, каб найперш прасіць прабачэньня ў пакрыўджаных маці маладафронтаўцаў. У мяне зусім не было мэты пакрыўдзіць. І просячы прабачэньня ў вас, я прашу прабачэньня і ў сваёй маці, якая вось ужо два гады жыве з разуменьнем, што яе сын так і застанецца невукам. Я не вучуся ўжо з 2004 году.

Тым ня менш, я лічу так, як лічу. Я таксама зьвярнуўся ў Камітэт па дапамогу. Я прашу завочнага навучаньня ва Украіне. І я ўпэўнены, што раблю правільна. Мы павінны быць моцнымі і не даваць нагоды кпіць зь сябе, маўляў: «Клікалі на Плошчу, а зьехалі ў Польшчу». І толькі сваім уласным прыкладам мы можам паказаць нязломнасьць.

І мае думкі накont Камітэту — ня што іншае як спроба дапамогі. Бо відавочна, што зь ім штосьці ня так, калі 230 чалавек спакойна зьяжджаюць у Польшчу, а такі чалавек, як Зьміцер Касьпяровіч, адседзеўшы пяць месяцаў, ня можа атрымаць магчымасьці скончыць навучаньне.

Я ня супраць Камітэту, я за разумны падыход да чалавечых лёсаў! Магчыма, камусьці ў 20 год цікава пажыць у іншай краіне, але большасьць з гэтых дзяцей не ўсьведамляе, што пасьля вучобы будзе цяжка вярнуцца назад. Калі маеш эўрапейскую адукацыю — прасьцей жыць у Эўропе. І тут, я лічу, мы павінны праявіць цьвёрдасьць.

Гэта цяжка, я згодны, але хто з нас разьлічваў на лёгкую перамогу? Цынізм улады ў гэтым і праяўляецца: ахвяраваць даводзіцца не сваім уласным здароўем, а здароўем сваім бацькоў.

**Сяржук Семянюк, Менск**

## Маткам маладафронтаўцаў

**Маткі, дарагія! Вы ж, можа, дзяцей сваіх адпускаеце назаўжды.** Бо калі ён аднойчы выедзе, яму прасьцей будзе там застацца, чым вярнуцца. Тут бы яго (яе) пару разоў у пастарунак зацягнулі, а жыў бы пры вас. А калі туды выедуць, вы ж за імі не паедзеце сваю старасьць дажываць.

**Натальля Гіль, Менск**

## Годзе!

**Сьмеху вартыя заявы Міністэрства адукацыі аб тым, што ў нас вясковыя школы застаюцца зь беларускай мовай навучаньня.** А далей вясковай школы гэтай мове сьмердаў дарога заказана. А можа, зусім адмовіцца ад мовы сьмердаў? За каго кіраўніцтва лічыць вяскоўцаў, пра якіх так «клапоціцца» прэзыдэнт? Вяскоўцам забаронена вучыцца на мове гораду. А можа, мы грамадзяне не адной краіны? Не дарэмна прэзыдэнцкія службоўцы заклікаюць нас гаварыць «на человеческом языке», не дарэмна на многіх платах бачым свастыку і РНЕ, і ня дзіва, што ніхто іх не замазвае. Дык што, браткі беларусы, церпім і надалей рэзэрвацыю беларусаў у Беларусі? Заўсёды знойдуцца лукашанцы, якія з задавальненьнем «забароняць тарашкевіцу». У іх толькі «забараніць», «затрымаць», «пасадзіць». Аплёмбу многа, а развагі, мудрасьці чалавечай мала...

І я так скажу пра гэта ўсё — годзе нам гэта трываць!

**Уладзімер Трашчанка, Маладэчна**

## Хачу распавесьці пра сваё стаяньне ля сьценаў менскага касьцёлу Сьв.Язэпа

**У сакавіку, пэўна, кожны сьвядомы жыхар Менску, ажыўшага пасьля зімовага сну, чакаў цуду.** А цуд упарта не жадаў зьдзяйсьняцца ў нашай «самабытнай», «квітнеючай», «стабільнай» ды «моцнай» краіне.

Мэлёдыя мабільнага тэлефона перапыніла мае блуканьні старонкамі апазыцыйных сайтаў, на якіх паведамлялася, што ў ноч з 23 на 24 сакавіка ў Менску на плошчы Каліноўскага быў ліквідаваны намётавы гарадок. У SMS-паведамленьні, што мяне зьбянтэжыла, было наступнае: Staimo dalej. Z nami Boh. Sv.Jazep. Pa 18. Што гэта? Чыйсьці недарэчны жарт? Заклік невядомай мне арганізацыі не губляць веры і працягваць супрацьстаяньне? Ці, можа, мы ўрэшце дачакаліся сапраўднага цуду, і сам сьвяты Язэп, расчулены нашымі шчырымі малітвамі, вырашыў пакінуць Неба і стаць побач з намі на плошчы Каліноўскага пад бел-чырвона-белы сьцяг Хрыста? Нумар тэлефона, зь якога прыйшла SMS-ка, ні аб чым мне не казаў. Але я ўспомніла, што адзін знаёмец распавядаў мне пра касьцёл Сьв.Язэпа, ля сьценаў якога кожны дзень зьбіраюцца людзі, дамагаючыся, каб улады вярнулі ім храм. Тады я не адгукнулася на запрашэньне «стаяць далей» побач са Сьв.Язэпам, а па нейкім часе і ўвогуле забылася на зьвернуты менавіта да мяне заклік і ўспомніла аб ім толькі тады, калі выпадкова натрапіла на адно з такіх «стаяньняў» ля зачыненых дзьвярэй адабранай у нас сьвятыні.

У той жнівеньскі вечар ля ганка касьцёлу, які знаходзіцца побач з Катэдральнай царквой, на вул.Кірылы і Мятода, 6, сабралася дванаццаць чалавек, але мы не пачуваліся самотнымі, бо з намі быў Бог. Малітвы, народжаныя ў нашых сэрцах і прамоўленыя нашымі вуснамі, блукалі ля прахалодных сьценаў старажытнай бажніцы, уладкоўваліся разам з прыціхлымі птушкамі на галінках засохлых дрэваў, ляцелі разам зь няўрымсьлівым ветрам да самага неба. Неба глядзела на нас цёмна-шэрымі вачыма-хмарамі, напоўненымі празрыстым, як крышталь, дажджом. Яно плакала, бо яго засмучала абыякавасьць мінакоў і празьмерная зацікаўленасьць міліцыянтаў, што «падтрымлівалі парадак». А людзі хаваліся ад ягоных крыштальных сьлёз пад парасонамі, са зьдзіўленьнем пагляделі на нас і хуценька беглі далей. Сьвяты Язэп любаваўся прыгажосьцю нашага гораду зь нябесных вышыняў і разам з намі маліўся за ягоных жыхароў.

У касьцёле, які зьяўляецца часткай пабудаванага ў XVII—XVIII ст. кляштару бэрнардынаў, цяпер знаходзіцца архіў-музэй літаратуры і мастацтва і архіў навукова-тэхнічнай дакумэнтацыі. А храм марыць прымаць у сваіх намоленых сьценах шматлікіх вернікаў, слухаць разам зь імі натхнёныя казані беларускіх сьвятароў і чароўную музыку аргана, з замілаваньнем назіраць, як сур'ёзныя, апранутыя ў сьвяточныя строі дзеткі прымаюць Першую Камунію і ўпрыгожваюць сваімі залатымі крыжамі часам яснае ды блакітнае, а часам пахмурнае ды шэрае менскае неба.

Я прыходжу да касьцёлу не таму, што лічу гэта сваім абавязкам, і не таму, што мяне аб гэтым нехта просіць. Сюды імкнецца маё сэрца. Тут яно размаўляе з Богам, і ні дождж, ні вецер, ні холад зусім гэтаму не перашкаджаюць. Тут мы молімся па-беларуску за Беларусь і запрашаем таксама і вас далучыцца да нашых малітваў. І хто ведае, магчыма, менавіта вашая прысутнасьць стане вырашальнай і паспрыяе ня толькі вяртаньню нашай сьвятыні, але і набліжэньню такой неабходнай усім нам перамогі, бо Беларусь, нягледзячы ні на якія перашкоды, усё ж паціху жыве і ўпарта чакае цуду.

**Марына Баброўская, Менск**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29.**

Фота Свабоды
Твой погляд на тваё жыцьцё!
Адкрыты конкурс. Прызы. Галоўны – паездка ў Прагу.
Дасылайце здымкі падзей, сытуацый, людзей на
**svaboda@rferl.org**
**mms.svaboda@rferl.org**
радыё свабода
www.svaboda.org

# Ідэалягічная база русіфікацыі

Як бы беларусаў зрабіць больш расейскімі? Ідэалягічная вэртыкаль узялася за вырашэньне гэтай надзённай задачы. Піша **Андрэй Павач.**

Пачынаючы з канца ліпеня «Советская Белоруссия» вядзе на сваіх старонках «абмеркаваньне» артыкулу А.Рубінава «Еще раз об идеологии». Слова «абмеркаваньне» бяру ў дзьвюхкосьсе, бо гэта суцэльнае ўсхваленьне яго тэзісаў плюс мэтадычнае паліваньне гразьзю ўсяго беларускага. 31 жніўня газэта надрукавала два асабліва «моцныя» артыкулы…

Першы пад назвай «Методологические идеологемы историков» належыць пяру доктара гістарычных навук Петрыкаву, аўтару манаграфій пра сацыялістычнае будаўніцтва ў БССР і дзейснага сябра шматлікіх радаў па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысэртацыяў.

У традыцыях барацьбы з «нацдэмаўшчынай» канца 1930-х гадоў Петрыкаў крытыкуе дасягненьні беларускай гістарычнай навукі апошніх пятнаццаці гадоў. У чым толькі аўтар ні вінаваціць гісторыкаў. Тут і прапаганда Вялікага Княства Літоўскага як беларускай дзяржавы, і антырасейскія настроі, і заніжэньне ролі Кастрычніцкай рэвалюцыі ў гістарычным разьвіцьці Беларусі.

Гэта старая песьня, і, на шчасьце, Вялікае Княства Літоўскае дзяржавай польскіх і літоўскіх фэадалаў у сьвядомасьці людзей ужо ня зробіш, але Петрыкаў уздымае яшчэ і моўнае пытаньне. Тут трэба спыніцца падрабязьней. Аўтар рашуча выступае ў абарону расейскай мовы ў школах, навуцы і паўсядзённым жыцьці беларусаў, прычым абгрунтоўвае яе сучаснае дамінаўнае становішча гістарычнымі прычынамі: «сложный процесс «русификации», особенно в начальный период, оказывал и оказывает благотворное влияние на развитие политической, экономической и социально-культурной жизни в Беларуси». Канечне ж, аказваў і аказвае, асабліва калі ўзяць пад увагу нядаўняе рашэньне прэзыдэнта аб тым, што нацыянальная гісторыя мусіць выкладацца ў школах па-расейску.

Не абышлося і без «філялягічных» аргумэнтаў: «разве наши предки не пользовались в VI—XIII веках общим для всех восточных славян «руським» языком?»

Самае заўважнае ў ідэалягічных пабудовах Петрыкава — гэта бессаромнае перамешваньне чарнасоценскай русіфікатарскай прапаганды і камуністычнай ідэалёгіі, характэрнае, дарэчы сказаць, для большасьці савецкіх гісторыкаў, выхаваных у сталінскі час. Ня любяць гэтыя гісторыкі чытаць клясыкаў, асабліва У.Леніна, а вось мы яго працытуем: «Интернационализм со стороны… так называемой «великой нации» (хотя великой только своими насилиями, великой так, как велик держиморда) должен состоять не только в соблюдении формального равенства наций, но и в таком неравенстве, которое возмещало бы то неравенство… которое складывается в жизни фактически…» Вось бачыце, калі беларускай мове цяжэй, чым расейскай, то могуць быць нават дапушчаныя пэўныя прэфэрэнцыі беларушчыне. Як бачым, шаноўны таварыш Петрыкаў, Уладзімер Ільіч і ягоная рэвалюцыя былі на нашым, беларускім, баку, а вы такім парадкам аніякага дачыненьня ня маеце да Кастрычніцкай рэвалюцыі, як ня мае да яе дачыненьня ўсё, зробленае «вождем всех народов» Сталіным пры канцы 1920—1950-х.

Другі артыкул «Пиво — не культура…» напісаны не такім тытуляваным навукоўцам, але таксама цікавы. Яго аўтар — старшы саветнік юстыцыі Дзенісенка, які падпісаўся яшчэ як ляўрэат нейкай «Берасьцейскай зоркі — 2002» у намінацыі «Культура».

У артыкуле — гісторыя юнака, унука вэтэранаў вайны, які нападпітку спаліў вянкі на абэліску савецкім салдатам. Сутнасьць праблемы духоўнасьці аўтар бачыць у… развале СССР: «Возможно, в обществе не до конца преодолены породившие бездуховность последствия развала могущественной страны советов». Ну колькі можна ўваскрашаць тое, што ніколі не існавала — савецкі народ. Зрэшты, калі гісторыку Петрыкаву дазваляецца апэляваць да нейкага старажытнарускага народу, якога ніколі не існавала, то чаму б Дзенісенку не рабіць тое самае з народам савецкім?

У канцы навяўлены прарок Ерамія ўсклікае: «Порок наказан. Но вопросы остались. Как и чем засеять каменистую почву нравственности, чтобы собрать урожай добрых дел?» Цікава, каму сп.Дзенісенка задае гэтыя пытаньні? Ці ж ня нашым уладам, якія папаўняюць бюджэт з самых танных у Эўропе пладовых вінаў? Ці, можа, тав.Петрыкаву, які лічыць, што, вывучаючы гісторыю Беларусі па-расейску, нашы дзеці стануць большымі патрыётамі і лепшымі людзьмі?

Сапраўдная нацыянальная ідэя нараджаецца не ў кабінэтах чыноўнікаў ідэалягічных упраўленьняў і выхоўваецца ў моладзі не пры дапамозе расейскамоўных падручнікаў.

*Горадня*

## У ТЭМУ

### Яшчэ паўтара мільярда на дзяржаўную прэсу

Міністэрства інфармацыі сёлета закупіла абсталяваньня для дзяржаўных друкаваных СМІ на 772 мільёны і яшчэ закупіць на 778 мільёнаў. Пра гэта карэспандэнту БЕЛТА паведаміў начальнік упраўленьня вытворча-тэхнічнага разьвіцьця Міністэрства інфармацыі Мікалай Брашко.

У першым паўгодзьдзі для рэспубліканскіх пэрыядычных выданьняў набылі 127 кампутараў, 54 друкаркі, 28 сканэраў, 22 капіявальныя апараты, 21 факс, 23 фотаапараты. Фататэхніку рэдакцыі ўжо атрымалі, зараз пастаўляюцца кампутары.

У другім паўгодзьдзі будзе праведзены тэндэр на закупку 150 кампутараў, 51 друкаркі, 28 сканэраў, 3 капіявальных апаратаў, 5 факсаў, 25 лічбавых дыктафонаў і 26 фатакамэраў. Колькасьць закупляльнай тэхнікі вызначаная з улікам заявак рэдакцый.

Як падкрэсьліў Мікалай Брашко, усё абсталяваньне – самае сучаснае, найноўшае.

**Паводле БелТА**

# Юбілеялёгія

Савецкая гісторыя: як 17 верасьня сьвяткавалі 30 кастрычніка.

АНАТОЛЬ ВЯЛІКІ

Юбілей... У памяці адразу ўзьнікаюць шматлікія асацыяцыі: «чырвоны дзень календара», абавязковы ўдзел ва ўрачыстай дэманстрацыі, прэміі, узнагароды ды іншая мітусьня і тлум, якія ёсьць неад'емным атрыбутам юбілейнай даты. Аднак маецца і іншы бок юбілейнага «мэдаля», нябачны для абсалютнай большасьці грамадзянаў, але які красамоўна распавядае ўважліваму назіральніку аб статусе юбілею. Хто і ў якой пасьлядоўнасьці стаяў на трыбунах і сядзеў у прэзыдыюмах на ўрачыстых паседжаньнях, хто выступаў з афіцыйным дакладам, што быў ня проста тэкстам, але праграмным дакумэнтам, у якім на дзяржаўным узроўні тлумачыўся пункт гледжаньня па найважнейшых пытаньнях унутранай і замежнай палітыкі, вызначаліся пэрспэктывы разьвіцьця рэспублікі, замацоўваліся старыя і ўводзіліся новыя ідэалягемы, што павінны былі абслугоўваць існы рэжым. Вось што было галоўным у юбілеях, а не прапагандысцкая траскатня, што ім спадарожнічала.

Прасочым эвалюцыю сьвяткаваньня юбілею ўзьяднаньня Заходняй Беларусі з БССР. Нагода ёсьць: 17 верасьня 2006 г. споўніцца 67 год, як Чырвоная Армія ўвайшла ў Заходнюю Беларусь, каб «узяць пад ахову» і «вызваліць адзінакроўных братоў-беларусаў» з-пад «белапольскага прыгнёту». Далей адбыліся ўсім вядомыя падзеі: падрыхтоўка і правядзеньне паводле маскоўскага сцэнара выбараў дэлегатаў на Народны Сход, які праходзіў у Беластоку і выказаўся за ўваходжаньне Заходняй Беларусі ў склад БССР. Правядзеньне ў лістападзе таго ж году пазачарговых сэсіяў ВС СССР (2 лістапада) і БССР (14 лістапада), якія аформілі гэта юрыдычна, у адпаведнасьці з заканадаўствам. Так у беларускім календары зьявілася новае сьвята — 17 верасьня 1939 г. Да пачатку Другой сусьветнай вайны яно не пасьпела рытуалізавацца — часу не хапіла. У вайну было не да сьвят — усё было падпарадкавана адной задачы — перамагчы. Коштам неймавернага напружаньня, у тым ліку і беларускага народу, перамаглі.

Пераможны 1945 г. рытуалізаваў і нават сакралізаваў сьвята. 17 верасьня 1945 г. Беларусь адзначала 6-ю гадавіну «узьяднаньня». Але як адзначала! У разбураным Менску 17 верасьня 1945 г. адбыўся ўрачысты мітынг і ваенны парад войскаў менскага гарнізону, які прымаў камандуючы беларускай ваеннай акругай генэрал-лейтэнант М.Разуваеў. Ён зьвярнуўся з прамовай да ўдзельнікаў параду і прысутных.

На цэнтральнай трыбуне перад Домам ураду была ўся палітычная, ваенная, творчая эліта Беларусі: Старшыня СНК БССР П.Панамарэнка, намесьнікі, сакратары ЦК КП(б)Б, генэралітэт Беларускай ваеннай акругі, побач зь імі Якуб Колас, Яўген Глебаў. На бакавых трыбунах «драбнейшае» чынавенства ды шматлікія госьці, запрошаныя і прывезеныя на сьвята з усіх куткоў Беларусі. А якія словы гучалі ў той дзень, а потым паўтараліся ў выпусках рэспубліканскіх газэт: «усебеларускае нацыянальнае сьвята», «дзень гістарычнага сьвята беларускага народу», «дзень узьяднаньня беларускага народу ў адзінай Беларускай Савецкай дзяржаве». У гэты ж час у абарот запусьцілі шэраг ідэалягем, кшталту «савецкі народ вызваліў адзінакроўных братоў-беларусаў і ўзяў іх пад сваю абарону», якія пануюць і да цяперашніх дзён.

> «Дзясятую гадавіну ўзьяднаньня беларускага народу ў адзінай Беларускай Савецкай Сацыялістычнай дзяржаве — паўсюдна адзначыць 30 кастрычніка 1949 г. як усенароднае сьвята».

У наступным 1946 г. ужо не плянавалася ніякіх парадаў, урачыстых мітынгаў, шэсьцяў і г.д. Разам з тым ЦК Кампартыі Беларусі з нагоды сьвята прымае пастанову, у якой адзначае, зьвернем на гэта ўвагу, што 17 верасьня — «дзень узьяднаньня беларускага народу ў адзінай Савецкай Беларускай дзяржаве». У сувязі з гэтым прапанавалася правесьці 16 верасьня 1946 г. урачыстыя паседжаньні гар- і райвыканкамаў, а на ўсіх прадпрыемствах, у калгасах, саўгасах, МТС і вёсках — сходы працоўных, прысьвечаных гэтай даце. У Менску 16 верасьня адбылося ўрачыстае паседжаньне Менскага гарсавету, на якім з дакладам, і гэта паказвала ўзровень «мерапрыемства», выступіў старшыня Прэзыдыюму ВС БССР Нічыпар Наталевіч. Такім чынам, на дзяржаўным узроўні было падкрэсьлена і замацавана: 17 верасьня — дзень узьяднаньня беларускага народу, які павінен і надалей адзначацца як агульнанацыянальнае сьвята, што ў наступныя гады і адбывалася.

Аднак ні 1945 г., ні наступныя гады не былі «юбілейныя». 10-годзьдзе ўзьяднаньня прыпадала на верасень 1949 г., і партыйна-савецкае кіраўніцтва рэспублікі пачало загадзя рыхтавацца да верасьнёўскага сьвяткаваньня. Аднак здарылася нечаканае. 2 верасьня 1949 г. бюро ЦК КП(б) Беларусі прымае пастанову, у якой канстатуе, зьвяртаем на гэта ўвагу, што «2 лістапада 1949 г. спаўняецца 10 год з дня выдатнай гістарычнай падзеі ў жыцьці беларускага народу — узьяднаньня беларускага народу ў адзінай Беларускай Савецкай дзяржаве», і прымае рашэньне: «Дзясятую гадавіну ўзьяднаньня беларускага народу ў адзінай Беларускай Савецкай Сацыялістычнай дзяржаве паўсюдна адзначыць 30 кастрычніка 1949 г. як усенароднае сьвята». Прынцыпова зьмянілася адзнака падзей. Мімаходам, не акцэнтуючы ўвагі, ЦК КП(б)Б узгадала, што 17 верасьня «Чырвоная Армія прынесла вызваленьне Заходняй Беларусі», а выдатная гістарычная падзея «ўзьяднаньне беларускага народу» адбылося 2 лістапада.

Адразу ж паўстае пытаньне: а куды дзелася 17 верасьня, якое чатыры гады запар адзначалі як «усенароднае нацыянальнае сьвята», а 10-гадовы юбілей раптоўна пастанавілі адзначыць 30 кастрычніка? Прамога адказу, чаму і хто вырашыў перанесьці юбілейныя сьвяты з 17 верасьня на 30 кастрычніка і 2 лістапада, няма. Магчыма толькі выказаць асабістае меркаваньне, што рашэньне аб пераносе юбілейнай даты прымалася ня ў Менску, а ў Маскве. У сыстэме герархічнай улады, паноўнай пры І.Сталіну, такога кшталту рашэньні прымаліся толькі ў Крамлі. Іншая справа, калі і хто прыняў рашэньне, што больш мэтазгодна сьвяткаваць узьяднаньне не 17 верасьня, а 30 кастрычніка. Аднак, як ні дзіўна, у гэтым была свая рацыя і лёгіка, хто б ні быў аўтарам гэтай ідэі. Побач зь Беларусьсю знаходзілася ўжо не «белапанская» і «фашысцкая» Польшча, а бліжэйшы сатэліт і адзін з хаўрусьнікаў «сацы-




**30 кастрычніка 1939 году дэлегаты Народнага Сходу Заходняй Беларусі адзінадушна выказаліся за ўваходжаньне ў СССР. Паспрабавалі б яны рашыць інакш...**

ялістычнага блёку». Да таго ж у Крамлі, асабліва Сталін і Молатаў, добра разумелі, што 1 і 17 верасьня зьнітаваныя паміж сабой пактам Молатава—Рыбэнтропа, які прывёў да падзелу Польшчы, і ў палякаў, хоць і глыбока прыхавана, але для адноснa «вызвольнага паходу Чырвонай Арміі», маецца адно слова — «агрэсія». З гледзішча крамлёўскіх юбілеёлягаў 30 кастрычніка і 2 лістапада былі не такія раздражняльныя для палякаў. Маўляў, сабраліся беларусы ды украінцы на Народныя Сходы, 30 кастрычніка адзінадушна выказаліся за ўзьяднаньне і ўваходжаньне ў склад СССР, і Вярхоўнаму Савету не заставалася нічога іншага, як «задаволіць іх просьбу» і 2 лістапада прыняць Закон аб уключэньні Заходняй Беларусі ў склад СССР.

Аднак у Менску ніхто не задаваў сабе такіх пытаньняў. Рашэньне было прынятае, і яго неабходна было выконваць. ЦК КПБ стварае ўрадавую камісію ў падрыхтоўцы юбілею і выпрацоўвае плян падрыхтоўчых мерапрыемстваў. Ён уражвае. У адпаведнасьці зь ім плянавалася: 29 кастрычніка ў Менску правесьці юбілейную сэсію ВС БССР; з 25 па 30 кастрычніка правесьці ўрачыстыя паседжаньні сельскіх, гарадзкіх, раённых саветаў; ва ўсіх газэтах устанавіць з 17 верасьня Дошку гонару перадавікоў спаборніцтва ў гонар юбілею; выпусьціць спэцыяльны кіначасопіс аб дасягненьнях Заходняй Беларусі; правесьці ў верасьні раённыя, гарадзкія, абласныя агляды мастацкай самадзейнасьці; 30 кастрычніка выдаць спэцыяльныя нумары газэт і часопісаў; 23 кастрычніка правесьці Ўсебеларускую спартакіяду сельскай моладзі; 29 кастрычніка правесьці выставу найлепшых твораў мастакоў, скульптараў, графікаў, прысьвечаную ўзьяднаньню; узнагародзіць граматамі ВС БССР перадавікоў прамысловасьці, сельскай гаспадаркі, настаўнікаў, лекараў, партыйных савецкіх і камсамольскіх работнікаў заходніх абласьцей.

У верасьні, як і прадугледжвалася, пачалася шырокамаштабная падрыхтоўка да юбілею. На прадпрыемствах, ва ўсіх установах, у калгасах, саўгасах, МТС распачалося спаборніцтва «за дасягненьне лепшых паказьнікаў у гонар 10-й гадавіны ўзьяднаньня». У музэях сьпешна стварылі выставы, прысьвечаныя даце. Адгукнуліся на юбілей прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі. Пімен Панчанка ў вершы «Шчасьлівы верасень» праніклёна пісаў:

Мы верасень гэты назвалі шчасьлівым,
Мы выйшлі, браты, з-пад запораў іржавых
На нівы, з пары той — на вашыя нівы
Пад сонца вялікай Савецкай дзяржавы.

Не «адставалі» і беларускія кампазытары. Народны артыст Н.Курцін да 10-годзьдзя напісаў музыку на вершы Я.Купалы «Я з заходняй — ты з усходняй», а заслужаны дзеяч мастацтва Беларусі Я.Цікоцкі стварыў «Песьню аб узьяднаньні» і сымфанічную паэму «Падзяка Сталіну». Т.Аладаў — песьню «Ў сонечную даль» на словы М.Танка.

Разам зь мерапрыемствамі, якія мелі характар беларускага маштабу, у кастрычніку пачала набіраць моц кампанія больш высокага ўзроўню — саюзнага.

**Працяг на старонцы 30.**

# Юбілеялёгія

**Працяг са старонкі 29.**

16 верасьня ўрадавая камісія ўважыла за неабходнае падрыхтаваць ліст Сталіну ад беларускага народу. Юбілей пачаў набываць якасна новы статус, бо ліст Сталіну — гэта не ўсебеларуская дошка гонару. Спачатку, як гэта і практыкавалася ў партыйных структурах, яго абмеркавалі ў ЦК КП(б)Б, а потым скіравалі на абмеркаваньне сярод «працоўных». Каб уявіць маштаб абмеркаваньня, прывяду толькі статыстыку: у рэспубліцы адбылося 26 903 сходы, на якіх выступілі 64 363 чалавекі, а ўсяго ў абмеркаваньні ліста Сталіну ўдзельнічала 2 971 846 чалавек.

Апагеем сьвяткаваньняў сталі 29 і 30 кастрычніка 1949 г. 29 кастрычніка адбылася шостая (юбілейная) сэсія ВС БССР, на якой з дакладам выступіў старшыня СМ БССР А.Клешчаў. На адрас сэсіі былі дасланыя прывітальныя тэлеграмы ад С.Будзённага, М.Яроменкі ды іншых, у тым ліку і ад старшыні ЦК ПАРП Б.Берута ды старшыні СМ Польшчы Ю.Цыранкевіча. Урачыстыя паседжаньні гар-, рай-, і аблвыканкамаў адбыліся ва ўсіх гарадох рэспублікі. Аднак галоўныя сьвяткаваньні прайшлі ў Менску. Напэўна, упершыню сталіца была так упрыгожана. Увесь цэнтар гораду занялі пераносныя выставы. Так, у сквэры насупраць будынку ЦК КП(б)Б (цяпер насупраць адміністрацыі прэзыдэнта РБ) разьмясьцілі выставу «Партыя Леніна—Сталіна — арганізатар і натхніцель нашых перамог». На вуліцы Савецкай да Прывакзальнай плошчы (цяпер ад ст.мэтро «Кастрычніцкая» па праспэкце Скарыны да плошчы Незалежнасьці) разьмясьцілі 7 выставаў. Напрыклад, супраць сучаснага гмаху КДБ РБ месьцілася выстава «Ленін і Сталін — стваральнікі Беларускай дзяржавы», крыху далей, супраць сучаснага кінатэатру «Цэнтральны» — «Беларускі народ у Вялікай Айчыннай вайне». Карацей кажучы, гасьцям ды і месьцічам было на што паглядзець, падзівіцца, чым падсілкавацца, бо ў сьвяточныя дні крамы, у якія зьвезьлі з усёй рэспублікі прадукты харчаваньня, працавалі аж да паўночы.

У нядзелю 30 кастрычніка ў Менску адбыўся пяцідзесяцітысячны мітынг, на якім былі кіраўнікі рэспублікі, высокапастаўленыя чыноўнікі, дэпутаты ВС СССР і ВС БССР, дэлегацыі працоўных абласьцей, гарадоў ды вёсак, якіх прывезьлі на юбілей. Увечары прагрымеў сьвяточны салют. Плянавалася ўвечары на паветраным шары падняць у неба асьвечаны пражэктарамі партрэт Сталіна. Сюррэалістычная карціна магла атрымацца: цёмным кастрычніцкім вечарам над паўразбураным Менскам і прыцхілым шматтысячным натоўпам, павольна гойдаючыся, падымаецца ў вышыню падсьвечаны пражэктарамі вялізны партрэт правадыра. Гэта ўразіла б каго заўгодна. Аднак ад гэтай задумкі давялося адмовіцца. Тое, што тэхнічна лёгка ажыцьцявілі ў Маскве, сталася непасільнай тэхнічнай задачай у Менску. Задаволіліся толькі сьвяточным фаервэркам.

Пасьля такога юбілею здавалася б, што і ў наступныя гады сьвята будзе адзначацца 29—30 кастрычніка. Аднак у 1950 г. ЦК КПБ прымае рашэньне сьвяткаваць дзень узьяднаньня… 17 верасьня. Усё вярнулася на кругі свае. І зноў няма адказу, хто і чаму прыняў такое рашэньне, але паўтаруся, што без Крамля тут не абышлося. З 1950 г. і па 1990 г. Беларусь лічыла днём узьяднаньня менавіта 17 верасьня — дзень «вызвольнага паходу Чырвонай Арміі».

У наступныя гады юбілей пачаў спакваля ніякавець. Не ажывіла яго нават 20-годзьдзе. 17 верасьня 1959 г. «Советская Белоруссия» адгукнулася на гэтую падзею толькі невялічкім артыкулам «Квітнее родная Беларусь». У ім падкрэсьлівалася, што «20 год рабочыя і сялянства, працоўная інтэлігенцыя заходніх абласьцей Беларусі, узьяднаныя ў адной сям'і савецкіх народаў, зь вялікім энтузіязмам будуюць новае жыцьцё». І на гэтым усё. Як і не было шумнага сьвяткаваньня 10 год таму.

Падкрэсьлім яшчэ адну акалічнасьць сьвяткаваньня 20-годзьдзя, якая засталася назаўважаная ці яе не пажадалі «заўважыць». Да 20-годзьдзя навуковыя супрацоўнікі Інстытуту гісторыі партыі пры ЦК КПБ М.Арэхва і П.Пышкін падрыхтавалі да друку артыкул «Знамянальная дата ў гісторыі Беларускага народу», у якім у першым абзацы падкрэсьлівалі: «*2 лістапада 1959 г. працоўныя нашай рэспублікі адзначаюць знамянальную дату* (вылучана мной. — ***А.В.***)». На першай старонцы гэтага артыкулу ёсьць аўтограф М.Арэхвы: «Аўтары тады (калі тады? — ***А.В.***) прапаноўвалі адзначаць дату ўзьяднаньня Заходняй Беларусі з БССР 2 лістапада ў адпаведнасьці з пастановай Вярхоўнага Савету СССР. Мікалай Арэхва — заходнік, былы КПЗБовец, быў мудрым, дасьведчаным, з багатым жыцьцёвым і палітычным досьведам чалавекам. Калі ён прапанаваў сьвяткаваць дзень узьяднаньня не 17 верасьня, нават не 30 кастрычніка, а 2 лістапада, то я глыбока перакананы, што ён ведаў словы другога, ня менш вядомага КПЗБоўца — Максіма Танка. М.Танк, 27-гадовы паэт-пачатковец, 3 лістапада 1939 г. запісаў у сваім дзёньніку: «Сэсія Вярхоўнага Савету прыняла Закон аб уключэньні Заходняй Беларусі ў склад СССР і аб'яднаньні яе зь Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай. Гэтую знамянальную падзею ўжо ніколі не выкрасьліць з нашай гісторыі. <…> Я гэтую дату — дату, зь якой мы пачалі звацца людзьмі, — назаўсёды залатымі літарамі ўнёс бы ва ўсе нашыя календа-



**1939 год. Савецкія і нацысцкія афіцэры абменьваюцца вопытам у Берасьцейскай крэпасьці.**



ДОШКА ГОНАРУ

ПЕРАДАВІКІ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА
У ЧЭСЦЬ 32-й ГАДАВІНЫ ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА
І 10-годдзя УЗ'ЯДНАННЯ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

7. Соўгас «Чырвоная зорка» Клецкага раёна Баранавіцкай воблас... А. Ф., сакратар партарганізацыі тав. ...
С... ўся з дзяржавай па хлебаздачы, выка... таў, своечасова, на высокім агратэхні... і паспяхова вядзе зяблевае ворыва... ачна перавыканаў гадавы план





Старшыні Савета Міністраў СССР
таварышу СТАЛІНУ
Іосіфу Вісарыёнавічу

ры, як самае найвялікшае сьвята пасьля Вялікага кастрычніка».

Чаму яны, змагары за нацыянальнае вызваленьне Заходняй Беларусі, чальцы КПЗБ, зьведаўшыя перасьлед, арышты, Лукішкі, лічылі сьвятам узьяднаньня не 17 верасьня, нават не 28—30 кастрычніка, а 2 лістапада? Бо ведалі, інтуіцыйна адчувалі, што 17 верасьня — надта сумнеўная дата, каб казаць аб «нацыянальным узьяднаньні беларусаў», праведзеным па-сталінску. Яны добра ведалі і памяталі, што калі Кампартыя Польшчы (КПП), а гэта значыць і яе «філіі» КПЗБ і КПЗУ, вылучыла лёзунг аб праве нацый на самавызначэньне «ажно да аддзяленьня», а гэта наўпрост датычыла Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, то «крамлёўскі горац» правёў у 1937 г. такое крывапусканьне кампартыям Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны за іх «нацыянальныя памкненьні», што яны аж 19 год не маглі апрытомнець. Толькі ў 1956 г., дзякуючы ў тым ліку і намаганьням таго ж М.Арэхвы, адбылася палітычная рэабілітацыя КПЗБ і КПЗУ. Аднак у верасьні 1939 г. І.Сталін ужо «запамятаў», што ён зрабіў у 1937 г. і, улічыўшы «нацыянальныя памкненьні беларусаў», «вызваліў» іх. Цяпер добра вядома, што «вызваленьне» было другарадным вынікам вялікай геапалітычнай гульні І.Сталіна і А.Гітлера за сфэры інтарэсаў у Эўропе. Аднак М.Арэхва і М.Танк таксама добра ведалі, што частка польскага грамадзтва далёка ня так успрымае падзеі 17 верасьня, як афіцыйная Варшава. Таму і прапанаваў былы КПЗБовец М.Арэхва сьвяткаваць дзень узьяднаньня не 17 верасьня, а 2 лістапада, як больш прымальную ў палітычным і ідэалягічным сэнсе дату. Аднак да яго прапановаў ніхто не прыслухоўваўся, і ўсё пакацілася старой накатанай сталінска-хрушчоўска-брэжнеўскай каляінай.

Апошні раз увагу юбілею надалі з нагоды 30-годзьдзя. 17 верасьня 1969 г. у канцэртнай залі філармоніі адбыўся ўрачысты сход, на якім прысутнічала практычна ўсё партыйна-савецкае кіраўніцтва рэспублікі — П.Машэраў, Ц.Кісялёў, У.Лабанок, І.Клімаў, вэтэраны вайны, дзеячы КПЗБ, дэпутаты ВС БССР, шматлікія госьці. З дакладам выступіў першы намесьнік старшыні СМ БССР У.Лабанок, які прыгадаў, што ў «панскай Польшчы» існаваў жорсткі нацыянальны і сацыяльны прыгнёт беларускага народу, падкрэсьліў, што толькі дзякуючы кіраўніцтву камуністычнай партыі і дапамозе СССР удалося «вызваліць адзінакроўных братоў-беларусаў», распавёў аб посьпехах сацыяльна-эканамічнага і культурнага разьвіцьця заходніх абласцей Беларусі. З нагоды 30-годзьдзя ўзьяднаньня Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КПБ правёў навуковую сэсію, прысьвечаную гэтай даце.

А што далей? А далей гэтае сьвята ціха зьнікла. З агульнарэспубліканскіх сьвят яно было выкрасьлена і набыло статус акадэмічных сэсіяў, якія праводзіліся, галоўным чынам, пад патранатам Інстытуту гісторыі партыі пры ЦК КПБ.

На 40-годзьдзе «Савецкая Беларусь» 18 верасьня 1979 г. адгукнулася невялікім артыкулам доктара гістарычных навук А.Мацко, які паўтарыў паноўны тэзіс аб тым, што «савецкі народ ня мог астацца абыякавым да лёсу сваіх адзінакроўных братоў — беларусаў і ўкраінцаў. Ён падаў ім братэрскую руку дапамогі, узяў пад сваю абарону, выратаваў ад фашысцкага парабашчэньня».

50-годзьдзе на афіцыйным узроўні ўвогуле «не заўважылі». Верасьнёўскія падзеі 1939 г. сталі настолькі «неактуальныя», што галоўная газэта рэспублікі («Советская Белоруссия») ні 17, ні 18 верасьня 1989 г. ні адным радком не згадала аб тым, што ж адбылося 50 год таму.

Аднак напярэдадні юбілею, 14 верасьня, у Менскім гаркаме партыі адбылася сустрэча вэтэранаў КПЗБ (М.Арэхвы, М.Танка ды іншых), якія «выказалі крытычныя заўвагі з нагоды незаслужанага замоўчваньня знамянальнай даты ў жыцьці беларускага народу — узьяднаньня карэнных зямель у адзінай Беларускай дзяржаве». Прапаноўвалася адзначаць дзень узьяднаньня ці 17 верасьня, як гэта і было раней, ці 28 кастрычніка. З гэтай прапановай сакратар Менскага гаркаму партыі У.Галко і зьвярнуўся ў ЦК КПБ. Аднак кіраўніцтва палічыла мэтазгодным адзначаць сьвята 14 лістапада, калі 3-я пазачарговая сэсія ВС БССР (1939 г.) прыняла закон аб «Прыняцьці Заходняй Беларусі ў склад БССР»). 11 студзеня 1990 г. Прэзыдыюм ВС БССР прыняў указ «Аб аб'яўленьні 14 лістапада Днём узьяднаньня Заходняй Беларусі зь Беларускай ССР». Так ужо самі беларусы ў чарговы раз перанесьлі сьвята.

«Новая каманда», што прыйшла да ўлады, таксама спачатку не надавала ўвагі верасьнёўскім падзеям. 60-годзьдзе (1999 г.) магло паўтарыць лёс 50-годзьдзя і літаральна ў апошні момант гісторыкі ды ўлада спахапіліся. У Менску адбылася навуковая канфэрэнцыя, прысьвечаная 60-годзьдзю ўзьяднаньня, Інстытут гісторыі НАНБ выпусьціў неблагі зборнік навуковых працаў «Назаўсёды разам», улада правяла ўрачыстае паседжаньне пад лёзунгам-ідэалягемай «Единство Беларуси, освещенное историей и устремленное в будущее».

Надалей гэтая дата зноўку зьнікае з поля зроку ўлады, гісторыкаў ды грамадзкасьці. А што ж тычыцць сьвята, то ўсё ж у абсалютнай большасьці насельніцтва Беларусі ўзьяднаньне асацыюецца з «вызвольным паходам Чырвонай Арміі», які адбыўся 17 верасьня 1939 г.

Гісторык **Генадзь Сагановіч** пра адну з самых дасканалых перамог беларускай зброі.

# Што вырашыла лёс Клецкай бітвы?

Сёлета 5 жніўня споўнілася 500 гадоў з таго дня, калі пад Клецкам адбылася бітва войска Вялікага Княства Літоўскага з крымскімі татарамі, якую трыюмфальна выйграў князь Міхал Глінскі. У чым было ваеннае і палітычнае значэньне Клецкай бітвы? Чаму яе трыюмфатар перайшоў на службу ў Масковію і ўдзельнічаў у захопніцкіх войнах супраць сваіх суайчыньнікаў? Зь якой прычыны беларускія ўлады цалкам праігнаравалі юбілейную дату? З гісторыкам **Генадзем Сагановічам** гутарыць Міхась Скобла.

**Міхась Скобла: Генадзь, геаграфічнае становішча Беларусі на працягу стагодзьдзяў правакавала войны на восі Ўсход—Захад. А наколькі небясьпечны для Вялікага Княства Літоўскага быў поўдзень? Хто пагражаў адтуль і як?**

**Генадзь Сагановіч:** З поўдня Беларусі стаў пагражаць Крым — Перакопская арда. Адбылося гэта ў другой палове XV ст., пасьля таго, як Крымскае ханства было аб'яднанае пад уладай дынастыі Гірэяў. І калі маскоўскі ўладар Іван III дамогся стратэгічнага ваеннага саюзу з Крымскім ханствам. Для Масквы гэта было вельмі зручна, таму што праз Крымскае ханства Масква стрымлівала Вялікае Княства Літоўскае і Польскае Каралеўства. А для крымскіх ханаў гэты саюз таксама быў стратэгічна важным, бо Масква пагражала і стрымлівала супернікаў Крыму — рэшткі той вялікай Залатой арды: Нагайскую, Заволскую, Казанскую орды. Дамогся саюзу з Крымам Іван III рознымі шляхамі: падарункамі, уладкоўваньнем да сябе на службу ханскіх сваякоў — і саюз гэты выкарыстаў напоўніцу. Ён заўсёды падбухторваў крымскіх татараў рабіць напады на тэрыторыю Вялікага Княства, на Ўкраіну, на Беларусь. Пісаў, каб ішлі да Слуцку, да Пінску — ваяваць незваяваныя землі.



**Генадзь Сагановіч.**

## Хапалі жывы тавар

**МС: Які характар мелі напады крымчакоў на землі ВКЛ?**

**ГС:** Крымскія наезды былі імклівыя. Кожны татарын браў з сабою па трыпяць коняў, каб, дасягаючы непрыяцельскіх земляў, рухацца імкліва, дзень і ноч. Татары хапалі самы на той час важны тавар: людзей і жывёлу, якіх было лёгка даставіць у Крым, бо яны самі рухаліся. Крымчакі проста спустошалі вялікія тэрыторыі, хоць набегі былі кароткія. Таму яны зьяўляліся для нашых продкаў грознай сілай, якая з канца XV ст. вельмі моцна дапякала Вялікае Княства. Напрыклад, у 1505 г. адбыўся крымскі наезд, татары спыніліся лягерам каля Менску і літаральна пустошылі землі ў радыюсе 120 км. Калі верыць нашай Кроніцы Быхаўца, то яны даходзілі да Вільні, Полацку, Віцебску.



**Вывад палону татарамі. Зь сярэднявечнай гравюры.**

## Пяць на пяць

**МС: Карыстаючыся вайсковым тэрмінам, давай правядзём рэкагнасцыроўку на мясцовасьці. Якія сілы былі ў супернікаў падчас Клецкай бітвы? Хто і ў чым меў перавагу і найперш мог разьлічваць на перамогу?**

**ГС:** Агульныя мабілізацыйныя магчымасьці Крымскага ханства на той час былі ня больш за 15 000 вершнікаў. Зыходзячы з тагачасных кронікаў і дакумэнтальных сьведчаньняў — лістоў Міхала Глінскага ды вялікага князя і караля Аляксандра адразу пасьля бітвы — можна сысьціся на тым, што крымскіх наезьнікаў было каля 6 000 — 7 000. Але частка татараў падчас бітвы знаходзілася ў рэйдах, таму ў бітве бралі ўдзел каля 5 000 вояў.

З боку Вялікага Княства сілы былі прыкладна такія ж. Зь ліста каралеўскага сакратара вынікае, што кароль і вялікі князь Аляксандар Казімеравіч зь Ліды пасылаў насустрач татарам 6 000 паспалітага рушаньня. Гэта ў асноўным Гарадзенская, Менская і Наваградзкая харугвы. Трэба сказаць, што рушаньне і на той час ужо было састарэлай формай арганізацыі ўзброеных сілаў.

**МС: Калі параўнаць Клецкую бітву зь бітвай пад Воршай, дзе сышліся ў бойцы больш за 100 000 войска (з абодвух бакоў), то бітва з татарамі выглядае куды больш сьціпла. А як можна рэканструяваць саму батальную сцэну?**

**ГС:** Бітва гэтая сапраўды выглядае сьціпла ў лічбах. Але трэба ўлічваць, што ў палявых бітвах татары нават меншай сілай маглі дамагчыся перамогі, дзякуючы сваёй вялікай рухомасьці. Татарская коньніца была настолькі імклівая, што цяжкая кавалерыя ВКЛ у полі проста гублялася.

Войскам Вялікага Княства кіравалі гетман Станіслаў Кішка і маршалак дворны Міхал Глінскі. Кішка за дзень да бітвы, калі заставалася 20 км да Клецку, нечакана захварэў, і паны-рада вырашылі перадаць галоўнае камандаваньне Глінскаму. Глінскі сапраўды быў тады найлепшай кандыдатурай на такую ролю, паколькі быў вядомы сваім вайсковым майстэрствам і амбіцыяй.

## Глінскі ведаў сваіх

**МС: І якую тактыку выкарыстаў Міхал Глінскі?**

**ГС:** Глінскі адразу вырашыў набліжацца да Клецку ня з боку Наваградку, адкуль ішло яго войска, а з паўднёвага захаду, зь Пінскага тракту, каб адгарадзіць татарам шлях да адступленьня.

Трэба ўлічваць і тое, што Глінскі быў татарынам з паходжаньня, гэта значыць меў уяўленьне пра вайсковую тактыку сваіх супляменьнікаў. Да таго ж, ён служыў і ў Італіі, і ў Нямеччыне, і ў Гішпаніі, а значыць, ведаў і эўрапейскую ваенную тактыку.


**Бітва з татарамі. Дрэварыт з «Трактату пра дзьве Сарматыі» Мацея зь Мехава. 1521 г.**

Глінскі падышоў да татарскага лягеру й вырашыў сходу перапраўляцца праз абалонь рэчкі Лань, якая аддзяляла яго ад татараў.

Татары тым часам апынуліся ў няпростай сытуацыі. З аднаго боку, у іх было сабрана шмат палонных людзей і жывёлы, нарабаванай па розных землях Беларусі (а яны на той час былі ў наезьдзе каля дзесяці дзён). У іх у палоне было каля 40 000 людзей.

## Наваградцы пайшлі першыя

**МС: У чатыры разы больш, чым уласнага войска?!**

**ГС:** Так, яны набіралі палонных значна больш, чым мелі войска. Зьвязаных палонных можна было выводзіць дзясяткамі тысячаў. Перад Клецкай бітвай яны не маглі кінуць сваю здабычу. З другога боку, татары не хацелі кідаць на волю лёсу тыя загоны, якія былі ў разьездах. Таму яны ўсё ж адважыліся даць бітву Глінскаму ў месцы прытоку ракі Цэпры ў Лань. Там узвышша было, з двух бакоў іх абаранялі рэкі. Але татары пазбавіліся галоўнай сваёй перавагі — прасторы, на якой можна было б манэўраваць.

Калі Глінскі сходу пачаў будаваць дзьве гаці, то татары асыпалі яго вояў градам стрэлаў. Каля трох гадзінаў пад татарскімі стрэламі будаваліся гаці. Войска ВКЛ прыкрывалі ўсяго дзьве гарматкі і ручніцы. Пераправа пачалася дзьвюма калёнамі. Правай ішло Наваградзкае паспалітае рушаньне, а левай — Менскае і Гарадзенскае.

На Наваградзкую харугву, якая пераправілася хутчэй, адразу ж навалілася татарская коньніца, і для Глінскага настала адчайнае становішча. Загінула шмат людзей. І тады ён прымае імгненнае рашэньне: сам узначальвае пераправу левай калёны, абыходзіць са сваёй коньніцай татараў і імкліва ўразаецца ім з тылу. Татары расколатыя, яны запанікавалі і пачалі бязладна адступаць, топячыся ў Цэпры.

Бітва была імклівай — пачалася яна апоўдні, а празь нейкую гадзіну татары ўжо ўцякалі.

У гэты час вельмі разумна павялі сябе рэгіянальныя сілы ВКЛ. У прыватнасьці, княжна слуцкая Анастасія мабілізавала сваё баярства і працягвала граміць татараў пад Слуцкам. Дасталося ім і каля Капыля, каля Петрыкава, каля Оўруча. Паводле польскіх краністаў, паводле нашай Кронікі Быхаўца, да Крыму дабралася вельмі нязначная частка татарскіх аддзелаў, у тым ліку сыны Менглі Гірэя — Беці і Бурнаш.

**Працяг на старонцы 34.**

# Што вырашыла лёс Клецкай бітвы?

Працяг са старонкі 33.

## Хуткасьць і слабасьці рушаньня

**МС: Вялікі князь літоўскі на той час моцна хварэў, і войска супраць татараў зьбіралі, як падае «Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі», з «панскіх поштаў і наёмнай коньніцы». Гэта што, паштальёны ішлі ваяваць з крымчакамі?**

**ГС:** «Не, «пошты» (ці «почты») — старабеларускае слова, так называліся прыватныя вайсковыя аддзелы паноў-магнатаў ці князёў, якія валодалі вялікімі надзеламі зямлі і з гэтай зямлі выстаўлялі ўзброеных ратнікаў. У залежнасьці ад колькасьці насельніцтва, якое жыло на гэтай зямлі, — ад гэтак званых «дымоў» ці «службаў». Гэта адпаведная форма арганізацыі земскай службы. У Вялікім Княстве ні да таго, ні пазьней не было рэгулярнай вайсковай сілы. Звычайна зьбіралі шляхцічаў з павету або пошты паноў і князёў. Што было ня вельмі эфэктыўна. Хоць, трэба прызнаць, перад Клецкай бітвай паспалітае рушаньне сабралася надзіва хутка, за чатыры дні. І гэта быў вялікі посьпех.

**МС: А як можна вызначыць значэньне Клецкай бітвы ў беларускай гісторыі?**

**ГС:** Значэньне гэтай бітвы вялікае. І найперш палітычнае. Перамога, поўны трыюмф, разгром пад Клецкам даволі значнага татарскага войска, трацiны ўсіх узброеных сілаў Крымскага ханства, аслабіла сілы Крыму, ён адразу пайшоў на мір. І Менглі Гірэй прыслаў да караля Аляксандра свайго пасла. Праўда, акурат на той час Аляксандар памёр, і ўжо Жыгімонт падпісваў мір з крымчакамі. Крымскае ханства стала саюзьнікам ВКЛ і некалькі гадоў не чапала землі княства.

## Паводле ўсіх канонаў

**МС: Усяго некалькі гадоў?**

**ГС:** Так, бо з 1508 году сытуацыя мяняецца, а ў 1512 годзе Крым разам з Маскоўскім княствам зноў пачынае дзейнічаць супраць Вялікага Княства Літоўскага. Значэньне Клецкай бітвы большае ў палітычным сэнсе, чым у ваенным. Таму што перамога пад Клецкам была першай перамогай над Крымскім ханствам у адкрытай бітве. Раней крымскіх наезьнікаў грамілі толькі даганяючы, у пагоні, і ўсяго некалькі разоў — у 1497-м, у 1503-м. А цяпер упершыню яны былі разгромленыя ў бітве, выкананай па ўзорах антычнага ваеннага майстэрства і ў адпаведнасьці з рэнэсансавай ваеннай навукай. Клецкую бітву параўноўвалі зь бітвай пад Равэнай у 1512 годзе. І перамогу над татарамі мог тады атрымаць менавіта Глінскі. Бо што ў першую чаргу выращыла лёс бітвы? Здольнасьць ваеннага правадыра прыняць у пэўны момант хуткае і трапнае рашэньне. І Глінскі гэта зрабіў.

**МС: Пад Грунвальдам войскам ВКЛ камандаваў Вітаўт Вялікі. У бітве пад Воршай атрымаў вянок пераможцы князь Канстанцін Астроскі. Гэтыя бітвы заслужана ўзьнятыя на шчыт у нашай гістарычнай літаратуры. Можа, Клецкая бітва забытая, бо яе трыюмфатар Міхал Глінскі перайшоў на службу ў Маскоўскае княства? Дык хто ён — герой ці здраднік?**

## Глінскага згубілі амбіцыі

**ГС:** Міхал Глінскі, безумоўна, быў выбітной асобай, якая ня ўпісваецца ў простую, чорна-белую схему. Ён сапраўды быў найбольш таленавітым правадыром, слынным палітычным дзеячам, першым пагромцам татараў. У той жа час ён застаўся ў гісторыі здраднікам, паколькі ў 1508 годзе ўзьняў бунт супраць дзяржаўнай улады і перакінуўся на бок Масквы. Ён самахоць прыняў прапановы Маскоўскай дзяржавы. І разам з маскоўскім войскам спрабаваў браць беларускія гарады і абяцаў, што землі, захопленыя Масквой, ёй і застануцца. Праўда, потым, у 1514 годзе, ён яшчэ раз паспрабаваў зьмяніць свайго ўладара, вярнуцца ў Вялікае Княства Літоўскае — пасьля таго, як ягоныя амбітныя запатрабаваньні не былі задаволеныя Васілём III… Так што асоба Глінскага сапраўды вельмі неадназначная, але адначасова і вялікая.

**МС: Што павінна быць напісана пра Глінскага ў айчынных падручніках па гісторыі?**

**ГС:** У падручніках па гісторыі беларускай сувэрэннай дзяржавы павінна быць аддадзена належнае ягоным вайсковым заслугам, ягонаму ваеннаму таленту. Глінскі ўсё ж дамогся першай перамогі над татарамі. Але ў тым жа падручніку павінна быць сказана, што князь Глінскі здрадзіў свайму ўладару і Вялікаму Княству Літоўскаму і перайшоў на службу ў Маскоўскую дзяржаву, якая ў той час вяла войны супраць Беларуска-літоўскага гаспадарства.

**МС: А што прымушала Глінскагаісьці такімі пакручастымі сьцежкамі?**

**ГС:** Усяго не раскажаш, розныя былі пэрыпэтыі. Амбіцыі гэтага князя, трэба прызнаць, былі не на пустым месцы. Ён сапраўды быў вельмі таленавіты й здольны. Але калі ягоныя дамаганьні не задавальняліся Аляксандрам, а потым і Жыгімонтам, калі яны не давалі яму вышэйшай дзяржаўнай пасады, якую ён хацеў, то Глінскі схіляўся да дэструкцыйных паводзінаў. А тады, у часе Смаленскай вайны, яму не ўдалося перайсьці на бок ВКЛ. Здаўшы Смаленск, Глінскі паслаў лісты вялікаму князю і Канстанціну Астроскаму. Лісты перахапілі маскоўскія шпегі. Васіль III закаваў Глінскага, і ён каля трынаццаці гадоў прасядзеў у турме. Потым атрымаў свабоду, але затым ізноў быў кінуты ў вязьніцу і памёр у маскоўскай няволі.

## Права на славу

**МС: Магчыма, лёс Глінскага — гістарычны ўрок для ўсіх перабежчыкаў і здраднікаў… У Польшчы адзначаюцца на дзяржаўным узроўні ўгодкі Грунвальду. Расея з размахам ушаноўвае Барадзіно. Я разумею, чаму ніколі ня стане дзяржаўнай датай 8 верасьня 1514 году — перашкодзіць заўсёднае наша братаньне з Расеяй… Але чаму беларуская дзяржава нават дзеля прыліку не заўважыла 500-годзьдзя Клецкай бітвы? Ці беларускія ўлады крымскіх татараў асьцерагаюцца пакрыўдзіць?**

**ГС:** Наўрад ці яны думаюць пра крымскіх татараў. Каб толькі Клецкая бітва адпавядала іх інтарэсам, то сьвяткавалі б як мае быць на дзяржаўным узроўні. Але поўным ігнараваньнем гэтага юбілею дзяржава яшчэ раз паказала сваё стаўленьне да беларускай гісторыі ў прынцыпе, да гістарычнай памяці, да гістарычнай спадчыны. Улада, як ужо неаднойчы, прадэманстравала поўны гістарычны нігілізм. Нават бітва пад Грунвальдам, якая і ў савецкі час, і цяпер адпавядае афіцыйнай дзяржаўнай дактрыне, абыходзіцца ўвагай. Улада баіцца любой праявы беларускага патрыятызму. А даўнія перамогі нашых продкаў, бясспрэчна, культывуюць пачуцьце нацыянальнага патрыятызму ў сьвядомасьці нашчадкаў.

*Радыё «Свабода»*

# Львоўская місія «Язафата»

Знойдзены дакумэнт, які пралівае сьвятло на яшчэ адну малавядомую старонку беларускага супраціву ў 1941—1944 г. Пішуць **Сяржук Горбік, Сяргей Ёрш.**

У прыватным архіве аднаго беларускага эмігранта захоўваецца рукапісная копія дакумэнту, які пралівае сьвятло на прычыны арышту немцамі летам 1942 г. экзарха Беларускай Грэка-Каталіцкай Царквы Антона Неманцэвіча. Арыгінал спачатку перахоўваў ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі, пасьля — Усевалад Родзька. У лістападзе 1944 г. у Нямеччыне ён, разам зь іншымі матэрыяламі, перадаў рукапіс Міхалу Вітушку. Надалей яго перахоўваў удзельнік беларускага супраціву, які жыў у Заходняй Нямеччыне. Апошні раз арыгінал дакумэнту бачылі ў 1962 г., менавіта тады зь яго была зробленая рукапісная копія.

Вясной 1942 г. ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі пачаў наладжваць сталую сувязь з украінскім нацыянальным рухам і найперш з Арганізацыяй украінскіх нацыяналістаў на чале з Бандэрам. Ён хацеў дамагчыся вываду ўкраінскіх вайсковых аддзелаў зь беларускай тэрыторыі, а таксама спыненьня «беларуска-ўкраінскіх непаразуменьняў» на Палесьсі. Акрамя гэтага, Гадлеўскі як адзін зь лідэраў беларускага руху супраціву плянаваў дамовіцца з бандэраўцамі аб змаганьні «на два франты»: і супраць немцаў, і супраць саветаў. Дзеля гэтага ён спадзяваўся выкарыстаць свае старыя сувязі зь мітрапалітам Андрэем Шаптыцкім. Аднак паўстала пытаньне з выбарам асобы, якая адправілася б з гэткай далікатнай місіяй у Львоў.

У сярэдзіне траўня 1942 г. адбылася сустрэча ксяндза Вінцэнта Гадлеўскага зь сябрам Беларускай незалежніцкай партыі па мянушцы «Язафат». Апошні быў беларускім уніяцкім сьвятаром і сябрам Экзархальнай рады Беларускага грэка-каталіцкага экзархату. Гаворка ішла аб магчымасьці выкарыстаньня сувязяў айца-экзарха Антона Неманцэвіча для перадачы мітрапаліту Андрэю Шаптыцкаму лістоў Гадлеўскага, а таксама атрыманьня ад яго дапамогі ў справе ўсталяваньня сувязі з кіраўніцтвам АУН(б). Неўзабаве адбылася другая сустрэча Гадлеўскага і «Язафата», на якой прысутнічаў і А.Неманцэвіч. Апошні пагадзіўся дапамагчы «Язафату» выканаць заданьне Гадлеўскага ў Львове. А нагодай для паездкі стаў III Сабор экзархаў, які мусіў адбыцца з 9 па 15 чэрвеня 1942 г.

«Па прыбыцьці ў Львоў, а.Антоні перадаў мне, што сустрэча зь мірапалітам А[ндрэем] Ш[аптыцкім] адбудзецца позна ўвечары 11 числа, — піша «Язафат» у справаздачы Гадлеўскаму ад 29 чэрвеня 1942 г. — Напраўду, вечарам каля 11.30 нас правадзілі да мітрапаліта. Там я, у прысутнасьці а.А[нтонія], перадаў мітрапаліту ліст. Прачытаўшы яго, ён сказаў мне, што сам ён нічога вырашыць ня можа. Але моліцца за мір паміж нашымі народамі і разумее ўсё гора вайны. Таксама ён нагаласіў, што «немцы не прынесьлі таго вызваленьня, на якое мы спадзяваліся». Ліст ён спаліў, але мне сказаў аб спрыяньні сустрэчы з кіраўнікамі АУН.

Паколькі ў Львове гэта рабіць небясьпечна, мітрапаліт запрапанаваў нам выехаць ва Ўніўскі манастыр, куды прыйдуць упаўнаважаныя АУН. Падарожжа адбылося вечарам 12 чэрвеня».Далей «Язафат» распавядае пра тое, як уначы да іх прыйшоў прадстаўнік АУН(б), які назваўся ўпаўнаважаным на перамовы «Цьвякам». Пасьля



**Вінцэнт Гадлеўскі хацеў дамовіцца з украінцамі пра змаганьне і супраць немцаў, і супраць бальшавікоў.**



**Вацлаў Аношка. Магчыма, ён быў таямнічым «Язафатам».**



**Мітрапаліт Андрэй Шаптыцкі маліўся за мір між беларускім і ўкраінскім народамі.**

**Працяг на старонцы 36.**

# Львоўская місія «Язафата»

Працяг са старонкі 35.

гутаркі ўкраінец прапанаваў сьвятарам пайсьці ў лясны лягер і выкласьці прапановы іншым АУНаўскім кіраўнікам. Неманцэвіч адмовіўся, а «Язафат» пайшоў.

«У лягеры мы сустрэлі яшчэ траіх украінцаў, і я пераказаў ім Вашыя прапазыцыі, — піша «Язафат». — Мне адказалі, што таксама рыхтуюцца да агульнага паўстаньня, але крыху пазьней. А нашы просьбы аб вывадзе ўкраінскіх аддзелаў перададуць палітычнаму кіраўніцтву…»

Пасьля гэтага яго правялі да манастыра, адкуль ён разам зь Неманцэвічам выехаў у Львоў. Там «Язафат» зноў сустрэўся з Шаптыцкім, распавёў аб падарожжы, атрымаў ліст да Гадлеўскага.

Аб тым, што летам 1942 г. уначы ў манастыр прыяжджалі «два беларускія сьвятары», аднаму з аўтараў гэтых радкоў у ліпені 2003-га распавядаў найстарэйшы герамах-студыт а.Гедыён.

Праз некалькі тыдняў пасьля вяртаньня беларускіх сьвятароў у Беларусь, у менскае гестапа і СД з райхскамісарыяту «Ўкраіна» паступіла інфармацыя, што падчас працы Львоўскага сабору экзархаў А.Неманцэвіч вёў, пры пасярэдніцтве мітрапаліта Шаптыцкага, перамовы з АУН(б) аб супольнай антынямецкай барацьбе. Паведамлялася, што Неманцэвіч пагадзіўся выконваць ролю сувязнога паміж групай Гадлеўскага і АУН і што ён займае высокае становішча ў беларускім нацыянальным руху супраціву. Апошняе не адпавядала сапраўднасьці. Нямецкія спэцслужбы сачылі за Неманцэвічам у Альбярціне, але гэта не дало плёну. Тады з Бэрліна прыйшла санкцыя на допыт, а калі спатрэбіцца — і арышт Неманцэвіча. Яго арыштавалі і даставілі ў Менск. Экзарх Антон Неманцэвіч ня выдаў ані Гадлеўскага, ані сябра Рады Экзархату і адначасова сябра БНП па мянушцы «Язафат». Ён памёр у зьняволеньні 6 студзеня 1943 г. у Менску.

Можна меркаваць, што пад мянушкай «Язафат» схаваўся айцец Вацлаў Аношка. Летам 1944 г. ён выехаў у Польшчу. Памёр уніяцкі сьвятар 2 лютага 1966 г.

Вянок памяці

...Пайшлі з жыцьця людзі,
якія пакінулі па сабе
сьветлую памяць,
якіх будзе не хапаць вам,
якіх ня будзе хапаць
Беларусі...

Раскажыце пра іх слухачам Свабоды.

Званіце: (017) 290 39 52
Пішыце: п/с 111, Менск, 220005

радыё свабода
www.svaboda.org

# Палалі

Марозным студзеньскім днём 1943 г. партызаны Кіраўскага атраду Расонскай брыгады імя Сталіна сабраліся на пастраеньне. Рапартаваць выпала каржакаватаму мужчыну, які і раней крыху заікаўся, а цяпер у бедалагі, апрача «т-т-т, к-к-к», нічога з вуснаў не выходзіла. Таварышы тады параілі прасьпяваць гэныя словы, і ён засьпяваў:

— Таварыш камандзір, казармы гараць! Нам трэба адступаць.

Зрэшты, пастраеньне было фармальнасьцю. І так было відаць, што казармы гараць. Чорны дым шугаў высока ў неба, языкі полымя прабіваліся з вокан і даху. Іскры падалі ў роў, на дне якога пад сьнежным покрывам і лёдам працякаў ручай Сьмерд, які тут жа, у вёсцы Саколішча, упадаў у рэчку Нішчу.

Падпаліць казармы загадаў сам камандзір атраду — надоечы пасыльны са штабу брыгады прывёз загад: спаліць, каб не засталіся ворагу. На Расонскі партызанскі край сунуліся дзьве карныя экспэдыцыі. Адна — з чыгуначнай станцыі Дрэтунь, другая — зь Себежу. Каб прыпыніць іхняе нашэсьце, у партызанаў было нямала сіл — пяць тысяч ваяроў. Праўда, ваякі 7-й і 11-й калінінскіх брыгад (яны прыйшлі з Калінінскай вобласьці і знаходзіліся ў вёсках паблізу Расон) аказаліся няважныя. Іх баяліся пусьціць у бой, бо пры першай сутычцы з ворагам маглі разьбегчыся. Камандаваньне гэтых расейскіх брыгад толькі й чакала аказіі, калі можна было б адправіць свой кантынгент за фронт, у Чырвоную Армію.

Своеасаблівую дапамогу расонскім змагарам аказалі латыскія партызаны. На дзесяцёх санях з новенькімі аўтаматамі, кулямётамі і гранатамі яны прымчаліся напярэймы карнікам, якія наступалі з боку Себежу. У занесенай сьнегам канаве занялі паміж вёскамі Прахорава і Паўлава абарону з разьлікам «ні кроку назад». Ваяўнічы дух ад латышоў перадаўся нашым партызанам. Яны выкацілі зь лесу гармату і прамой наводкай падбілі танк, які суправаджаў экспэдыцыю. Наступ карнікаў захлынуўся. Вораг адступіў.

Так што яўна пасьпяшаліся партызаны спаліць раскошныя, цёплыя казармы, пабудаваныя немцамі (з прыцягненьнем мясцовых мужчынаў) яшчэ ўвосень 1941 г. Цяпер атрад імя Кірава вымушаны быў перасяліцца ў цагляную будыніну, што каля вёскі Янкавічы. А гэта за дзе-



Нямецкія жаўнеры і цывільнае насельніцтва. Вёска Шацілава (Полаччына). 1941 год.

# пажары

сяць кілямэтраў ад Сакалішча. Партызаны-кіраўцы ўжо ня будуць мець магчымасьці часта наведваць свае сем'і.

Партызанскае камандаваньне чамусьці лічыла, што карнікі адначасова будуць наступаць на Расонскі раён і з боку Полацку. Таму было дадзена заданьне кіраўцам перакрыць бальшак, які вёў з Полаччыны ў Сакалішча, дрэвамі. Сьпілоўваліся высокія яліны і сосны так, каб яны падалі на шлях.

Да лесарубаў пад'ехалі на лыжах у масхалатах кадравыя партызаны. Такімі называліся тыя, хто перад самай вайной служыў у войску і меў баявую вывучку. Яны крыху звысоку глядзелі на партызанаў, якія дагэтуль і пры савецкай, і пры нямецкай уладзе толькі й ведалі што корпацца ў зямлі. Некаторыя з кадравікоў былі аматарамі моцна мацюкнуцца.

— Здарова, мужыкі, такую вашу растакую! Завалілі дарогу, а нам цяпер круціся каля пнёў.

— А куды сьпяшаецеся?

— Ёсьць заданьне. Спаліць гарадок.

— Спаліць?!

— А што? Чаго насы павесілі?

— Мы там нядаўна жылі.

— А й праўда… Але нічога не папішаш. Заданьне ёсьць заданьне. Так што не крыўдуйце й не кляніце… Ну, мы паехалі.

Гаворка ішла пра ваенны гарадок (кодавая назва «6-ты ўчастак»), пабудаваны каля вёскі Ўладычына на пачатку 1930-х ва ўмацаваным раёне, які цяпер модна зваць «Лініяй Сталіна». Тут, на ўзьлесьсі, былі прасторныя казармы для чырвонаармейцаў і камандзіраў, інтэрнат для іх сем'яў. Воданапорная вежа, сталоўка, склады, канюшня… Усё было збудавана з тоўстых хвояў і ялін.

Гэтыя дыхтоўныя памяшканьні з дазволу нямецкай улады занялі ў ліпені 1941 г. вяскоўцы, у якіх у выніку баёў згарэлі хаты. Восеньню наступнага году мужчыны пайшлі ў партызаны, а за імі неўзабаве вымушаны былі перасяліцца на Расоншчыну іхнія сем'і. Гарадок апусьцеў. І вось зусім зьнік зь зямлі. Засталіся попел ды абгарэлая цэгла.

Падобны лёс яшчэ раней напаткаў гарадок («7-мы ўчастак»), які знаходзіўся ў разрэджаным лесе паблізу вёскі Лісуны. Доўга гарэлі смалістыя бярвёны. Уначы небакрай набываў барвова-злавесную афарбоўку. Гэта ўжо справа іншых партызанаў, з брыгады «За Савецкую Беларусь» (пазьней, у сакавіку 1943 г., перайменаваную ў брыгаду імя Ракасоўскага, дзе камісарам быў Пятро Машэраў, у пэрспэктыве першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі).



Савецкі плякат 40-х гадоў.

Першае зьяўленьне ўлетку 1942 г. партызанаў гэтай брыгады ў маёй мясцовасьці адзначылася разгромам сэпаратарнага пункту ў вёсцы Сякі. Ушчэнт былі разьбітыя апараты, а на дзьвярах прыклеена папера са словамі: «Пейте, девки, сами молоко. Красные недалеко».

Неўзабаве, у жніўні, гэтая брыгада пасьпяхова правяла буйную апэрацыю, якая прынесла ёй заслужаную славу. Быў падарваны чыгуначны мост цераз раку Дрысу на Банілаўскім разьезьдзе, у выніку чаго рух цягнікоў спыніўся на тры тыдні.

Але зь песьні слова ня выкінеш. Былі й неразумныя дзеяньні. Тыя ж бяз дай прычыны падпалы, пажары, якія не наносілі ворагу шкоды, а партызанам не прыбаўлялі славы. Зрэшты, пра гэта ў сваіх успамінах апошнія лічылі за лепшае прамаўчаць.



Нямецкі плякат 40-х гадоў.

**Мікола Бадзюкоў, в.Уладычына**

Радыё Свабода

**Не прасьпі!**
**07.00–08.00** – навіны, рэпартажы, надвор'е, музыка – вельмі жывы эфір!

**Не прапусьці!**
**18.00–23.00** – кожная першая паўгадзіна – усё пра сёньня. Кожная другая – крыху пра вечнае!

**Не засьні!**
**23.00–24.00** – госьці, агляд блогаў, начныя досьледы, чытанка – яшчэ сёньня!

Кароткія хвалі **19**, **31**, **41** м, сярэднія **612** кГц

радыё свабода
www.svaboda.org

# Краязнаўчыя падарожжы

**Чыгрын, Сяргей. Пакліканыя на родны парог: Гісторыка-краязнаўчыя артыкулы.** — Менск: Беларускі кнігазбор, 2005. — 96 с.

Кніжка краязнаўца і журналіста са Слонімшчыны складаецца з нарысаў пра сямнаццаць постацяў цікавых людзей, якія нарадзіліся на Слонімшчыне альбо так ці іначай павязаныя з гэтым краем. Адзін эпізод з жыцьця вельмі арыгінальнага крытыка і бібліёграфа Яўгена Хлябцэвіча практычна стаў эпіграфам да зборніка. У 1915 г., у часе масавых прымусовых эвакуацыяў мірнага насельніцтва перад наступам кайзэраўскіх войскаў, брат Уладзімер Хлябцэвіч пісаў свайму брату Яўгену: «Усе сёлы гарэлі пры непрысутнасьці нашых людзей. Кнігі (10 скрыняў) закапаны ў вельмі надзейным месцы. Там тваё ўсё... Твае рукапісы пра беларускіх пісьменьнікаў і лісты іх тожа былі схаваныя там, у скрынях. Я знаю дзе...» Гэтыя скрыні ў вёсцы Кленікі на Беласточчыне шукалі ўжо ў наш час шмат гадоў, але безвынікова.

Цёплы нарыс пра славутага беларускага краязнаўца Генадзя Каханоўскага, што завяршае кніжку, падаўся мне сымбалічным. Свойчас спадар Генадзь узначальваў Беларускае таварыства краязнаўцаў. Сяргей Чыгрын піша: «Праводзіліся зьезды, канфэрэнцыі, сустрэчы — адным словам, вялася пэўная работа. Ці існуе сёньня ў нашай дзяржаве краязнаўчае таварыства? Хто яго ўзначальвае і што яно робіць? Я, шчыра кажучы, ня ведаю. А Генадзь Каханоўскі добра ведаў усіх краязнаўцаў краіны...»

І тут прыгадалася — я ж таксама браў удзел ва ўстаноўчым зьезьдзе Беларускага таварыства краязнаўцаў і таксама нічога не магу сказаць пра цяперашні лёс гэтай арганізацыі. Але зусім ня можна сьцьвярджаць, што краязнаўства ў Беларусі сканала. Больш за тое, у розных рэгіёнах краіны зьявіліся мясцовыя выдавецкія ініцыятывы краязнаўцаў. Іхныя кніжкі, часам досыць сьціплыя паліграфічна, дапамагаюць мясцовым грамадзкім камунікацыям ды пашыраюць інфармацыю ў эпоху, калі ўжо ня кожная газэта зь Менску трапіць да падпісантаў.



Слонімскі леў.

**Здановіч, Іван. Рупліўцы беларускага нацыянальнага адраджэньня з Пружаншчыны: Грамадзка-літаратурны даведнік.** — Пружаны, 2003. — 144 с.

Краязнаўчы даведнік пра рэгіён ля Белавескае пушчы, які падзяляецца на дзьве адметныя часткі поймай ракі Ясельда ды Ружанскай пушчай. Старыя людзі, якія жывуць у вёсках на правым беразе Ясельды, яшчэ і сёньня «ружанскіх» пружанцаў называюць ліцьвінамі, а сябе — палешукамі.

У даведнік трапілі ня толькі постаці, што практыкуюць са словам, але і народныя майстры. Аповед пра ганчара Антона Такарэўскага (1904—1984) мяне папросту захапіў. Майстра, добра вядомы сярод цікаўных да матэрыяльнай культуры Беларусі сваёй чорнадымлёнай керамікай, увесь час меў праблемы зь нядобразычлівымі ўладамі — за «польскім часам» у яго адбіралі патэнт, а ад прыдзірлівых савецкіх фінансавых інспэктараў не было ратунку. Прыходзілася пэрыядамі падпольна круціць ганчарнае кола. Але даў зарок: «Пчол не зьвяду, пакуль жывы буду, а гаршкі ня кіну рабіць, пакуль рук не складу!»

**Малое Палесьсе: Краязнаўчы альманах [Крупкі].** Выпуск другі, вясна 2004. — 87 с.

Альманах выдаецца харугвай скаўтаў «Малое Палесьсе». Тут зьмешчаныя тэксты ня толькі клясычнага краязнаўчага жанру, але таксама суб'ектыўныя нататкі, як «Агляд культурнага жыцьця» ў Беларусі Алеся Пушкіна. Гэты арыгінальны і бунтарны мастак і сам жыве на бацькаўшчыне — у мястэчку Бобр на Крупшчыне. Між іншым, у альманаху рэпрадукуецца росьпіс А.Пушкіна «Паляваньне на Беларусі», зроблены ў адным зь лясьніцтваў. «Гэты росьпіс, дзе ў добрай рэалістычнай манеры паказаныя ўсе віды паляваньня ў нашых краёх — ад старадаўніх часоў аж да найсучасьнейшых». Адзін з фрагмэнтаў росьпісу прысьвечаны сучаснаму паляваньню ды адлюстроўвае падзеі пасьля рэфэрэндуму 1996 году пра зьмену сымболікі, калі «колішні старшыня Крупскага раённага таварыства паляўнічых Мікалай Кляшчонак ірваў бел-чырвона-белыя штандары на сьцяжкі для паляваньня на ваўкоў...» Няма на іх Мюнхгаўзэна! Барон уважаў паляваньне за высакародны занятак.

**ADz**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Возера Сялява — дыямэнт Малога Палесься.

# Кніга назіральніка за рэвалюцыямі

Калі нарвэскі Нобэлеўскі камітэт аддасьць сёлетнюю Прэмію міру беларусу, гэтая кніга адразу стане бэстсэлерам. Бо яе аўтар, Алесь Бяляцкі, — першы беларус, які на тую прэмію вылучаны. Беластоцкія беларусы выпусьцілі кнігу беларускага праваабаронцы Алеся Бяляцкага «Прабежкі па беразе Жэнэўскага возера». Кніга складаецца зь некалькіх дзясяткаў эсэ, напісаных падчас шматлікіх замежных падарожжаў і ў часе працы на Бацькаўшчыне.

У эсэ, што дало кнізе назву, адчуваецца лёгкі прысмак шпіёнскага раману: вядзецца пра тое, як беларускі праваабаронца на чарговай сэсіі Камісіі па правах чалавека ААН у Жэнэве спрыяў прыняцьцю адмысловай рэзалюцыі па Беларусі. Увесь час ягонымі сьлядамі ішлі чальцы афіцыйнай дэлегацыі з выпраўкай супрацоўнікаў КДБ і выпярэджвалі кожнае ягонае дзеяньне і сустрэчы.

Алесь Бяляцкі за апошнія гады пабываў ва ўга колькіх пераплётах. У адным Азэрбайджане аўтар правёў гарачыя дзянькі дзьвюх выбарчых кампаній у асяродку тамтэйшай дэмакратычнай апазыцыі, стаўшы сьведкам дзьвюх нязьдзейсьненых рэвалюцый. Двое сутак праседзеў у двухпакаёўцы апазыцыйнага кандыдата Ісы Гамбара, сьцерагучы яго ад арышту. «Прабежкі» ілюстраваныя фатаздымкамі зь месца падзеяў: Баку, Кракава, Беластоку...


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Пішучы пра становішча з правамі чалавека ў розных краінах, дзе давялося назіраць за выбарамі, стваральнік праваабарончага цэнтру «Вясна» заўсёды параўноўвае яго зь беларускімі рэаліямі. Так, А.Бяляцкі **(на фота)** выказвае цікавую думку наконт таго, што вайна ў Чачэніі адцягнула ўвагу Расеі ад Беларусі. На ягоную думку, гэта ўратавала нас ад анэксіі ў 90-я. Вось ён, кантэкст беларускай палітыкі.

Няясна, праўда, чаму пад адной вокладкай злучаныя падарожныя нататкі і артыкульчыкі «на злобу дня». Том выходзіць таўсьцейшы, але зблытаны. Падкачала й карэктура: пісьменьнік павінен-такі правільна пісаць назву краіны Кот-д'Івуар ці Шырын Эбадзі.

Але як жанр кнігі падарожных эсэ беларускай літаратурай добра падзабыты з часу, калі савецкіх пісьменьнікаў прэміравалі паездкамі на сэсіі ААН і ў круізы па Брахмапутры, то на дробныя ляпсусы не зважаеш, бо кніга чытаецца лёгка, а пасьля яе доўга думаецца. А што яшчэ трэба ад добрай кнігі?

Алесь Бяляцкі: Чачэнія ўратавала Беларусь ад анэксіі

**СП**

**Бяляцкі, Алесь. Прабежкі па беразе Жэнэўскага возера.** — Беласток, 2006.

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Катэхізіс: Помнік беларускай Рэфармацыі XVI ст.** / Адапт. тэкст, пер. з старажытнабел. мовы Н.Кабелка; Укл. С.Акіньчыца. — Менск: Юніпак, 2005. — 312 с.

Сучаснае менскае выданьне стала трэцім для Катэхізісу Сымона Буднага. Першае зьявілася ў Нясьвіжы ў 1562 г., а другое — у Стакгольме ў 1628 г. Ідэя новай публікацыі гэтага рэлігійнага помніка паўстала ў 2002 г. падчас сьвяткаваньня 450-годзьдзя Рэфармацыі ў Беларусі — менавіта тады была запланаваная падрыхтоўка адаптаванага сучаснымі літарамі старабеларускага арыгіналу ды перакладу яго на сучасную беларускую літаратурную мову. Вось гэтыя два тэксты і складаюць зьмест кнігі. Праўда, у выходных зьвестках не пазначаны аўтар Катэхізісу XVI ст. Пра Сымона Буднага ды ягоных выдавецкіх кампаньёнаў Мацьвея Кавячынскага і Лаўрэнція Крышкоўскага распавядаецца толькі ў прадмове.

У 1578 г. Сымон Будны напісаў «Кароткія нататкі пра хрышчэньне дзяцей», дзе, у прыватнасьці, распавёў пра спробы ўціску пратэстантаў у Вільні, Клецку, Нясьвіжы… Нечаканыя паралелі з пачаткам XXI ст. нараджаюцца тут: «Як відаць, усе верныя служыцелі або былі зь Літвы выгнаныя, або з добрай волі ехалі, як паведамлялася, у Польшчу і на Валынь. Таму і Царква была невялікая, і да Сьвятога Хросту толькі цяпер, у Лоску, 18 траўня 1578 году, дайшло».

**Саксонскае Люстра: помнік прававой думкі Германіі XIII ст.** / Пер. са старажытнаням. і лац. моў, прадм. і камэнт. Вольгі Келер. — Менск: Медысонт, 2005. — 174 с., [24] арк. іл.

Упершыню па-беларуску выдадзены помнік сярэднявечнага нямецкага права, вядомы пад назвай «Саксонскае Люстра». Чаму люстра? Бо гэта было нібыта тэкставым адлюстраваньнем звычаёвага права. «Саксонскае Люстра» мае досыць важнае значэньне для беларускай гісторыі — менавіта на гэтым зборы законаў у значнай ступені заснавана Магдэбурскае гарадзкое права, а горад Магдэбург першапачаткова стаў цэнтрам пашырэньня «Саксонскага Люстра».

«Ніхто ня можа адмовіцца ад права ні праз каханьне, ні праз гора, ні праз пагрозу, ні праз падарунак. Сам Бог — гэта права. Таму для яго права такое дарагое. І таму ўсе, каму Богам дадзена зьдзяйсьняць суд, павінны імкнуцца судзіць такім чынам, каб Божы гнеў і Суд былі б да вас добразычлівымі» (з пралёгу да «Саксонскага Люстра» Айке фон Рэпкава, Нямеччына, XIII ст.).

**Архіварыюс: Зборнік навуковых паведамленьняў і артыкулаў. Выпуск 3.** — Менск: Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, 2005. — 200 с.

**Мікуліч, Аляксей. Беларусы ў генэтычнай прасторы: Антрапалёгія этнасу.** — Менск: Тэхналёгія, 2005. — 138 с., іл.

**Мовы Вялікага Княства Літоўскага.** Матэрыялы IV Міжнароднай навуковай канфэрэнцыі (Берасьце, 18—19.05.2004). — Берасьце: Акадэмія, 2005. — 255 с.

**Рыльке, Райнэр Марыя. Кніга гадзін** / Пер. В.Сёмухі. — Менск: З.Колас, 2005. — 160 с.

**Чантурия, Ю.В. Градостроительное искусство Беларуси второй половины XVI — первой половины XIX вв.: Средневековое наследие, Ренессанс, барокко, классицизм.** — Минск: Белорусская наука, 2005. — 375 с.

**Алег Дзярновіч**

# Дарослым і дзецям – гольфстрымскі «Шрэк»

Зьяўленьне беларускамоўнага Шрэка ёсьць доўгачаканай і неабходнай дывэрсіяй у тутэйшай мэдыйнай прасторы.

Балотны хуліган з добрым сэрцам выдатна ўпісваецца ў мясцовыя рэаліі. З дубляжом «Шрэка-2» на беларускую мову выступіла «Ініцыятыва «Беларускі Гольфстрым».

Акторы для дубляжу падабраныя вельмі трапна, што сталася ўжо маркаю «Беларускага Гольфстрыму». Аляксандар Памідораў — ідэальны Шрэк, Ягор Маёрчык — Асёл, Юрась Жыгамонт — Кот у ботах, Хросная Фэя — Людміла Шпілеўская, Макс Івашын — кароль, а абавязкі каралевы ўзяла на сябе сьпявачка Руся.

Выглядае, нібыта героі ад самага пачатку былі беларускамоўныя, свае ўшчэнт, тутэйшыя, — і гэта ёсьць пер-



шай дывэрсіяй «зялёнага» партызана.

Перакладчыца Вольга Калацкая і рэдактар Зьміцер Саўка зрабілі ангельскамоўныя жарты натуральнымі й даступнымі для шырокага гледача. І гэта ёсьць другою дывэрсіяй людажэра Шрэка.

Аляксандар Памідораў, рэжысэр дубляжу Сяргей Патаранскі і кіраўнік праекту Франак Вячорка адаптавалі пераклад да мясцовых рэаліяў — і гэта самая скандальная, але й супярэчлівая дывэрсія дубляжу.

Так, Нацыянальны аркестар пад кіраўніцтвам Фінбэрга (у фільме — каралеўскія глашатаі) і паліцыйная перадачка пад «Панараму» — гэта трапна й сьмешна.

А вось пераўтвараць карчму «Атрутны яблычак» у рэстарацыю «Грунвальд», а «кніжку жахаў» у гісторыю Беларусі — ня лепшая думка дый стрэл у «малако». «Шрэк» — і так парадыйны, дадаваць у яго «гоблінскія» камэнтары варта зь вялікаю асьцярожнасьцю.

Але сваю дывэрсійную ролю Шрэк выканаў. Аграмадны, зялёны, дасьціпны — выліты Аржамень.

Публіка патрабуе яшчэ.

**Андрэй Расінскі**

# «Бярозка» й «Раніца» пад падвойным кантролем

«Бярозка» й «Раніца» выходзяць. Але іх мала хто бачыць, бо яны не прадаюцца ў кіёсках.

Два афіцыйныя выданьні для моладзі ўваходзяць у голдынг з «Настаўніцкай газетай». І «Раніцу», і «Бярозку» рэдагуе Сьвятлана Яскевіч. Некалькі гадоў таму выданьні мелі праблемы з друкам, цяпер усё нармальна.

Пад глянцавай вокладкай «Бярозкі» — наклад яе крыху большы за тысячу — хаваецца разнастайны матэрыял для падлеткавай аўдыторыі. Тут і «камputарная» старонка, і парады модніцам і тым, хто зьбіраецца стаць тэлевізійным вядоўцам. Ёсьць рэцэнзіі на кніжныя і кіношныя навінкі, а таксама старонка для маладых літаратараў. Належная ўвага надаецца праблеме каханьня і рок-музыцы. На апошняй старонцы зьмешчаны беларускамоўны сканворд.

Зьдзівіла хіба гутарка з расейскамоўным пісьменьнікам Валянцінам Масьлюковым, які працуе ў жанры фэнтэзі. У матэрыяле ён называўся — ні многа, ні мала — беларускім Толкіенам.

Газэта «Раніца» значна саступае «Бярозцы» ў якасьці друку, дый падборка матэрыялаў тут слабейшая. Чаго толькі варты матэрыял з «Славянскага базару» пад загалоўкам «Гонар славянскіх народаў» і з фатаздымкам Алы Пугачовай. Але і ў газэ-




це маладзёны знойдуць цікавую для сябе інфармацыю: розныя мэдычныя і псыхалягічныя парады. Тыраж «Раніцы» — каля 2500 ас.

Гэта ня дзіва: абодва выданьні ўнікаюць «вострых», спрэчных тэмаў, самых цікавых для моладзі. Да таго ж, абодва выданьні не прадаюцца ў шапіках, распаўсюджваюцца толькі праз падпіску. Між тым моладзь зусім адвыкла што-кольвек падпісваць. Дзяржава не абмяжоўваецца кантролем за зьместам выданьняў, яна яшчэ й трымае іх на фінансавым кручку ведамаснай падпіскі. У выніку выданьні ліпеюць, а моладзь далей русіфікуецца.

**Зьміцер Панкавец**

Твая Свабода
Навіны, аналітыка, культура **без цэнзуры**

| час | хвалі |
|---|---|
| **06.00-08.00** | **31** м **41** м |
| **18.00-20.00** | **19** м **31** м |
| **20.00-22.00** | **19** м **41** м |
| **22.00-24.00** | **31** м **41** м |

Сярэднія хвалі **612** кГц

**радыё свабода**
**www.svaboda.org**

# Папа ў Баварыі: Сьвету патрэбны Бог

Сьвету патрэбны Бог — заклікаў у Мюнхэне папа і папракаў немцаў у малавернасьці.

Суайчыньнікі радасна віталі Бэнэдыкта, але гэта цяжка параўноўваць з энтузіязмам, які выклікаў Ян Павал II у Польшчы.

Гэта была першая вялікая імша Бэнэдыкта XVI у роднай Баварыі. Нядзельнае казаньне, якое слухала больш за 250 тыс. чалавек, што сабраліся на гандлёвай тэрыторыі *Neue Messe*, папа распачаў прызнаньнем: «Я цешуся, што яшчэ раз магу быць з вамі, што яшчэ раз магу наведаць блізкія мне мясьціны. Я ўдзячны Богу за гэтую цудоўную радзіму».

## Самае галоўнае — гэта вера

— У нашыя часы мы пакутуем ад таго, што недастаткова прыслухоўваемся да Бога. Мы ўжо ня здольныя Яго слухаць — у нас занадта шмат іншых частотаў у вушах. Тое, што пра Яго кажуць, падаецца састарэлымі ведамі, што не пасуюць да нашага часу, — казаў Бэнэдыкт XVI.

Зьвяртаючыся да немцаў, ён хваліў гатоўнасьць нямецкага Касьцёлу да сацыяльнай дапамогі (менавіта ў Нямеччыне дынамічна дзейнічаюць дабрачынныя арганізацыі), аднак крытыкаваў той погляд, што пытаньні сацыяльнай дапамогі больш важныя за веру. І нагадаў, што нельга аддзяліць грамадзкія справы ад Эвангельля, а «аднаго толькі ўнясеньня людзьмі ведаў, уменьняў і веданьня тэхнікі занадта мала».



AP

**Бэнэдыкт XVI на радзіме.**

У якасьці прыкладу папа прывёў пытаньне барацьбы са СНІДам у Афрыцы, якое трэба ўзьняць «ад каранёў гэтай хваробы». Такім чынам папа зьвярнуўся да дыскусіі вакол спрэчак у Ватыкане пра магчымае дапушчэньне прымяненьня прэзэрватываў у выпадку сямейных параў, дзе адна асоба заражаная ВІЧ-інфэкцыяй.

Бэнэдыкт XVI заклікаў да талерантнасьці і павагі да іншых культураў, што будзе магчымым толькі тады, калі хрысьціяне паглыбяць сваю веру. Разам з тым ён падкрэсьліў: «Мы нікому не навязваем гэтай веры, гэткі від празэлітызму чужы хрысьціянскім каштоўнасьцям. Мы заклікаем людзей у вольнасьці паядноўвацца з Богам. Мы не парушым павагі да іншых рэлігіяў і культураў, павагі да іх веры, калі гучна і ясна вызнаем Бога».

## Цудоўна, што Ты тут з намі

Немцы прынялі папу сардэчна, казаньне некалькі разоў перапынялі воплескі, аднак цяжка казаць пра энтузіязм, які быў у Польшчы, калі туды прыяжджаў Ян Павал II.

Па абедзе Бэнэдыкт XVI блаславіў жыхароў Мюнхэну з балькону сваёй рэзыдэнцыі. «Калі я быў арцыбіскупам Мюнхэну, то кожны год з нагоды пачатку сьвята піва *Oktoberfest* бласлаўляў яго ўдзельнікаў. Я цешуся, што апынуўся на старым месцы працы», — казаў ён. Аднак да спантаннага дыялёгу папы з суайчыньнікамі справа не дайшла.

Італьянская прэса падкрэсьлівае, што папа трымае сябе значна больш свабодна на радзіме, чым звычайна. «Прыемна было бачыць, як ён усьміхаўся ў адказ на сьмех натоўпу», — піша ў *Corriere della Sera* ватыканіст Люіджы Акатолі.

Папа зьявіўся на першых палосах усіх нямецкіх газэтаў. «Бэнэдыкт XVI, мы цябе любім», — вызнаў бульварны *Bild*. Крытычная адносна Касьцёлу *Süddeutsche Zeitung* дае свайму артыкулу загаловак «Добра, што ты тут з намі».

Бэнэдыкт не хаваў сваёй узрушанасьці. Ужо на борце самалёта ён прызнаўся, што хацеў бы часьцей наведваць радзіму. «Я стары чалавек. Ня ведаю, колькі часу мне яшчэ падорыць Бог».

Бэнэдыкт XVI выразна даў зразумець, што прыяжджае з пасланьнем, каб усе яго суайчыньнікі перадавалі хрысьціянскую веру наступным пакаленьням. Нямеччына — вельмі сьвецкая краіна: штогод Каталіцкі Касьцёл пакідае каля 100 тыс. вернікаў.

У суботу пасьля абеду вуліцы сталіцы Баварыі, якімі праяжджала машына папы, пачалі запаўняцца. Луналі бела-блакітныя баварскія сьцягі. Сапраўды гарачае прывітаньне папы было падрыхтаванае на Марыйнай плошчы, дзе сабраліся каля 15 тыс. чалавек. Бэнэдыкт XVI параўнаў сябе зь легендарным мядзьведзем сьвятога Карбініяна, першага біскупа Фрайзінгу. Зьвер ішоў навючаны праз Альпы ў Рым і там быў вызвалены. «На жаль, у маім выпадку Бог вырашыў інакш», — пажартаваў папа.

Кардынал Мюнхэну Фрыдрых Вэтэр шмат казаў пра тое, што зьвязвае Бэнэдыкта з Баварыяй, і дзякаваў, што папа застаўся *civis bavaricus*, баварцам.

А папа ўсё ня мог расстацца зь вітаньнямі натоўпу і спазьніўся на спатканьне з прэзыдэнтам Хорстам Кёлерам і канцлерам Ангелай Мэркель.

У размове з вока на вока спадарыня канцлер заявіла, што падчас старшынства Нямеччыны ў Эўразьвязе ў 2007 г. яна закране справу запісаньня хрысьціянскіх каштоўнасьцяў у эўраканстытуцыю. Гэтую тэму яна ўздымае ўжо другі раз — у жніўні Мэркель размаўляла пра гэта з Бэнэдыктам XVI у Ватыкане. З Кёлерам, які, гэтак жа як і Мэркель, пратэстант, папа вёў дыскусію пра экумэнізм.

**Вольга Данішэвіч паводле gazeta.pl**

## СЯРГЕЙ ВІТУШКА

ZAHADKA
Cicha taje taja tajamnica.
Jana cicha taje i źnikaje.
Kali chto byvaje nazyvaje
Navat cicha toje słova... (cicha)

ABIAREH
A čužomu čužaku čužam*u*,
A ja m*a*ju maj*u* j*a*mu jam*u*,
A jon u jaje uvalicca,
Kali tolki źjavicca.

ČARADZIEJSTVA
Vilenka śmiecham zaliłasia,
U pyrski, u palony ruch dałasia,
U Viallu vilnuła i za chvilu,
Zastyła stylna — stała Vilniaj.

# ЯR

PAKAJAŃNIE
Čas h*a*dzinaj paŭzie pavoli,
A ja pa voli niedasiažnaj pł*a*ču.
Hadz*i*naŭ marnych nie viarnuć nikoli.
Płač*u* baluča za pamyłki dzion junačych.

MOJ RODNY KUT...
Z kožnym dniom usio składaniej być paetam.
Panapisyvali, razumieješ, tak i hetak.
Raz prydumausia mnie sympatyčny vieršyk —
Akazaiasia, što ja zusim nia pieršy.

KIRYLICA I ŁACINKA
Adna siamja:
mama
Hłyboki kanflikt:
BOH
Hłyboki sintez:
ЯR
Pounia pačuccia:
O



# Настасься барадатая

**Качэўнік**

Казахстан—ЗША, 2004, каляровы, 111 хв.

**Жанр:** гістарычны эпас.

**Адзнака:** 4 (з 10).

Казахская стужка «Качэўнік» нагадвае «Настасьсю Слуцкую» — толькі зь непараўнальна большым бюджэтам, амэрыканскімі прадусэрамі (сярод іх Мілаш Форман) й пракатным піяр-размахам. Ёсьць і амэрыканскія акторы, сярод іх Марк Дакаскас — найлепшы.

Сюжэт: мудры аксакал хавае ханскага сына ад джунгарскіх захопнікаў і выхоўвае. Малады хан Аблай мусіць аб'яднаць казахскія плямёны.

Сцэнарыст Рустам Ібрагімбэкаў спрацаваў прыкладна так, як беларускі рэжысёр. Чарада рэжысэраў: Сяргей Бадроў-старэйшы, Іван Пасэр, Талгат Тэменаў — працягнулі ягоныя высілкі.

Як і ў «Настасьсі», акторы становяцца ў позу. Як і ў «Настасьсі», самае выйгрышнае — карцінка, апэратарская праца: казахскі стэп, аблокі ў чырвані, пясок. У адрозьненьне ад «Настасьсі», у казахскай карціне няма стрыптызёраў, затое шмат піратэхнічных эфэктаў, а сцэна праезду Аблая праз стралкоў амаль галівудзкая. Але самае галоўнае ў фільме — уступныя й заключныя цытаты з Назарбаева. Па замове і выкананьне. Карацей, карціна для патрыётаў стабільнага і квітнеючага Казахстану.

**Андрэй Расінскі**

Начная Свабода
Радыё заўтрашняга дня
Слухай ад 23-й да поўначы
Кароткія хвалі 31 і 41 м,
сярэднія 612 кГц/490 м
У любы час
на www.svaboda.org
радыё свабода
www.svaboda.org

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Субота, 16 верасьня

**НТВ, 14.05**

«Чалавек з бульвару Капуцынаў».

Расея (СССР), 1987, рэж.Ала Сурыкава.

Камэдыя.

На Дзікім Захадзе, які славіцца мардабоем і стралянінаю, зьяўляецца ціхі місіянэр кіно — містэр Фёрст. Сынэма зьмяняе каўбоеў да непазнавальнасьці.

Яскравая музычная камэдыя пра магію кінаэкрана ў выкананьні Андрэя Міронава, Алега Табакова, Ігара Квашы.

**БТ, 14.30**

«Маем рэчы».

Беларусь, 2006, аўтар і вядоўца — Алесь Матафонаў.

Тэма перадачы — «Людзі на балоце».

**СТВ. 20.15**

«Тытанік».

ЗША, 1998, рэж. Джэймс Кэмэран.

Мэлядраматычны фільм–катастрофа.

Легендарнае сьлёзавыбівальнае відовішча пра гібель «Тытаніка» з патанулым Леанарда ды Капрыё і выратаванай Кейт Ўінсьлет.

11 «Оскараў», рэкардсмэн пракату.

**НТВ, 22.10**

«Сабіна».

Італія—Францыя—Вялікабрытанія, 2003, рэж. Рабэрта Фаэнца.

Гістарычная мэлядрама.

Маладую расейскую дзяўчыну Сабіну Шпільрэйн прывезьлі да вучня Фройда, доктара Юнга. З пацыенткі Сабіна становіцца ягонаю вучаніцай…

Малавядомыя й трагічныя старонкі псыхааналізу.

Карціна намінавалася на прызы «Данатэла».

**АНТ, 22.50**

«Дзьверы ў падлозе».

ЗША, 2004, рэж. Тод Ўільямз.

Драма.

У аўтамабільнай катастрофе супругі Тэд і Мэрыян губляюць сыноў, але самі застаюцца жывыя. Тэд спрабуе прымусіць Мэрыян разьвесьціся зь ім і наймае асыстэнта, падобнага на загіблага сына…

У ролях: Эль Фанінг, Джэф Брыджэс, Кім Бэсынджэр.

**СТВ, 00.25**

«Амэрыканскае хараство».

ЗША, 2003, рэж. Шэры Спрынгер Бэрман, Робэрт Пучыні.

Камэдыя.

Недарэка Харві вырашае маляваць коміксы… пра ўласнае жыцьцё.

Галоўны прыз кінафэсту «Сандэнз», прыз «ФІПРЭСІ» на Канскім МКФ, намінацыя на «Оскара» і іншыя ўзнагароды.

### Нядзеля, 17 верасьня

**СТВ, 08.15**

«Тры таўстуны».

Расея (СССР), 1966, рэж. Аляксей Баталаў, Ёсіф Шапіра.

Фільм-казка паводле аднайменнага твору Юр'я Алешы. Падрыўная рэвалюцыйная гісторыя з цыркавым карнавалам і вызваленьнем. Ролі выконваюць: Аляксей Баталаў, Валянцін Нікулін.

**СТВ, 22.55**

«Памерці ў імя».

ЗША, 1995, рэж. Гас Ван Сэнт.

Драма.

С'юзэн ня спыніцца ні перад чым, толькі б зрабіць кар'еру на тэлевізіі. Яна яе й зрабіла… у якасьці гераіні крымінальнае хронікі. Аўтарскі почырк Гас Ван Сэнта, нечаканая гульня Ніколь Кідман.

**НТВ, 23.10**

«Занадта прыгожая для цябе».

Францыя, 1989, рэж. Бэртран Бліё.

Сатырычная мэлядрама.

Надзіва сабе — і ўсім астатнім — пасьпяховы буржуа здраджвае прыгажуні-жонцы… зь непрывабнаю сакратаркай.

Зьдзеклівы любоўны трохкутнік разыгралі Жэрар Дэпард'ё, Жазіян Баляска, Кароль Буке.

Канскі трыюмф Бэртрана Бліё, 5 «Сэзараў» і пракатны посьпех.

**Андрэй Расінскі**



# Трыб’ют Сяргею Новіку–Пеюну

«БМА Group» выдае дыск — прысьвячэньне клясыку беларускай песьні Сяргею Новіку–Пеюну. Альбом будзе звацца «Дні лятуць». Да ўдзелу ў праекце запрашаюцца ўсе ахвотныя музыкі. Трэба перасьпяваць любую песьню Новіка–Пеюна альбо пакласьці на музыку яго верш. Па тэксты і песьні можна зьвяртацца да арганізатараў: т.: 649–08–88, e–mail: w1979@tut.by.

15 верасьня



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

КЗ «Менск» (Малая заля)
Пачатак 19.00

Зьміцер Вайцюшкевіч

Прэзэнтацыя дыска

Песьні з доўгай шуфляды. Нявыданае

НАШЫ ШАШКІ

# Камэнтуе чэмпіён – 2

У партыях аматараў ня часта ўбачыш, каб у сярэдзіне гульні цэлыя групы шашак пераходзілі на тэрыторыю суперніка. Падобныя расстаноўкі дазваляюць сабе хіба майстры, якія забіраюцца ў гушчары каркаломных варыянтаў, цяжарных ахвярамі, запіраньнямі і прарывамі ў дамкі…



**Я.Кандрачэнка — А.Валюк. Менск, 2005.**

Гэтая вычварная пазыцыя здарылася ў партыі Чэмпіянату Беларусі. **1. gf4?!** «Востра і моцна, але ўсё ж ня тое. Тут белыя маглі абесьсьмяроціць сваё імя (ці атрымаць ворага на ўсё жыцьцё): 1. ab2! ca1 2. ac3 db2 3. ed2! Цяжкі ход. Падчас партыі я яго ня бачыў. Чорныя прайграюць ва ўсіх варыянтах». **1…fe7!** «У моцным цэйтноце Валюк знайшоў адзіны шанец». **2. fg5 de3! 3. ab6!** «Ад перакрыжаваньня шашак — мітусьня ўваччу, мой сьцяжок таксама пачаў узьнімацца». **3…ed2! 4. ce3 ab2?** «Апошняя памылка. Пасьля Валюк паказаў, што выратаваньне яшчэ было: 4…bc7! 5. hg7 ca5 6. gf8 ed6!=». **5. ed6! ea7 6. ed4 cg7 7. hc1X.** (*Камэнтары майстра спорту Яўгена Кандрачэнкі*).

P.S. Чэмпіён даў драматычнай партыі назву: «Помнік клясычным рускім шашкам». Ён пасьпяшаўся: помнікі звычайна ставяць нябожчыкам, а гульня на 64 палёх, відавочна, дагэтуль тоіць у сабе нямала сакрэтаў.

**ВР**

**Ваш ход**

М.Кац — І.Бельскі. Чэмпіянат Беларусі, 1962. Ход белых.



**Адказ:** 1. hg3! hd4 2. dc3 db2 3. gf2. Чорныя здаліся.



# Шалкевіч прызямліўся

14 кастрычніка ў канцэртнай залі «Менск» (малая заля) — вялікі сольны канцэрт Віктара Шалкевіча і прэзэнтацыя яго новага альбому «Гарадзенец прызямліўся ў Менску». Пачатак а 19–й. Кошт квіткоў 8 000 — 14 000. Даведкі: 649–08–88, 766–24–25

# Кінафармат «4х4», 21—24 верасьня ў Менску

**«13» (13 (Tzameti)**, Францыя, 2005.

Малады грузінскі рэжысэр Гэла Баблуані, які цяпер жыве ў Францыі, зьняў чорна-белы сюррэалістычны фільм пра жорсткасьць сьвету і звычайнага чалавека, што выпадкова трапіў «у гісторыю». Стужка трымае гледача ў напружанасьці да апошняга моманту.

Дарма што фільм здымаўся ў Францыі: Гэла зьняў у ім сваю сям'ю: маці, бацьку, брата (у галоўнай ролі), сястру, швагра... — нацыянальны калярыт. Работа прыносіць у эўрапейскі кінэматограф грузінскую стылістыку: здымаць не відовішча, а сутнасьць (Гэла — сын вядомага рэжысэра Тэмура Баблуані).

**«Пекла» (L'Enfer)**, Францыя—Італія—Бэльгія—Японія, 2005.

Другая частка трылёгіі, сцэнар да якой стварыў польскі кінаклясык Кшыштаф Кесьлеўскі («Тры колеры», «Дэкалёг»). Першую частку — «Вырай» — паставіў нямецкі рэжысэр Том Тыквэр, трэцяя частка — «Чысьцец» — яшчэ ў праекце. Рэжысэру «Пекла» басьнійцу Данісу Тановічу («Нічыйная зямля») бракуе вытанчанасьці Кесьлеўскага, здольнага раскрыць рэлігійна-філязофскія тэмы на матэрыяле жыцьця простых людзей. Але басьніец прыўнёс у стужку сваё бачаньне сюжэту пра трох сёстраў, жыцьцё якіх праходзіць у цяні даўняй сямейнай трагедыі. Гісторыя адкрываецца ўрыўкамі, надаючы фільму дэтэктыўны характар. «Пекла» можа падацца і шэдэўрам, і проста сумнай, непрыкметнай стужкай. Лепш вырашаць самому.

**«Краіна прыліваў» (Tideland)**, ЗША, 2005.

Рэжысэр Тэры Гільям («Жах і нянавісьць у Лас-Вэгасе», «Браты Грым») тут даў волю сваёй фантазіі.

10-гадовая дзяўчынка жыве з бацькамі-наркаманамі, якія пасьля паміраюць. Яе адзіноту падзяляюць адарваныя лялечныя галовы ды страшная суседка з прыдуркаватым братам. Дзяўчо жыве ў нерэальным сьвеце, створаным з наркотыкаў, трупаў, вар'ятаў. Дзіцячая сьвядомасьць сучаснай Алесі зь дзівоснай краіны лёгка ўпісвае любы абсурд у свой маленькі сьвет.

Цікавая апэратарская работа, нерэальныя пэйзажы Саскачэвану, выдатная ігра маленькай Джодэль Фэрланд («Сайлэнт Гіл») — тое, дзеля чаго варта паглядзець стужку. Калі вы здолееце глядзець, як дзіця з абсалютна спакойным выразам рыхтуе чарговую дозу гераіну бацькам.

**«Шынобі» (Shinobi)**, Японія, 2005.

Японская вэрсія «Рамэо і Джульеты», зьнятая паводле манга (японскіх коміксаў). Сярэднявечная Японія, пэйзажы і японскае пачуцьце абавязку, якое — перадусім.

**Анея Восьнева**




## ТЭАТРЫ

**Купалаўскі тэатар**
**16 (сб)** — «Каханьне ў стылі барока».
**17 (ндз)** — «Дзіўная місіс Сэвідж».
**18 (пн)** — «Ромул Вялікі».
**20 (ср)** — «Чычыкаў».
**21 (чц)** — «КІМ».
**22 (пт)** — «Памінальная малітва».
**23 (сб)** — «Івона, прынцэса Бургундзкая».
**24 (ндз)** — «С.В.».
**25 (пн)** — «Я не пакіну цябе».
**27 (ср), 28 (чц)** — «Эрык XIV».
**29 (пт)** — «Таполевая завея».
*Ранішнія спэктаклі*
**17 (ндз)** — «Афрыка».
**24 (ндз)** — «Сьнежная каралева».
*Малая сцэна*
**21 (чц)** — «Адчыніце кантралёру!».
**25 (пн), 29 (пт)** — «Дзікае паляваньне караля Стаха».

**Тэатар беларускай драматургіі**
**16 (сб)** — «Воўк-мараплавец».

**Тэатар юнага гледача**
**16 (сб), 24 (ндз)** — «Залатое сэрцайка».
**16 (сб)** — «Сястра мая Русалачка».
**16 (сб)** — «Каліф-шавец».
**24 (ндз)** — «Марныя намаганьні каханьня».
**24 (ндз)** — «Дзень народзінаў ката Леапольда».
**28 (чц)** — «А зоры тут ціхія».
**29 (пт)** — «Паліяна».
**30 (сб)** — «Пацалунак ночы».
**30 (сб)** — «Апошняя дуэль».

## КІНО НА DVD

**Першы досьвед Міні (Mini's First Time).**
Камэдыйная драма, ЗША, 2006, рэж. **Нік Гутэ**.
У ролях: **Алек Болўін**, **Кэры-Эні Мос**, **Джэф Голдблюм**.
Каб пазбавіцца ад маці-алькагалічкі, Міні спакушае айчыма. Але афэра завяршаецца сьмерцю. Былыя хаўрусьнікі пачынаюць тапіць адзін аднаго.
**Менск, Кісялёва 12, 643-21-08**

Верасень з Данчыкам
Знаёмы голас
Любімыя песьні
Незабыўныя мэлёды
радыё свабода
www.svaboda.org

За апошні тыдзень «Наша Ніва» атрымала асабліва шмат ахвяраваньняў.

# Дзякуй

**Георгію Г., Валянціне Г., Генадзю К., Сьвятлане Ш., Уладзімеру Р., Рыгору Н., Ірыне М., Сяргею К., А.Л., І.Л., Віталю Р., В.П., В.Г., Віктару М., Аляксандру Ф., Д.К., Натальлі Л., Уладзімеру К., М.Б., Аліне Я., Анатолю П., Паўлу Д., Аляксандру П., Ягору М., Ірыне Л., Тацяне Р., Ізмаілу А., Алене М., Марыі Г., Ю.Г., Раману М., Альберту С., Н., Мікалаю Б., Д.В., К.Т., Тацяне Д., А.Л., Віктару П., Аляксандру Ц., Станіславу Б., Натальлі З., М.С., З.К., Р.Н., Валянціне Ш., Але К., Сьвятлане В., Раману М., Дз. І., Марыі А., Настасьсі Ж., З.А., А.М., Г.С., Ц., Аляксею Б., Сьвятлане Б., Віталю С., Р.Н., М.К., Максіму С., Сяргею К., Валянціне Д., Мікалаю П., Ю.В., Т.К., К.Л., Н.К.** зь Менску.
**Андрэю А., Ірыне В.** зь Менскага раёну.
**Валерыі Х.** зь Дзяржынскага раёну.
**Эдуарду Г., Анатолю Ц.** з Асіповіцкага раёну.
**П.Б.** з Мастоўскага раёну.
**Міхаілу Ц.** з Браслаўскага раёну.
**Уладзімеру П.** з Аршанскага раёну.
**Канстанціну К.** з Рэчыцы.
**Антону Т., Сяргею В.** з Жодзіна.
**Аляксею В.** з Салігорску.
**Алене А., Віктару М., В.Г.** з Баранавічаў.
**Паўлюку С.**, з Горацкага раёну.
**Леаніду Г.** з Гарадоцкага раёну.
**А.Б., Віктару П., Тацяне Б., Дзянісу С.** з Магілёва.
**Барысу Ф., В.З., Марыі Б., А.С., З.Ж.** з Гомелю.
**Леакадзіі Н., Мікалаю К.** з Валожынскга раёну.
**Андрэю Г., Аксане Б.** зь Ліды.
**Антосю Ц., Сяргею С.** з Полацку.
**Н.А.** з Клімавіцкага раёну.
**Г.Л., Тамары М., Пётру П., Георгію М., Соф'і В., Алене А., Г.К., Сяргею З., Канстанціну Ш., А.С., Юр'ю Г.** з Горадні.
**М.К.** з Наваполацку.
**Сяргею Т.** зь Лідзкага раёну.
**Аляксандру Я.** зь Нясьвіскага раёну.
**С.Р., Міхаілу Г., Ігару Б.** зь Берасьця.
**Я.Ш., Сьвятлане Ц.** з Маладэчна.
**Т.Ш., С.Р.** зь Бярозаўскага раёну.
**Але Г.** з Бабруйску.
**Аўгену К.** са Шклоўскага раёну.
**В.В., Д.Л.** са Смургонскага раёну.
**Міхаілу З., Івану Ц.** зь Віцебску.
**Ігару П.** з Пастаўскага раёну.
**Іне С., Сяргею С.** з Барысава.
**Анатолю Г.** з Берасьцейскага раёну.
**Мікалаю К.** з Лунінецкага раёну.

Асаблівая ж падзяка за шчодрасьць **Ігару І.**, сужэнству **С-каў, Г.Ба-скаму, Міхасю Б.**, якія цяпер у Вялікай Брытаніі.

0402280179

**ИЗВЕЩЕНИЕ**

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521

получатель платежа

МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764

наименование банка

Счет получателя: 3015 212 000 012 | Лицевой счет:

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир | Плательщик

Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521

получатель платежа

МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764

наименование банка

Счет получателя: 3015 212 000 012 | Лицевой счет:

(фамилия, имя, отчество, адрес)

**КВИТАНЦИЯ**

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Ахвяраваньне | | | | |
| | | | | |
| | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир М.П. | Плательщик

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

**дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні.**

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@tut.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям'ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6000 рублёў на месяц. Гэтага хопіць на выхад і дастаўку газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначайце адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.** Тыя, хто перакажа 18000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад «НН» на 3 месяцы. Хто перакажа 36000 рублёў адразу, гарантуе публікацыю «НН» на паўгоду.

**...курс геаграфіі распрацоўвала ўпраўленьне ідэалёгіі.**




1. Мы. Астравок стабільнасьці і спакою ў звар’яцелым сьвеце.

2. Краіна, жыхары якой распаўсюджваюць парнаграфічныя матэрыялы і ладзяць дыпляматычныя правакацыі.

3. Краіна родзічаў Анжалікі Борыс.

4. Краіна, дзе быў парадак, які адпавядаў нашаму разуменьню прэзыдэнцкай рэспублікі і ролі ў ёй прэзыдэнта.

5. Неўязьдзянія.

6. Усе што засталася ад квітнеючай Югаславіі.

7. Аранжавыя з сымпатычным нам прэм’ер–міністрам.

8. а) Саюзная братэрская дзяржава; б) картэль алігархаў, што пазірае на наш нафтаперапрацоўчы комплекс.

9. Краіна, якая ўваходзіць ці то ў Мытны саюз, ці то АДКБ, ці то ў ЭўрАзЭс.

10. Жаўтаскурыя людзі, якія набываюць прадукцыю «Беларускалію».

11. Жаўтаскурыя людзі, якія набываюць прадукцыю «Беларускалію», калі яе не жадаюць набываць жаўтаскурыя людзі з краіны №10.

12. Рух краінаў недалучэньня.

13. Людзі, якія набываюць прадукцыю «Беларускалію», калі яе не жадаюць набываць жаўтаскурыя людзі з краінаў №10 і 11.

14. Тут мы неяк фанацелі за нашу зборную па хакеі.

15. Краіна, зь якой у нас супольная пазыцыя ва ўсіх міжнародных пытаньнях.

16. Краіна, дзе несправядліва судзяць Садама.

17. Краіна тэрарыстаў, якія носяць ружы і, атручваюць ваду пацукамі.

18. Кадафі, які здрадзіў ідэі шматпалярнага сьвету і памірыўся з імпэрыялістамі.

19. Чарнаскурыя людзі, якія набываюць нашу зброю.

20. Сымпатычная краіна, зь якой мы гатовыя стварыць каманду па футболе, хакеі, валейболе, любую каманду. Але спачатку няхай яны набудуць у нас партыю МАЗаў.

21. Краіна Фідэля, якая сорак гадоў пасьпяхова супрацьстаіць жорсткаму і нечалавечаму ціску з боку паўночнага суседа.

22. Краіна, якая праводзіць беспэрспэктыўную палітыку, не паважае выбар нашага народу і панясе пакараньне.

23. Краіна, дзе добра гуляюць у хакей, аднак не жадаюць прымаць Зімоўскага.

24. Кажуць, што там ёсьць зямля і жывуць людзі, аднак гэта, напэўна, не адпавядае рэчаіснасьці, паколькі нашаму кіраўніку яшчэ не забаранілі туды ўезд.

25. Тут жыў Скарына і, здаецца, яшчэ нехта зь сярэднявечных клясыкаў, можа, Марат Казей.



## ГІСТОРЫЯ Ў «НН»




**Юбілеялёгія**

«Дзясятую гадавіну ўзьяднаньня беларускага народу ў адзінай Беларускай Савецкай Сацыялістычнай дзяржаве — паўсюдна адзначыць 30 кастрычніка 1949 г. як усенароднае сьвята». **Старонка 28.**

**Што вырашыла лёс Клецкай бітвы?**

Гісторык Генадзь Сагановіч пра адну з самых дасканалых перамог беларускай зброі. **Старонка 32.**

**Львоўская місія «Язафата»**

Знойдзены дакумэнт, які пралівае сьвятло на малавядомую старонку дзейнасьці беларускага супрацiву 1941—1944 гадоў. Пішуць Сяржук Горбік, Сяргей Ёрш. **Старонка 35.**

**Палалі пажары**

«Марозным студзеньскім днём 1943 г. партызаны Кіраўскага атраду Расонскай брыгады імя Сталіна сабраліся на пастраеньне...» **Старонка 36.**

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**Менск.** Камароўскія чыншавікі пачалі моцна выкупляць зямлю ад Ваньковіча, да каторага належыць уся Камароўка, як да Каладзеева — Новабарысаў. Цэны вельмі падскочылі ад 1907 году: дзе сажань каштавала 30 кап., цяпер 1 р. 75 кап.; дзе 1 р. 50 к. — там 3 р. 50 кап. і т.д. Стогнуць людзі, не дачакаўшыся ад Гас. Думы закону аб палягчэньні чыншавікам выкупу. Каторы недзе сеў макам у камісіі, бо яму працівіліся дэпутаты-духоўныя.

**Мікола Камароўскі**
**«Наша Ніва»-1911-№34**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**Зьміцер Касьпяровіч запрашае ў вандроўкі**. Маршрут 1 (на сутыку Бераставіцкага, Гарадзенскага і Мастоўскага р-наў). 17 верасьня. Лунна—Квасаўка—Індура—Масаляны—Вялікія Эйсманты—Малая Бераставіца — Вялікая Бераставіца. Маршрут 2 (Ваўкавыскі р-н). 24 верасьня. Рось—Воўпа—Рэпля—Вярэйкі—Шылавічы—Мсьцібава—Гнёзна—Ваўкавыск. Т.: 292-54-58, 622-57-20, 509-12-16

**Прадам даведнік** «Чэмпіёны сьвету па футболе. 1930—2006». Цікавая і падрабязная інфармацыя пра ўсіх гульцоў і трэнэраў, якія былі ўладальнікамі Кубку сьвету! Першае выданьне такога кшталту ў беларускай мове. Запыты накіроўвайце на vitautr@yahoo.com

**«Наша Ніва», «ARCHE»,** іншыя газэты ды часопісы, а таксама кнігі, слоўнікі, даведнікі, беларуская музыка ды фільмы на CD на Румянцава, 13 (ТБМ) ад панядзелка па пятніцу (15.00-19.30). Т.: 707-40-01

**Кнігаабмен.** Дапамагу знайсьці патрэбную кнігу. Т.: 753-91-96

**Абмен** культурніцкай інфармацыяй: канфэрэнцыі, круглыя сталы, сэмінары. E-mail: alesknigi@mail.ru

**Якасна выканаю пісьмовыя працы** па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17-й. Тэлефон (017) 235-18-72, Юры

**Талькаўскі фэст** абудзецца 1 кастрычніка. Збор у 12 гадзін каля ДК.




# А ты падпішыся!



**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,**

проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка 46.**

Наступны нумар «НН» выйдзе 29 верасьня. Добра Вам выкапаць бульбу!

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| нам.галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220030, г. Менск, вул. Калектарная, 20а-112. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2721. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 13.09.2006.
Замова № 5118.
Рэдакцыйны адрас: Калектарная, 20а-112.